WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 САКАВІКА 2011 г.
АЎТОРАК
№ 39
(26903)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАПАТРАБАВАЎ АД УРАДА ВЫСОКІХ ТЭМПАЎ РОСТУ ПРЫ ЗБАЛАНСАВАНЫМ РАЗВІЦЦІ ЭКАНОМІКІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад урада дасягнуць большай эфектыўнасці і якасці ў рабоце і забяспечыць высокія тэмпы росту пры збалансаваным развіцці эканомікі. Аб гэтым 25 лютага кіраўнік дзяржавы заявіў на нарадзе з новым складам урада і нованазначанымі службовымі асобамі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў зрабіць больш жорсткімі правілы валютнага рэгулявання ў краіне. «Хачу звярнуць прынцыповую ўвагу прэм'-ер-міністра і старшыні праўлення Нацыянальнага банка: мы недапушчальна расхлябана ставімся да выкарыстання валютнай выручкі. Склалася сітуацыя, што некалькі соцень ці дзясяткаў, можа, ключавых прадпрыемстваў прыносяць валюту ў краіну, а прэм'ер-міністр і старшыня праўлення Нацыянальнага банка, грунтуючыся на незразумелых тэорыях свабоднага рынку, раздаюць каму папала гэту валюту», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што калі валюта ў краіне будзе, то яе можна будзе браць і расходаваць. «Няма валюты — прасі ў тых, у каго гэта валюта ёсць. І хопіць адбіраць валюту ў кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый, якія яе зарабляюць, і раздаваць тым, хто яе ў краіну не прыносіць», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да старшыні праўлення Нацбанка.

«Гэта прынцыповае пытанне нашай эканомікі, і мы павінны падкарэкціраваць нашу палітыку, а не грунтавацца на нейкай голай рыначнай тэорыі», — сказаў ён.

«Я не кажу, што ўсіх трэба зацісnуць. Насельніцтва — гэта святое. І ў нас насельніцтва праблем з валютай не стварае. Насельніцтва купіла некалькі мільёнаў долараў і ўсё роўна размясціла іх у банках. А прадпрыемствы паводзяць сябе расхлябана. У тым ліку і энергетычны сектар, і іншыя. Таму тут павінен быць наведзены парадак», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Упэўнены, што гэта дасць нармальны эфект, і мы не будзем мець больш праблем з валютай, курсам і гэтак далей», — дадаў ён.

СТАР. 2

ЦЭНАЎТВАРЭННЕ Ў БЕЛАРУСІ З 1 САКАВІКА БУДЗЕ ЛІБЕРАЛІЗАВАНА

У Беларусі з 1 сакавіка 2011 года будзе лібералізавана цэнаўтварэнне. Адпаведны ўказ № 72 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання цэн (тарыфаў) у Рэспубліцы Беларусь» 25 лютага падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Дакумент падпісаны ў мэтах скарачэння сферы дзяржаўнага рэгулявання цэн і тарыфаў.

«Указам прадугледжваецца захаванне дзяржаўнага рэгулявання цэн (тарыфаў) на асобныя тавары (работы, паслугі), якія маюць найбольш важнае значэнне для забеспячэння эканамічнай бяспекі краіны, на прадукцыю арганізацый-манапалістаў, а таксама на сацыяльна значныя тавары (паслугі)», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Дакументам вызначаны канкрэтны пералік тавараў (работ, паслуг), у дачыненні да якіх ажыццяўляецца дзяржаўнае рэгуляванне цэн (тарыфаў), а таксама органы дзяржаўнага кіравання, на якія ўскладаюцца функцыі па іх рэгуляванні. Цэны (тарыфы) на тавары (работы, паслугі), якія не ўвайшлі ў пералік рэгулюемых, будуць фарміравацца суб'ектамі прадпрымальніцкай дзейнасці самастойна з улікам кан'юнктуры рынку.

З прыняццем указа адмяняюцца гранічныя індэксы змянення адпускных цэн (тарыфаў) на тавары (работы, паслугі), што выпускаюцца на тэрыторыі рэспублікі, якія раней устанаўліваліся ўрадам. Адпаведна адмяняецца рэгістрацыя гэтых цэн (тарыфаў), адзначылі ў прэс-службе.

Выключана неабходнасць прадстаўлення эканамічных разлікаў юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі пры вызначэнні ўзроўню цэн (тарыфаў), што імі прымяняюцца, за выключэннем рэгулюемых. Адмена гэтых норм абумовіла і неабходнасць змянення складу адміністрацыйных правапарушэнняў у сферы цэнаўтварэння. У прыватнасці, указам устаноўлена, што правапарушэннем не будзе з'яўляцца перавышэнне індывідуальным прадпрымальнікам або юрыдычнай асобай устаноўленых гранічных індэксаў змянення адпускных цэн (тарыфаў) на тавары (работы, паслугі) пры іх рэалізацыі без рэгістрацыі цэн (тарыфаў).

Таксама не будзе правапарушэннем рэалізацыя тавараў (работ, паслуг) з парушэннем устаноўленага парадку рэгістрацыі цэн (тарыфаў), за выключэннем рэгулюемых, гэтак жа як і рэалізацыя тавараў (работ, паслуг) пры адсутнасці эканамічных разлікаў, якія пацвярджаюць узровень прымяняемых цэн (тарыфаў), за выключэннем рэгулюемых.

У адпаведнасці з гэтымі зменамі складу адміністрацыйных правапарушэнняў у сферы цэнаўтварэння будуць унесены адпаведныя карэкціроўкі ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Указ уступае ў сілу з 1 сакавіка 2011 года.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«ВОЛ БУШУЕ — ВЯСНУ ЧУЕ!»

Калісьці гэта была адна з мноства народных прыкмет, калі па паводзінах свойскай жывёлы гаспадары маглі прадвызначыць хуткае набліжэнне вясны. «Вол бушуе» — значыць, абрыд яму хлеў, жывёла просіцца на сонейка, прагне пахадзіць па двары, папіць з першай лужыны. У вёсцы Звярынічы Лагойскага раёна, не зважаючы на назву, вялікай разнастайнасці свойскай жывёлы не назіраецца. Толькі адзін гаспадар — Пётр БАРАНОЎСКІ (на фотаздымку) трымае і каня, і цялушку, і штодня водзіць сваіх «валоў» да студні ўволю напіцца чыстай вадзіцы.

ЗДАБЫВАЎ ГРОШЫ З... ПРАКАТУ

Мінчанін, не мудрагелячы, перапрадаваў па заніжаным кошце тое, што браў напракат

Шчыра працаваць 22-гадоваму хлопцу, мабыць, не вельмі і карцела, а жыць хацелася не горш за астатніх. Вось ён, паводле звестак прэс-афіцэра Партызанскага РУУС Ганны Чыж-Літаш, і прыдумаў няхітрую схему «заробку»: узяў аднойчы напракат відэакамеру, знайшоў на яе пакупніка і рэалізаваў па заніжанай цане. Лёгкія грошы прыйшліся даспадобы, і вось ужо ў хуткім часе ён збывае за 4,5 мільёна рублёў пілу, якую ўзяў на час. Неўзабаве па «накатаным» шляху былі прададзеныя фотаапарат, веласіпед, будаўнічыя інструменты. Жыццю на халяву прыйшоў канец, калі адзін з пракатчыкаў, які не дачакаўся сваёй маёмасці, звярнуўся па дапамогу ў міліцыю. Ветрагона затрымалі, у дачыненні да яго заведзена крымінальная справа, і пагражае падазронаму да 7 гадоў пазбаўлення волі.

ЗЛАМЫСНІК-«ДЫЯГНОСТ»

Непрацуючы мінчанін спрабаваў украсці з Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» дарагі дыягнастычны апарат «АНКУБ Спектр», прызначаны для неінвазіўнага выяўлення білірубіну і маніторынгу лячэння любога тыпу жаўтухі ў нованароджаных, ранняга выяўлення захворэлых на інфекцыйную жаўтуху ў каранцінных групах.

Паводле звестак прэс-службы Дэпартамента аховы, нарад Цэнтральнага аддзела аховы затрымаў 53-гадовага непрацуючага мужчыну на тэрыторыі цэнтра якраз у той момант, калі ён «паклаў вока» на абсталяванне. Між іншым, кошт дыягнастычнага апарату, на які нацэліўся зладзюжка, складае каля 20 мільёнаў рублёў. Па гэтым факце заведзена крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

СКАРГАВЫ ШАНТАЖ

200 тысяч рублёў запатрабаваў 58-гадовы сацыяльны работнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Рагачоўскага райвыканкама за тое, што прыпыніць пісаць скаргі на дырэктара Рагачоўскай ДЮСШ-1. Кіраўнік спартыўнай установы грошы перадаваў пад наглядам міліцыі. Вымагальнік затрыманы, паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

МАРОЗ І СОНЦА, А НА ВЫХАДНЫЯ — ПАЦЯПЛЕЕ І СНЕГ

На працягу ўсяго працоўнага тыдня ў Беларусі будзе трымацца халоднае, без ападкаў, надвор'е, якое фарміруецца пад уплывам моцнага скандынаўскага антыцыклона з цэнтрам над Паволжам, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.

Ападкаў у гэтыя дні ўвогуле не чакаецца, толькі ў чацвер удзень месцамі па Віцебскай вобласці магчымы невялікі снег. Сёння будзе падмарожваць ад мінус 2 на паўднёвым захадзе да 10 марозу на паўночным усходзе. У сераду ўначы зноў добрыя маразы — да 10—17, на паўночным усходзе — мінус 20—24, удзень — толькі мінус 2—9 градусаў. У чацвер уначы 7—14, месцамі да 15—20 марозу, удзень — ад нуля на поўдні да мінус 6 на поўначы краіны.

У пятніцу чакаецца рэзкая змена надвор'я, калі да нас завітаюць цыклоны з боку Паўночнай Атлантыкі. Даволі хутка пачне падаць атмасферны ціск, з'явіцца шчыльная воблачнасць, месцамі чакаецца кароткачасовы снег, узмацніцца парывісты вецер. Маразы аслабнуць. Уначы будзе толькі мінус 4—11, на поўдні краіны ў суботу пры праясненні да 12—15 марозу, удзень — ад плюс 1 на поўдні да мінус 5 градусаў на поўначы краіны. Паводле доўгатэрміновых прагнозаў, сапраўднае цяпло атрымае канчатковую прапіску на тэрыторыі Беларусі толькі ў другой палове першага месяца вясны.

Сяргей КУРКАЧ.

ШЧУПАКА НЕ БЯРЫ — НЕРАСТ!

Згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, у краіне з 1 па 31 сакавіка ўводзіцца забарона на лоўлю звычайнага шчупака.

Гэтаму ёсць лагічнае з біялагічнага пункту погляду тлумачэнне — у падводнага драпежніка пачынаецца перыяд нерасту. Па яго тэрмінах шчупак апярэджвае ўсіх вясенне-нерастуючых рыб Беларусі — адкладвае ікру ў сакавіку-красавіку пры тэмпературы вады чатырышэсць градусаў. Нераст пачынаецца адразу пасля раставання лёду і адбываецца на невялікай глыбіні ў прыбярэжнай зоне вадаёмаў, а таксама на пойме рэк і ручаёў. Пры гэтым шчупак робіцца безабаронным перад чалавекам, таму і патрэбны жорсткі кантроль за захаваннем тэрмінаў забароны на лоўлю. Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях у гэты час прадугледжаныя штрафныя санкцыі за незаконную лоўлю ці нават замах на яе — у памеры ад 10 да 50 базавых велічынь. А сам шчупак з'яўляецца ў літаральным сэнсе слоў санітарам вадаёмаў, ён патрэбны ім, паколькі адыгрывае ролю рэгулятара колькасці рыбы, не дазваляе біямасе рыб перавысіць кармавыя рэсурсы вадаёма, знішчае хворую і аслабленую рыбу. Таму так важна стварыць належныя ўмовы для размнажэння падводнага драпежніка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ТУТ ЗАГІНУЎ ВАДЗІЦЕЛЬ, А ТАМ — ПЕШАХОД

Каля в. Нагор'е (на аўтадарозе Драгічын—Антопаль) жыхар г. Іванава не справіўся з кіраваннем аўтамабіля «Додж Караван» і трапіў у кювет. Вадзіцель памёр на месцы.

А ў Кобрыне пад коламі аўтамашыны загінула жанчына, якая ішла па пешаходнай дарожцы. Вадзіцель з'ехаў, але яго здалося перахапіць. Наезд на «Фальксвагене» здзейсніў мясцовы жыхар.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў САКАВІКУ

1, аўторак, 3.00—4.00
3, чацвер, 13.30—16.00
6, нядзеля, 3.30—4.30
8, аўторак, 15.00—17.00
13, нядзеля, 12.00—14.00
15, аўторак, 9.00—18.30
17, чацвер, 19.00—20.30
19, субота, 17.00—19.30
20, нядзеля, 18.30—23.30
21, панядзелак, 17.30—18.30
23, серада, 19.00—21.00
26, субота, 0.30—2.00
28, панядзелак, 2.00—10.00

Дзяржаўны інтарэс

РУП «БЕЛЭЛЕКТРАМАНТАЖНАЛАДКА»: вітаем новыя кантакты і гатовы да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва

Унікальныя веды і вопыт, назапашаныя прадпрыемствам, гарантуюць вырашэнне любых складаных задач па ўводзе ў эксплуатацыю энергетычных аб'ектаў

Хацелася б пачаць не зусім традыцыйна... Ведаеце ж, як яно часам бывае ў жыцці? Жывеш, працуеш, сяброўеш, падаецца, ведаеш вакол сябе людзей: блізкіх, натуральна, больш, знаёмых — менш. А потым здараецца сустрэча, калі ты разумееш, што сяброў у цябе насамрэч больш. І яны пра цябе даўно і шмат ведаюць, сочаць за тваёй творчасцю.

Вось прыкладна так і адбылося з намі — творчай брыгадай журналістаў «Звязды». Калі мы — упершыню (але ж якраз з мэтай выправіць гэтую недарэчнасць!) — завіталі ў рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белэлектрамантажналадка» сустрэлі нас там, родную газету на роднай мове, як даўніх сяброў. «Звязду», як аказалася, на самім прадпрыемстве здаўна выпісваюць і чытаюць. Прынамсі наша выданне займае на працоўным стале дырэктара Сяргея Мікалаевіча АЛЯХНОВІЧА сваё пачэснае месца. Дарэчы, бацька кіраўніка прадпрыемства таксама здаўна выпісвае газету. А галоўны інжынер Іван Часлававіч СТРАЛЮК увогуле крануў успамінам пра бабулін куфар, які знутры быў абклеены нумарамі «Звязды».

Няхай не крыўдуюць іншыя, але, падаецца, выпадковасцяў не бывае: дзякуючы вось гэтаму папярэдняму завочнаму знаёмству наша размова неяк адразу стала больш шчырай, цёплай — як у людзей, аб'яднаных нечым агульным, што нарэшце сустрэліся. А можа, людзі нам патрапіліся адкрытыя, добразычлівыя, гасцінныя, але найперш — майстры сваёй справы, якім сапраўды ёсць чым ганарыцца і пра што расказаць? Ну, то тады, можа, і пачнём аповед пра іх справы?!.

Прадстаўляем суразмоўцу

Сяргей Мікалаевіч Аляхновіч нарадзіўся ў 1965 годзе ў вёсцы Міжэвічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1982–1983 гадах працаваў слесарам у калгасе «Міжэвічы». У 1988 годзе скончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут у Мінску. У 1988–1991 гадах — інжынер, інжынер па наладцы і выпрабаваннях 3 катэгорыі Мінскага наладачнага ўчастка наладачнага галаўнога ўпраўлення спецыялізаванага будаўнічага аб'яднання «Электрацэнтрмантаж». У 1991–1992 гадах — інжынер па наладцы і выпрабаваннях 3 катэгорыі, інжынер па наладцы і выпрабаваннях 2 катэгорыі Дзяржаўнага даччынага прадпрыемства Мінскага наладачнага ўчастка наладачнага галаўнога ўпраўлення спецыялізаванага будаўнічага аб'яднання «Электрацэнтрмантаж». З 1992 па 2000 год працаваў інжынерам па наладцы і выпрабаваннях 2 катэгорыі, інжынерам па наладцы і выпрабаваннях 1 катэгорыі, прарабам Беларускага мантажна-наладачнага прадпрыемства «Белэлектрамантажналадка». У 2000–2006 гадах — прараб, начальнік упраўлення наладачных работ мантажна-наладачнага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белэлектрамантажналадка». У 2006 годзе скончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. З таго ж 2006 года і па цяперашні час з'яўляецца дырэктарам мантажна-наладачнага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белэлектрамантажналадка».

Рамонт аўтатрансфарматара на ПС 330кВ «Крычаў».

Дзелавыя сувязі калектыву РУП «Белэлектрамантажналадка» злучаюць Беларусь з многімі краінамі свету.

«Ты памятаеш, як усё пачыналася?..»

Выкарыстаўшы гэты радок з песні лідара гурта «Машына часу», не прамінём зрабіць віртуальнае падарожжа ў мінулае. Гэта важна, паколькі поспех сённяшняга многагапрофільнага (і шмат у чым сапраўды ўнікальнага) мантажна-наладачнага інжынірынгавага прадпрыемства з уласнымі канструктарскай, вытворчай і выпрабавальнымі базамі, што дынамічна развіваюцца як па колькасці персаналу і аб'ёмам работы, што выконваецца, так і па відах дзейнасці, і яго аўтарытэт і павага з боку пастаянных партнёраў — заказчыкаў, падрадчыка, пастаўшчыкоў — бяруць свае вытокі якраз з тых далёкіх ужо часоў.

Гісторыя РУП «Белэлектрамантажналадка» пачалася ў 1964 годзе, калі для выканання пусканаладачных работ на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Латвіі, Смаленскай і Бранскай абласцей Расіі ў саставе мантажна-наладачнага ўпраўлення маскоўскага трэста «Электрацэнтрмантаж» быў створаны Мінскі тэрытарыяльны наладачны ўчастак з персаналам у 30 чалавек. Дарэчы, сувязі з партнёрамі — цяпер ужо з краін СНД — захаваліся і падтрымліваюцца дагэтуль: з Узбекістанам, Арменіяй, Украінай, Расіяй (тут варта прыгадаць Маскву, Санкт-Пецярбург, Іванава, Екацярынбург, Кемерава, Сургут).

Разам працуем — разам і сфатаграфуемся, вырашыла брыгада інжынераў-наладчыкаў. Злева направа: Ігар БАРЫЛКА, Уладзімір ПАЛЫН, галоўны інжынер прадпрыемства Іван СТРАЛЮК, Андрэй СІНІЦКІ, Сяргей НІШТ (прадстаўнік адной са шматлікіх працоўных дынастый), кіраўнік брыгады Міхаіл МАРДАСАЎ.

Трэба нагадаць, што тыя гады — 1960-80-я — былі адметныя беспрэцэдэнтным ростам энергетычнай будоўлі, што выклікала велізарны попыт на мантажныя і наладачныя работы. Менавіта з гэтай мэтай і стваралася прадпрыемства: цяжка знайсці які-небудзь буйны аб'ект энергетыкі, у мантажы і наладцы абсталявання для якога не бралі б удзел яго спецыялісты. Гэта і мінскія ЦЭЦ-4 і ЦЭЦ-5, Лукомльская ГРЭС, Гродзенская, Бабруйская, Мазырская, Наваполацкая ЦЭЦ, Полацкая ЦЭЦ, Гомельская ЦЭЦ-2, Магілёўская ЦЭЦ-2, вялікая колькасць падстанцый... На гэтых аб'ектах набываўся бясцэнны вопыт, раслі кваліфікацыя, колькасць персаналу і аўтарытэт усяго прадпрыемства. Усё гэта спатрэбілася пры выкананні адказных заданняў у многіх краінах свету па наладцы энергетычных аб'ектаў, уключаючы і атамныя станцыі: Курскую, Смаленскую, Нововаронежскую. У састаў работ на атамных электрастанцыях уваходзілі: наладка электратэхнічнага абсталявання, інфармацыйна-вымяральных сістэм, уключаючы сістэмы вымярэння і абароны рэактара, дазіметрычнага кантролю і інш. Пралічыць усе аб'екты, у пуску якіх бралі непасрэдны ўдзел спецыялісты «Белэлектрамантажналадкі», будзе даволі складана, таму больш падрабязна спынімся толькі на адным з такіх.

Калі ў Беларусі загаварылі пра будаўніцтва атамнай электрастанцыі на пляцоўцы цяперашняй тэрыторыі ЦЭЦ-5, па частцы пусканаладачных работ прадпрыемства павінна было заняць ролю лідара, а ўсе астатнія патрэбныя сілы планавалася падцягваць з арганізацый-партнёраў. У той час спецыялісты з Мінска працавалі на атамных станцыях у Расіі, і падрыхтоўка дзякуючы набытаму вопыту вялася сур'ёзная — нават паспелі зрабіць пускавую кацельню, пабудаваць патрэбную інфраструктуру, ужо рыхтаваліся капаць катлаван пад рэактар. Аднак здарылася чарнобыльская катастрофа, і замест атамнай станцыі на тым месцы з'явілася цеплавая...

У 1991 годзе на базе Мінскага тэрытарыяльнага ўчастка было створана дзяржаўнае даччынае прадпрыемства «Мінскі наладачны ўчастак» са стварэннем юрыдычнай асобы, якая годам пазней была перайменавана ў Беларускае мантажна-наладачнае прадпрыемства «Белэлектрамантажналадка» і ўвайшло ў склад цяперашняга ДВА «Белэнерга».

Фактычна менавіта з гэтага часу пачынаецца станаўленне прадпрыемства як самастойнай айчыннай структуры ў галіне энергетыкі. Хоць гэтае самае станаўленне прыпала на далёка не лёгкія часы, калі эканоміка пачала «буксаваць». Людзі звальняліся, бо шукалі не толькі добры заробак, але і перспектыву, пастаянства. Тады ў асноўным прадпрыемства вымушана было рабіць упор на рамонтныя, аднаўленчыя работы. Пра запуск буйных магутнасцяў, на што ўласна і было нацэлена прадпрыемства, даводзілася толькі марыць...

(Працяг на стар. 4–5.)

ISSN 1990 - 763X

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАПАТРАБАВАЎ АД УРАДА ВЫСОКІХ ТЭМПАЎ РОСТУ ПРЫ ЗБАЛАНСАВАНЫМ РАЗВІЦЦІ ЭКАНОМІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, доля замежных крыніц у інвестыцыях у асноўны капітал павінна быць не меншая за 21 працэнт ужо ў 2011 годзе. Пры гэтым над пытаннямі прыцягнення замежных інвестыцый павінны працаваць усе кіраўнікі, усе намеснікі прэм'ер-міністра і міністры. Каардынуючая роля ў гэтым працэсе павінна належаць Міністэрству эканомікі.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што для паспяховай інвестыцыйнай дзейнасці ў краіне створаны ўсе заканадаўчыя ўмовы і прадастаўлены дзяржаўныя прэферэнцыі. Прыняты тры спецыяльныя дэкрэты. Створана агенцтва для работы з замежнымі інвестарамі, уведзены інстытут інвестыцыйных агентаў. «Таму з сённяшняга дня спасылкі ўрада, кіраўнікоў арганізацый на адсутнасць сродкаў для капіталаўкладанняў будуць расцэньвацца як сігнал аб прафесійнай непрыгоднасці».

Пры гэтым ён перасцярог удзельнікаў нарады: «Не зацыклівайцеся на прыватызацыі і не прымайце прамыя замежныя інвестыцыі выключна як продаж дзяржаўнай уласнасці. У краіне шмат тэрыторый, якія не выкарыстоўваюцца, кваліфікаваная рабочая сілы, магчымасцяў для будаўніцтва прадпрыемстваў з чыстага ліста. Не чакайце, пакуль да вас прыйдзе інвестар, а вы, як на кірмашы, будзеце толькі выбіраць прапанаваныя імі праекты. Беларусь — індустрыяльна і аграрна развітая дзяржава. Таму асноўныя напрамкі інвесціравання мы павінны вызначаць самі». Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэтыя напрамкі ўжо вызначаны. У прыватнасці, гэта інвестыцыі ў ПЭК, дыверсіфікацыя паставак у краіну вуглевадародаў і сыравіны.

«Акрамя таго, лічу, што настаў час сфарміраваць у краіне моцны і эфектыўны фінансавы рынак, здольны стаць магнітам для прыцягнення міжнароднага фінансавага капіталу, прамых замежных інвестыцый».

Ён таксама запатрабаваў распрацаваць канцэпцыю кіравання валавым знешнім доўгам. «І міністр фінансаў, і прэм'ер-міністр у нас галавой адказваюць за абслугоўванне знешняга доўгу. Але да гэтага часу не выканана маё даручэнне аб распрацоўцы канцэпцыі кіравання валавым знешнім доўгам, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Правільнае абслугоўванне дзяржаўнага доўгу без істотных абцяжарванняў для нацыянальнай эканомікі — ваша ключавая задача. Дакладная сістэма, якая не стварае пікавых нагрузак на бюджэт, павінна быць выпрацавана ў бліжэйшы час».

Звяртаючыся да міністра фінансаў, Прэзідэнт асабліва адзначыў: «Андрэю Міхайлавічу ў мяне ёсць прамое даручэнне. Вы павінны стаць для ўсіх «спадаром НЕ», калі размова ідзе аб павелічэнні бюджэтных расходаў».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што бюджэт — гэта ключавая задача любога ўрада. «І тое, што дэфіцыт бюджэту ў нас склаў 2,5 працэнта, — сур'ёзны сігнал, каб вы заняліся аптымізацыяй расходнай і папаўненнем даходнай яго частак, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Але папярэджваю: даходы бюджэту павінны ўзрастаць не за кошт новых падаткаў або павышэння іх ставак, а шляхам пашырэння падатковай базы, росту колькасці суб'ектаў гаспадарання, павышэння эфектыўнасці іх работы (павелічэння масы прыбытку) і росту эфектыўнасці эканомікі краіны ў цэлым».

Прэзідэнт лічыць, што старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Валерый Карашкоў павінен дабіцца таго, каб у тэхнічных рэгламентах Мытнага саюза не змяшчаліся патрабаванні больш нізкія, чым устаноўлены ў Беларусі, і ў той жа час каб яны былі гарманізаваны з міжнароднымі і еўрапейскімі нормамі. «Нам патрэбны аптымальныя правілы допуску прадукцыі на адзіную мытную тэрыторыю».

На яго думку Анатоль Русецкі, які ўзначаліў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі, — чалавек, які прайшоў добрую і навуковую, і практычную школу, ведае і пра праблемы айчыннай вытворчасці, і пра праблемы развіцця айчыннай навукі. «Для вас галоўная задача — забяспечыць маштабную інтэграцыю Нацыянальнай акадэміі навук у эканоміку краіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да кіраўніка НАН.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на практыцы да гэтага часу даводзіцца сутыкацца з нізкай інавацыйнай актыўнасцю і недастатковай успрымальнасцю эканомікі да вынікаў навуковых даследаванняў і распрацовак. «Для таго каб рассячы гэты вузел, лічу, настаў час падумаць і аб удасканаленні арганізацыйнай структуры Нацыянальнай акадэміі навук. Надаць ёй рысы магутнай навукова-вытворчай карпарацыі, аптымальна структураванага і самадастатковага навуковага цэнтра, які выконвае ўвесь спектр работ — ад фундаментальных і прыкладных даследаванняў да доследнай і серыйнай вытворчасці навукаёмістай прадукцыі па ўласных распрацоўках. Карпарацыі, здольнай хуткімі тэмпамі нарошчваць аб'ёмы рэалізацыі навукова-тэхнічнай прадукцыі як унутры краіны, так і на экспарт».

Больш значную ролю ў сістэме дзяржаўнага кіравання павінен адыгрываць і Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях. «Але пакуль ДКНТ не стаў інавацыйным штабам нашай краіны. Задача камітэта — не толькі збіраць ідэі і праекты, але і вельмі строга кантраляваць іх рэалізацыю на ўсіх узроўнях, эфектыўна садзейнічаць вырашэнню канкрэтных задач інавацыйнага развіцця».

Ён запатрабаваў паскорыць будаўніцтва беларускай АЭС. «Асабліва звяртаю ўвагу міністра энергетыкі і ўрада ў цэлым на тое, што ў гэтым пяцігоддзі неабходна ў поўным маштабе разгарнуць будаўніцтва беларускай АЭС. Вы зацягнулі гэты праект, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — У рэшце рэшт, з кім вы будзеце будаваць — мяне ўжо сёння гэта мала цікавіць: кітайцы, карэйцы, французы, расіяне. Але работу трэба пачынаць».

Трэба зменшыць узровень выкарыстання прыроднага газу, стварачы электрастанцыі на вугалі, мясцовых відах паліва і аднаўляльных крыніцах энергіі.

«У галіне энергазберажэння стратэгічная мэта — знізіць энергаёмістасць валавога ўнутранага прадукту на 50 працэнтаў адносна ўзроўню 2005 года і давесці долю мясцовых відаў паліва да 30 працэнтаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што ў Беларусі не так ужо і шмат такіх відаў паліва, напрыклад, драўніны. «Калі мы бяздумна будзем будаваць станцыі на мясцовых відах паліва, то ў нас можа не хапіць паліва. Таму трэба сур'ёзна абмеркаваць гэта пытанне. Пад кожную электрастанцыю павінна быць вызначана свая сыравінная зона».

Пры гэтым ён папярэдзіў, што адсутнасць бюджэтных грошай не павінна быць падставай для зрыву рэалізуемых праграм. «Прыцягвайце замежныя інвестыцыі, аптымізуйце бягучыя расходы па ажыццяўляемых праектах», — даручыў кіраўнік дзяржавы.

«Міністру энергетыкі Аляксандру Азярцу ў мяне ёсць пажаданне — не хавайцеся за спінай у начальнікаў. Едзьце ў Мінэнерга Расіі, «Газпрам» і дамаўляйцеся. На палітычным узроўні ўсе пытанні вырашаны, асноўныя пагадненні падпісаны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да міністра. — Таму фарміраванне цэн на газ, умоў імпарту, экспарту электраэнергіі — за вамі».

Паводле слоў Прэзідэнта, сёння пытанні ўстойлівага забеспячэння краіны электраэнергіяй, цяплом і прыродным газам пры скарачэнні спажывання імпартуемых паліўна-энергетычных рэсурсаў і энергазберажэнні набылі асаблівую актуальнасць.

Ад МЗС Аляксандр Лукашэнка патрабуе пастаяннага пошуку «ўплывовых верхаводаў бізнэсу сусветнага ўзроўню». «Для гэтага неабходна ў найкарацейшы тэрмін правесці рэвізію ўсіх звароткаў прыватных інвестараў, стварыць базу даных і забяспечыць суправаджэнне і кансультацыі інвестараў па ўсім спектры пытанняў ад стварэння да функцыянавання вытворчасці». Пры гэтым ён падкрэсліў, што ўжо ў гэтым годзе ў краіну трэба прыцягнуць больш як $6 млрд прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове.

Звяртаючыся да кіраўніка МЗС Сяргея Мартынава, ён адзначыў: «Эфектыўная рэалізацыя прынцыпу шматвектарнасці нашай знешняй палітыкі патрабуе ад нас больш збалансаванай работы на міжнароднай арэне. Так, сёння ў нас ёсць добрыя, але, на жаль, нешматлікія прыклады асваення новых рынкаў. Па-сапраўднаму магутнае ўзаемадзеянне склалася з Венесуэлай і Кітаем. Аднак гэтага мала». Цяпер трэба замацоўвацца і ў эканамічнай сферы, знаходзіць новыя рынкі для нашай прадукцыі. Прычым гэта работа павінна праводзіцца не на шкоду праверэным ужо традыцыйным гандлёва-эканамічным партнёрам. Любыя перакосы тут недапушчальныя, лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што, паглыбіўшыся ў фарміраванне Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, крыху выпусцілі з-пад увагі Саюзную дзяржаву. У гэтым інтэграцыйным аб'яднанні напрацаваны ўнікальны запас ідэй, вопыту, эканамічных і тэхналагічных сувязяў, карыснасць і перспектыўнасць якіх бясспрэчныя. «Эканамічны эфект ад прамога супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі лёгка заслоніць любыя гандлёвыя абароты з далёкім замежжам».

Акрамя таго, Беларусь своечасова не падцягнула да сур'ёзнага ўзроўню гандлёва-эканамічныя сувязі ў Еўрасаюзе. «Таму ваша задача тут, Сяргей Мікалаевіч, — пастаянны пошук сур'ёзных уплывовых верхаводаў бізнэсу сусветнага ўзроўню з шырокімі кантактамі і вагой ва ўрадавых кругах. Вы літаральна за руку павінны весці іх сюды. Бо нам ёсць што ім прапанаваць».

«Неабходна памятаць яшчэ адзін важны момант. Усе дамоўленасці, якія дасягаюцца на сустрэчах кіраўніка дзяржавы з аўтарытэтнымі прадстаўнікамі замежных дзелавых колаў, павінны няўхільна выконвацца. Бо кожная такая сустрэча не толькі мае эканамічны эфект, але і станоўча ўплывае на палітычныя адносіны з той ці іншай дзяржавай. Таму зрываў дамоўленасцяў на больш нізкім узроўні быць не павінна».

Акрамя таго, Прэзідэнт запатрабаваў рэальнага спрашчэння адміністравання і зніжэння падатковай нагрузкі, адзначыўшы, што па падаткаабкладанні да гэтага часу краіна знаходзіцца на апошнім месцы ў сістэме міжнародных рэйтынгаў, хоць па пытаннях зніжэння падатковай нагрузкі і спрашчэння падатковага адміністравання прынята нямала рашэнняў.

«Настойліва рэкамендую больш актыўна ўключыцца ў работу, у тым ліку і з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі. Спрашчэнне адміністравання і зніжэнне падатковай нагрузкі павінны быць рэальнымі!» — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да міністра па падатках і зборах Уладзіміра Палуяна.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на наяўнасць у гэтай сістэме праблем, пачынаючы з карупцыйных праяў і заканчваючы метадалагічнымі пытаннямі.

Акрамя таго, ён запатрабаваў вырашыць усе набалелыя праблемы ў будаўнічай галіне. Такую задачу ён паставіў перад міністрам архітэктуры і будаўніцтва Анатолем Нічкасавым. Сярод найбольш праблемных пытанняў у гэтай сферы Прэзідэнт назваў скарачэнне працягласці ўсіх этапаў будаўнічага цыкла, узмацненне адказнасці за выкананне дагаворных абавязацельстваў, узмацненне патрабаванняў да прыёмкі аб'ектаў і павелічэнне гарантыйных тэрмінаў іх эксплуатацыі.

«Нам жыццёва неабходна забяспечыць дастойную якасць жылля і зніжэнне яго кошту». Прэзідэнт таксама паставіў задачу задзейнічаць патэнцыял будаўнічага комплексу ў нарошчванні экспарту будаўнічых матэрыялаў і паслуг.

Звяртаючыся да міністра архітэктуры і будаўніцтва, Прэзідэнт нагадаў, што да канца першага паўгоддзя павінны быць вырашаны ўсе пытанні па ўстараненні недахопаў за кошт будаўнічых арганізацый у новым здадзеным жыллі.

Што датычыцца жыллёва-камунальнай сістэмы, то Аляксандр Лукашэнка не гатовы перадаць яе ў веданне Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва. «Я яшчэ не гатовы жыллёва-камунальную сістэму перадаць у Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, — сказаў ён. — Дзе больш за ўсё скаргаў? У будаўніцтве і камунальнай гаспадарцы. Дык што мы робім?»

Прэзідэнт прапанаваў яшчэ раз прынцыпова падумаць над гэтым пытаннем. Паводле яго слоў, гэта датычыцца абсалютна ўсіх галін, і, у прыватнасці, пытанняў аб магчымым зліцці Міністэрства па падатках і зборах і Мінфіна. «Давайце не будзем спяшацца. У нас не такія буйныя міністэрствы, не так многа там людзей, а наламаць дроў можам», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Памятайце, што ўсе размовы аб ліквідацыі міністэрстваў адбываюцца толькі з-за адсутнасці здавальняючых вынікаў іх дзейнасці».

Беларускі лідар адзначыў, што «цэнтр цяжару работы ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы павінен быць перанесены на губернатараў, старшынь раённых і гарадскіх выканаўчых камітэтаў». «Іх трэба загрузіць. Уся работа павінна быць там. Міністр жа павінен быць кантралёрам ад урада ў гэтай сферы».

Звяртаючыся да новага намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Калініна, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што яму дастаўся адзін з самых складаных участкаў работы: курыраванне пытанняў развіцця будаўнічага комплексу, сувязі і інфарматызацыі, транспарту і камунікацый, жыллёвай і камунальнай гаспадаркі, ліквідацыі надзвычайных сітуацый.

Аляксандр Лукашэнка зноў падкрэсліў, што жыллёва-камунальная гаспадарка павінна забяспечваць камфортныя ўмовы пражывання для грамадзян. Паводле яго слоў, галоўнае тут — зніжэнне затрат, своечасовае і якаснае прадастаўленне паслуг, а таксама надзейная работа сістэм жыццезабеспячэння галіны. «Задачы відавочныя, і для іх вырашэння не патрабуецца значных намаганняў. Дастаткова навесці элементарны парадак».

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў развіваць транспартную інфраструктуру і павышаць якасць абслугоўвання пасажыраў і грузаперавозчыкаў. Такую задачу ён паставіў перад міністрам транспарту і камунікацый Іванам Шчэрбам.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Беларусь з'яўляецца транспартным калідорам паміж Еўропай і Расіяй, Украінай і краінамі Балтыі. Аднак да гэтага часу існуючы патэнцыял выкарыстоўваецца не ў поўнай меры.

Ён звярнуў увагу на неабходнасць больш актыўнай работы над мадэрнізацыяй агульнаеўрапейскіх транспартных калідораў, што праходзяць праз Беларусь, павышэння тэхнічнага ўзроўню еўрапейскіх аўтамабільных дарог.

Што датычыцца чыгуначнага транспарту, то Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што тут трэба будзе рэалізаваць вельмі сур'ёзныя праекты па развіцці гарадскіх, міжабласных і міжнародных скорасных перавозак пасажыраў транспартам агульнага карыстання.

Беларускі лідар указаў на першарадную задачу на паветраным транспарце — няўхільнае забеспячэнне бяспекі палётаў. Таксама трэба больш актыўна працаваць над удасканаленнем інфраструктуры аэрапортаў і паляпшэннем іх загрузкі і прыцягненнем інвестараў. Пры гэтым ён прывёў прыклад: інвестары з Катара хочуць укладваць сродкі ў развіццё Брэсцкага аэрапорта.

Звяртаючыся да міністра сувязі і інфарматызацыі Мікалая Панцялея, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што той ужо другое пяцігоддзе ўзначальвае адну з самых навукаёмістых і перспектыўных галін. «Быццам бы яна развіваецца, але не за кошт таго, што робіць міністэрства. Вы не ў авангардзе гэтага развіцця. Патэнцыял галіны поўнасцю не рэалізаваны, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Гэта датычыцца пытанняў якасці і даступнасці інтэрнэт-паслуг, прыёму лічбавага тэлебачання. У нас адны з самых высокіх на постсавецкай прасторы тарыфы на паслугі мабільнай сувязі ў роўмінгу».

Аляксандр Лукашэнка таксама запатрабаваў выпрацаваць стратэгію развіцця структураўтваральных прадпрыемстваў канцэрна «Белнафтан». Перш за ўсё размова ідзе аб Баранавіцкім вытворчым баваўняным аб'яднанні, акцыянерных таварыствах «Сукно», «Камволь», «Дывановы Брэста», рэспубліканскім вытворчым унітарным прадпрыемстве «Віцебскі футравы камбінат».

Звяртаючыся да першага намесніка прэм'ер-міністра Уладзіміра Сямашкі і старшыні канцэрна «Беллегпрам» Генадзя Вырко, Прэзідэнт сказаў: «Трэба будзе дакладна вызначыцца з далейшым развіццём гэтага вельмі праблемнага сектара эканомікі. Тут чатыры галоўныя галіны: тэкстыльная, швейная, трыкатажная і абутковая. І кожнай трэба будзе знайсці сваё месца на сусветным рынку».

«Мы не можам канкураваць з таннымі кітайскімі і турэцкімі таварамі шырокага ўжытку. Наша ніша — добрая прадукцыя сыравіннага сегмента», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Акрамя таго, ёсць недапрацоўкі па асартыменце і якасці сельгаспрадукцыі, нарошчванні экспартнага патэнцыялу і асваенні новых рынкаў.

Прэзідэнт лічыць, што новаму намесніку прэм'ер-міністра Валерыю Іванову і міністру сельскай гаспадаркі і харчавання Міхаілу Русаму пад сілу забяспечыць дасягненне сельскагаспадарчымі і перапрацоўчымі арганізацыямі ўстойлівага фінансавага стану за кошт нарошчвання да 2015 года выручкі больш як у 2 разы, прыбытку ад рэалізацыі — у 9 разоў і рэнтабельнасці продажаў да ўзроўню не менш як 11 працэнтаў. Таксама запланавана павелічэнне экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання да сумы больш як $7 млрд.

«Прынцыпы прыватызацыі ў нас даўно вядомы. Патрабую іх няўхільнага выканання, — сказаў ён. — Але прашу не забываць, што інструмент прыватызацыі не павінен разглядацца як сродак латання дзірак. Для нас гэта перш за ўсё спосаб прыцягнення прамых інвестыцый у развіццё эканомікі».

Аляксандр Лукашэнка таксама нагадаў аб неабходнасці правядзення работы па дзейсным уключэнні ў абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, а таксама эфектыўнай кропкавай прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці.

«Я з вас буду патрабаваць у будучым годзе за тое, як задзейнічаны ўсе свабодныя магутнасці, вытворчыя і невытворчыя, у нашай краіне. Я гэта тры гады таму даручыў. Вось якраз паглядзім, што вы зрабілі ў гэтым напрамку. Вы павінны варушыць усіх знізу даверху, — сказаў Прэзідэнт. — Аддаць нават часам за бясцэнак. Але галоўнае, каб на кожным квадратным метры нявыкарыстаных плошчаў сёння выраблялася прадукцыя».

Кіраўнік дзяржавы асобна спыніўся на пытаннях знешняга гандлю, падкрэсліўшы, што тут па-ранейшаму важнейшай задачай з'яўляецца яго збалансаванасць. «За выкананне гэтай задачы адказныя ўсе — урад, Нацыянальны банк, вобласці, аж да кіраўніка канкрэтнага прадпрыемства», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што па выніках 2010 года адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі склала амаль $7,5 млрд. Толькі тавараў у краіну ўвезлі амаль на $10 млрд больш, чым вывезлі.

«Задача на 2011 год — безумоўнае выкананне зацверджанага важнейшага параметра па сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі. Ураду неабходна забяспечыць значнае перавышэнне тэмпаў росту экспарту над імпартам». «Для зніжэння імпартаёмістасці неабходна прыняць вычарпальныя меры па павышэнні энергаэфектыўнасці і навядзенні парадку з матэрыялаёмістасцю, каб наблізіцца да ўзроўню развітых еўрапейскіх краін». У якасці яшчэ аднаго рэзерву для скарачэння адмоўнага сальда Аляксандр Лукашэнка назваў экспарт паслуг, які неабходна актыўна нарошчваць.

Прэзідэнт лічыць, што наймальнікі або ўласнікі самі павінны выбіраць найбольш эфектыўную сістэму аплаты працы сваіх работнікаў.

«Для недзяржаўных, прыватных прадпрыемстваў павінны быць зняты ўсе адміністрацыйныя бар'еры і абмежаванні па аплаце высокапрадукцыйнай і эфектыўнай працы. Зарабіў, разлічыўся з бюджэтам — астатняе размяркоўвай, як лічыш патрэбным. Гэты вопыт трэба пераносіць і на дзяржпрадпрыемствы, каб яны былі ў аднолькавых умовах. Вызначайце ім дадатковую нагрузку і дадатковыя правілы гульні, паколькі яны дзяржпрадпрыемствы».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў краіне выканалі ўзятае на трэцім Усебеларускім народным сходзе абавязацельства давесці сярэднюю заработную плату па рэспубліцы да канца 2010 года да $500. «Пры гэтым не дапушчана значная дыферэнцыяцыя даходаў грамадзян. Вы гэта павінны кантраляваць. Гэта святы паказчык». «Цяпер мы павінны адкрыта і сумленна сказаць людзям, што далейшы рост якасці іх жыцця, іх заработак будзе залежаць ад асабістай працы і прадпрымальнасці».

Паводле яго слоў, задача ўрада — стварыць для ўсіх жадаючых працаваць умовы і магчымасці зарабляць сродкі для забеспячэння дастойнага ўзроўню жыцця для сябе і сваёй сям'і.

Разам з пытаннямі матывацыі працы асаблівую ўвагу, на думку Прэзідэнта, варта ўдзяліць эканамічна эфектыўнай занятасці людзей. «Не сакрэт, што для некаторых нашых прадпрыемстваў, перш за ўсё прамысловых флагманаў, характэрна наяўнасць залішняй рабочай сілы. Ва ўмовах мадэрнізацыі вытворчасці гэта праблема будзе набываць асаблівую актуальнасць».

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад усіх членаў урада пры рэалізацыі планаў тэхнічнага пераўзбраення прадпрыемстваў праводзіць сацыяльна адказную мадэрнізацыю вытворчасці. «У гэтай рабоце павінны ўдзельнічаць і міністр, і кіраўнік мясцовай выканаўчай улады, і кіраўнік мадэрнізуемага прадпрыемства, — сказаў ён. — Мы не павінны раскідвацца рабочымі кадрамі. Гэта адно з нашых галоўных багацтваў. Ніводны работнік у працаздольным узросце, які падлягае вызваленню, не павінен апынуцца на вуліцы».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на неабходнасць больш адказнага падыходу да праблемы вытворчага траўматызму. «Час выкараніць практыку фармальных адносін да выканання сваіх службовых абавязкаў спецыялістамі па ахове працы на прадпрыемствах. Патрэбна канкрэтная работа па прадухіленні нясчасных выпадкаў на вытворчасці», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама падкрэсліў, што нельга дапусціць паўтарэння сітуацыі, якая мела месца ў мінулым годзе ў Пінску.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што здароўе нацыі — галоўны прыярытэт у дзяржаўнай палітыцы.

Прэзідэнт лічыць неабходным павысіць адказнасць медработнікаў за якасць аказання медыцынскіх паслуг і карэнным чынам змяніць адносіны да пацыента.

Ён нагадаў, што за апошнія пяць гадоў у краіне значна ўмацавана база аховы здароўя, аднак ёсць і праблемы. Паводле слоў Прэзідэнта, гэта, перш за ўсё, паліклінікі і ўкамплектаванасць урачамі. «Маса скаргаў з боку грамадзян на чэргі, адносіны медперсаналу, што недапушчальна. Зразумела, перагружанасць і іншае. Але калі ўрач не лечыць словам, гэта таксама не ўрач», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён звярнуў увагу міністра аховы здароўя, што да 2015 года неабходна поўнасцю вырашыць усе праблемы забяспечанасці ўрачамі-спецыялістамі.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў таксама ўвагу на развіццё сучаснай фармацыі, вытворчасці лякарстваў новых пакаленняў. «Неабходны прарыўныя напрамкі на аснове самых смелых ідэй, уласных навуковых праектаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, нагадаўшы, што ў Беларусі ўкладзена ў рэстаўрацыю помнікаў культуры, аднак належнай аддачы ад гэтых аб'ектаў краіна не мае.

Гаворачы аб развіцці інфармацыйнай сферы, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць выводу на якасна новы ўзровень газет, часопісаў, тэле- і радыёвяшчання. «Неабходна правесці аптымізацыю сістэмы дзяржаўных перыядычных выданняў, выключыць выпуск непапулярных газет і часопісаў, якія дубліруюць адзін аднаго».

Паводле яго слоў, прадметам асаблівай увагі Міністэрства інфармацыі павінна стаць пашырэнне аб'ектыўнай інфармацыі аб Беларусі за мяжой з дапамогай тэлеканала «Беларусь-ТБ» і сеткі інтэрнэт.

Прэзідэнт звярнуў увагу ўсіх прысутных і на пытанне дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату. «Нельга дапусціць, каб вырашэнне маштабных задач, якія стаяць перад эканомікай краіны, патанула ў кучы папер. Асобныя кіраўнікі, відаць, даўно не чыталі Дырэктыву № 2», — падкрэсліў ён. «Ва ўсіх звёнах кіравання неабходна пакінуць толькі тую службовую перапіску, без якой ніяк нельга абысціся. Астатняе выключыць. Перастаньце закідваць адзін аднаго паперамі!».

На заканчэнне, звяртаючыся да прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Вы ведаеце, што рабіць. Пачынайце дзейнічаць. У вас «баявыя» віцэ-прэм'еры, 5 штыкоў, вы — шосты. Стаўце задачы і вырашайце іх. Трэба вам дадатковыя паўнамоцтвы — калі ласка, я гатовы на ўзровень урада перанесці шэраг паўнамоцтваў Прэзідэнта ў эканамічнай сферы або іншых, я не супраць, каб менш гэтай бюракратыі было. Ёсць Адміністрацыя Прэзідэнта, праз пэўныя структуры, памочнікаў я займуся кантролем. Прымайце рашэнні і дзейнічайце».

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«Упор у спартыўнай палітыцы будзе зроблены на якасць падрыхтоўкі спартсменаў і зарплату»

Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 26 лютага прыняў удзел у традыцыйным штогадовым зімовым спартыўным свяце «Мінская лыжня», якое праходзіла ў Раўбічах.

«Мінская лыжня» з'яўляецца завяршальным этапам рэспубліканскага свята «Беларуская лыжня», якое прайшло ў абласных гарадах у тры этапы з удзелам калектываў фізічнай культуры арганізацый, устаноў адукацыі і органаў дзяржаўнага кіравання. У гэтым годзе «Мінская лыжня» адзначае 25-гадовы юбілей.

Першую эстафетную лыжную гонку 4х2,5 км праходзілі лепшыя зборныя сталічных ВНУ. Лідарства тут атрымала каманда БДУ. Другой да фінішу прыйшла зборная Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, трэцяе месца заняла каманда Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў. Лыжная гонка сярод мінскіх ВНУ ў гэтым годзе ўпершыню праводзілася на свяце па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка ўручыў прызёрам медалі, дыпломы і прызы, а камандзе-пераможцы — і кубак.

Спаборніцтвы 51 каманды рэспубліканскіх дзяржорганаў праходзілі ў трох групах: А, В і С. Як і ў мінулыя гады, перамогу ў групе А атрымала каманда Прэзідэнта Беларусі ў складзе Аляксандра Іоненкава, Сяргея Булыгіна і Людмілы Ананька, а таксама Аляксандра Лукашэнкі, які праходзіў дыстанцыю на заключным, чацвёртым, этапе эстафеты. Сярэбраным прызёрам спаборніцтваў у групе А стала каманда Службы бяспекі Прэзідэнта. Трэцяе месца заваявала зборная Міністэрства абароны.

Дзелячыся ўражаннямі ад гэтага зімовага свята пасля завяршэння спаборніцтваў, Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што «Мінская лыжня» будзе жыць, пакуль людзі будуць хацець быць здаровымі.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што ў Беларусі ў бліжэйшы час не будуць узводзіцца буйныя спартыўныя аб'екты, акцэнт будзе перанесены на якасць падрыхтоўкі спартсменаў. «У бліжэйшы час гіганцкіх спортзабудаванняў узводзіць не будзем. Ужо дастаткова зроблена, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы будзем рабіць упор на падрыхтоўку спартсменаў і добрую зарплату. Але патрабаванне будзе жорсткае».

Прэзідэнт таксама дадаў, што дзяржава будзе дапамагаць выхоўваць на існуючых спартыўных аб'ектах добрых спартсменаў, якія прыносілі б краіне перамогі і славу. Паводле слоў беларускага лідара, для гэтага ёсць магчымасці. «У нас ёсць сродкі, каб выхоўваць спартсменаў, плаціць трэнерам, ёсць выдатныя аб'екты — паказвайце вынікі».

Гэта традыцыйнае мерапрыемства прыцягнула тысячы беларусаў, многія з якіх прыехалі ў Раўбічы з сем'ямі. «Мінская лыжня» з чыста спартыўнага мерапрыемства перарасла ў сапраўднае сямейнае свята.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАЎ ІНТЭРВ'Ю АМЕРЫКАНСКАЙ ГАЗЕЦЕ «ВАШЫНГТОН ПОСТ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора даў інтэрв'ю газеце «Вашынгтон пост», якая з'яўляецца адной з трох найбольш уплывовых штодзённых газет у ЗША.

Інтэрв'ю прадаўжалася каля трох гадзін. Кіраўніку дзяржавы было зададзена некалькі дзясяткаў пытанняў, якія датычыліся ўнутранай і знешняй палітыкі, асаблівасцяў эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў Беларусі, асабістай біяграфіі і захапленняў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Супраць Беларусі вядзецца накіраваная на дыскрэдытацыю краіны дэструктыўная інфармацыйная атака

Супраць Беларусі праводзіцца дэструктыўная інфармацыйная атака, накіраваная на дыскрэдытацыю краіны. Аб гэтым заявіў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных у сувязі з інтэнсіўным распаўсюджваннем інсінуацый аб Беларусі.

«Мы звярнулі ўвагу, што за апошнія некалькі дзён у замежных СМІ пачалі інтэнсіўна з'яўляцца лжывыя выдумкі пра Беларусь. Спачатку выдумалі беларускіх наёмнікаў у Лівіі, потым прызямленне ў Мінску самалёта з золатам і брыльянтамі з Лівіі, сёння арганізавалі абвінавачанні ў міфічным парушэнні санкцый Савета Бяспекі ААН», — сказаў афіцыйны прадстаўнік беларускага МЗС. Паводле яго слоў, «усе гэтыя заявы не адпавядаюць рэчаіснасці, супраць Беларусі праводзіцца дэструктыўная інфармацыйная атака, накіраваная на дыскрэдытацыю краіны». Галоўнай зброяй праціўнікаў Беларусі становяцца хлусня і паклёп. Андрэй Савіных падкрэсліў, што «гэта лішні раз сведчыць іх маральны ўзровень і паказвае іх рэальнае стаўленне да Беларусі і беларускага народа».

Абзац

Больш за 30 прадпрыемстваў з Беларусі, Расіі і Украіны збяруць Першая міжнародная спецыялізаваная выстаўка-кірмаш «Малочны край-2011». Выстаўка пройдзе ў Мінску 1-4 сакавіка ў павільёне «Б» Нацыянальнага выставачнага комплексу «Белэкспа» па вул. Янкі Купалы, 27. Уваход вольны.

За адны суткі — з 6.00 26 лютага па 6.00 27 лютага — у Беларусі на пажарах загінула 12 чалавек.

Начальнік цягніка «Санкт-Пецярбург—Брэст» затрыманы за кантрабанду спірту, паведамляе БЕЛТА. У службовым купэ затрымана выяўлена і канфіскавана 60 л вадкасці з утрыманнем спірту. У тым жа цягніку былі затрыманы і дзве правадніцы, у якіх канфіскавана 25 л вадкасці з утрыманнем спірту і 30 пачкаў цыгарэт імпартнай вытворчасці без акцызных марак Беларусі.

Двайное забойства здзейснена ў Гомельскай вобласці. У вёсцы Сапрыкі Чачэрскага раёна забітыя сякерай дзве жанчыны: 1963 і 1932 г.н. Па звестках следства, забойства здзейсніў мясцовы жыхар 1951 г.н., які быў затрыманы ў той жа дзень. Мужчына быў у стане алкагольнага ап'янення. Ён скраў у сваіх ахвяр грошы. Заведзена справа.

Поўны абзац

Трохгадовае дзіця знайшло за канапай жывога алігатара. Жыхарка Бразіліі была ў шоку, калі выявіла ў сябе дома за канапай жывога алігатара. Гэта здарылася неўзабаве пасля таго, як праліўныя дажджы прывялі да наводнення, і некалькі раёнаў горада Параупебас апынуліся пад вадой. Рэптылію жанчыне дапамог выявіць 3-гадовы сын: ён сядзеў ля канапы і бясклапотна стукаў алігатара рукой па галаве. Жанчына схапіла дзіця на рукі і пазваніла выратавальнікам, якія прыехалі і злавілі жывёліну даўжынёй 1,5 м. Па словах выратавальнікаў, сям'і пашанцавала, што рэптылія не была галодная — яна магла пакалечыць і нават забіць дзіця. Злоўленага алігатара выпусцілі непадалёк ад горада.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

**31 марта 2011 года в 14.00 в кабинете директора по адресу: Минский район, д. Острошицкий Городок,

«СУСТРЭЧА МАСЛЕНІЦЫ»

прайшла ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў в. Азярцо.

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Прамая лінія

І ГАЛАВА КРУЖЫЦЦА, І Ў СПІНЕ «СТРАЛЯЕ»

НАША чарговая медыцынская «прамая лінія» яшчэ раз нагадала, што не існуе на белым свеце цуда-таблеткі, пасля прыёму якой адступаюць любыя непрыемнасці са здароўем. Гэта не азначае, што эфектыўнага лячэння не існуе ў прынцыпе: маўляў, лячыся не лячыся — усё адно... Да ўрача ісці, вядома ж, трэба. І выконваць яго рэкамендацыі таксама. Але, разам з тым, давядзецца перагледзець уласны лад жыцця, усвядоміць, што наўрад ці хвораму ўдасцца жыць так, як жывуць здаровыя людзі. Хворыя на той жа радыкуліт нярэдка думаюць, што пасля лячэння стануць як новыя, і забываюцца, што ў час рэмісіі неабходна працягваць берагчы паясніцу, паколькі боль можа адступіць, а вось набытае захворванне застаецца з пацыентам назаўсёды.

Дзеля здаровага пазваночніка трэба сачыць за вагой, пазбягаць фізічных перагрузак, займацца лячэбнай гімнастыкай і плаваннем, што добра ўмацоўвае адпаведныя мышцы. Пры любых праблемах з пазваночнікам паказана і санаторна-курортнае лячэнне. Наогул найбольш распаўсюджанай паталогіяй пазваночніка з'яўляецца праблема, абумоўленая старэннем апошняга — астэахандроз, або ператварэнне міжпазваночнага дыска ў косць. Да астэахандрозаў адносяць і спандылёз — змяненне формы, дэфармацыя пазванкоў. Грыжы дыска спрыяюць і радыкуліту. Такія паталогіі часам носяць спадчынны характар, але захворванне могуць выклікаць і неспрыяльныя знешнія ўмовы. Так прычынай радыкулітаў у маладых людзей часта з'яўляецца празмерная фізічная нагрузка, няправільны пад'ём цяжкасцяў, а таксама пераахалоджванне, вірусныя інфекцыі.

Пры першых прыкметах любога болю ў пазваночніку не трэба самастойна выстаўляць сабе дыягназ — лепш адразу паказацца неўролагу па месцы жыхарства і прайсці кансерватыўнае лячэнне. Дакладней, комплекснае кансерватыўнае лячэнне — медыкаментозную тэрапію, фізіятэрапію, выкананне ў хатніх умовах фізічных практыкаванняў. Хірургічнае ж умяшанне паказана ў крайніх выпадках, скажам, пры ярка выражаным выпадзенні грыжы дыска, ярка выражаным болевым сіндроме, парушэнні функцыі тазавых органаў, слабасці ў нагах.

А на вашы пытанні адказаў <u>загадчык неўралагічнага аддзялення 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр ІВАНОЎ</u>.

☎— Гомель, Ніна Іванаўна. Мяне часта турбуюць болі ў вобласці сэрца. Аднак кардыёлагі паталогіі не знайшлі. Лечачы ўрач гаворыць, што прычынай боляў можа быць астэахандроз. Ці магчыма такое?

— Калі кардыёлаг не знайшоў паталогіі, варта звярнуцца да неўролага па месцы жыхарства і пракансультавацца ў яго. Хутчэй за ўсё, болі звязаны з пашкоджаннем грудного аддзела пазваночніка. І калі гэта пацвердзіцца клінічна, на рэнтгенаграмах, якія вам зробяць, давядзецца прайсці курс лячэння ва ўрача-неўролага амбулаторна або стацыянарна.

☎— Лепель, Надзея. Зараз рэкламуецца мноства розных партатыўных электранейрастымулятараў, якія абяцаюць пазбавіць ад радыкуліту, люмбага і г.д. Як вы ставіцеся да гэтых прыбораў?

— Па-першае, любое прызначэнне павінен рабіць урач. Па-другое, кожны прыбор мае свае параметры, якія, бывае, супярэчаць лячэнню, прызначанаму спецыялістам. Нагул, калі вас турбуе боль, ніякая электрастымуляцыя непажаданая, бо яна ўзмацняе болевы сіндром.

☎— Гродна, Ганна Пятроўна. Мне 76 гадоў. Пастаянна баліць галава, ёсць галавакружэнне. Выпісваюць прэпараты для расшырэння сасудаў, але галаўны боль не праходзіць. З чым гэта можа быць звязана?

— Прычын для галаўнога болю можа быць шмат. Таму, перш чым прызначыць лячэнне, трэба дакладна ведаць, які ў вас дыягназ. Для гэтага трэба абследавацца: зрабіць МРТ галаўнога мозга, абследаваць сасуды галаўнога мозга на наяўнасць трамбатычных пашкоджанняў. І толькі потым прызначаць лячэнне.

☎— Маладзечна, Пётр Пятровіч, 83 гады. Пачала балець паясніца. Мне кажуць, што гэта астэахандроз. Усё лячэнне — індаметацынавая мазь і абгортванне спіны чым-небудзь цёплым. Ці можна мне параіць нейкае больш эфектыўнае лячэнне?

— Болі ў паясніцы могуць быць абумоўлены не толькі астэахандрозам. Хоць у вашым узросце такое магчыма. Аднак у вас зараз ідуць і гарманальныя парушэнні, з-за гэтага адбываецца гарманальная спондылапатыя. Вы павінны пракансультавацца ў неўролага. Калі апошняе пацвердзіцца, варта працяглы час прымаць прэпараты з утрыманнем кальцыю і вітаміну $Д_3$. Калі ў вас ёсць дыскарадыкулярны канфлікт — выпінанне дыска, тады

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

варта прайсці курс лячэння ў неўролага па месцы жыхарства. Пры гэтым можа быць прызначаны цэлы комплекс прэпаратаў.

☎— Капыль, Алена. Чула, што мядовыя кампрэсы дапамагаюць пры болях у суставах. Ці так гэта?

— Хутчэй за ўсё, гэта будзе псіхатэрапеўтычны эфект. У медыцынскай практыцы мядовая фізіятэрапія не выкарыстоўваецца.

☎— Брэст, Генадзь Іванавіч. Ці варта давярацца мануальнаму тэрапеўту пры выпадзенні пазваночнага дыска?

— Перш чым даверыцца мануальнаму тэрапеўту, варта добра падумаць. Па-першае, гэта павінен быць дыпламаваны спецыяліст. Па-другое, неабходна зрабіць абследаванне: лепш за ўсё камп'ютарную тамаграфію ці хоць бы здымкі адпаведнага аддзела пазваночніка, і толькі потым вырашыць з мануальным тэрапеўтам і з лечачым урачом-неўролагам, ці варта праходзіць мануальную тэрапію. Калі ў вас вялікае выпінанне міжпазваночнага дыска, грыжа дыска, я б не рэкамендаваў рабіць мануальную тэрапію, бо яна можа прывесці да праблем.

☎— Баранавічы, Алена Пятроўна. 46 гадоў. Часта і раптоўна цямнее ў вачах. Але ціск нармальны. З чым гэта можа быць звязана?

— Пацямненне ў вачах можа быць звязана з пашкоджаннем зрокавага нерва, а таксама з парушэннем крывазвароту ў сасудах галаўнога мозга. Варта звярнуцца да ўрача і даабследавацца. Неабходна праверыць вочнае дно, атрымаць заключэнне акуліста аб стане вашай сятчаткі. Зрабіце таксама МРТ галаўнога мозга і доплераграфічнае абследаванне сасудаў галаўнога мозга.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

На «Еўрабачанне» паедзе Анастасія Віннікава

Вядома, што Анастасіі 20 гадоў і што яна вучыцца ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце. Разам з кампазітарам Яўгенам Алейнікам на суд журы нацыянальнага адбору спявачка прадставіла песню «Born in Belorussia». Вядома, што раней з той жа песняй дзяўчына ўдзельнічала ў трэцім сезоне праекта «Музычны суд» на тэлеканале АНТ, але ў фінал праекта яна не трапіла. Прэстыжнае права прадставіць Беларусь з той жа песняй спявачцы прадаставіла фокус-група, у якую ўвайшлі прадстаўнікі Першага канала, тэлеканалаў «ЛАД», АНТ і СТБ. Хутка чытайце падрабязнасці.

Ілья ЛАПАТО.

ОАО «Минский завод отопительного оборудования»

ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ 30 марта 2011 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 29 — зал заседаний.

ПОВЕСТКА ДНЯ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ открытого акционерного общества «Минский завод отопительного оборудования»:

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития Общества на 2011 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2010 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2010 год, распределения прибылей и убытков Общества.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2010 год.
5. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2010 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2011 год.
7. Об утверждении изменений в Устав Общества.
8. Об избрании членов Наблюдательного совета, его состава и ревизионной комиссии Общества.
9. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. Об оказании спонсорской помощи.
11. О наделении Наблюдательного совета полномочиями, отнесенными к компетенции собрания акционеров.
12. Об утверждении органа печати Общества.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться по указанному адресу (профком) с 25 по 30 марта 2011 г. с 10 до 16 часов.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 15.00 до 15.45 в день и по месту проведения собрания на основании документа, удостоверяющего личность. Кроме того, представитель акционера должен иметь доверенность (руководитель юридического лица, являющегося акционером, — документы, подтверждающие его полномочия).

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров на 20 марта 2011 г.

Наблюдательный совет ОАО «Минский завод отопительного оборудования»

УНП 100008064

Уважаемые акционеры ОАО «Лидсельмаш»

31 марта 2011 года СОСТОИТСЯ <u>ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ</u> ОАО «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70.

<u>Повестка дня собрания:</u>

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития Общества на 2011 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2010 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год, распределения прибыли и убытков Общества.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2010 год.
5. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2010 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2011 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Начало работы собрания в 16.00.
Регистрация участников собрания с 15.00 до 15.50.

Наблюдательный совет ОАО «Лидсельмаш». УНП 500021638

Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»

25 марта 2011 года СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Рапс»,
расположенного по адресу:
Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица.

Собрание пройдет по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Отчет о работе наблюдательного совета в 2010 году.
2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 году и основных направлениях деятельности Общества на 2011 год.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2010 год. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2011 год и 1-й квартал 2012 года.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
9. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, ОАО «Рапс» (бухгалтерия) с 17 по 24 марта 2011 года (время работы с 14.00 до 16.00) либо 25 марта 2011 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 25 марта 2011 г. в 11.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 28 февраля 2011 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!

Справки по тел.:
8 017 506 92 11, 8 017 506 93 41. УНП 600068480

ЯК НЕ СПАЗНІЦЦА?

«А я думаю так...»

Што рабіць, каб усюды паспяваць? Кожны ранак тысячы беларусаў выходзяць на працу, кожны вечар які-небудзь хлопец чакае ля кінатэатра дзяўчыну, штохвіліну стаяць у заторы таксісты. І кожны працаўнік, кожная дзяўчына, кожны таксіст — усе хочуць паспець, не спазніцца. Адны паспяваюць заўжды, іншыя пастаянна спазняюцца. Якія парады можна даць для апошніх?

ШТО РАБІЦЬ, КАБ НЕ СПАЗНЯЦЦА?

Юлія ЖУКОЎСКАЯ, студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта:

— Калі спазняешся, унутры ажывае нейкі «чарвячок», які прымушае моцна перажываць! Вельмі не люблю спазняцца. Хай і кажуць, што дзяўчатам можна, але я заўсёды стараюся быць у прызначаны час. А лепш — раней выходзіць з дому. Калі чалавек пастаянна спазняецца, то можа прапусціць і галоўную падзею жыцця — сваё вяселле. Вось так!

Дзяніс МІСЮЛЯ, кіраўнік кампаніі «Сучасныя Медыя Сістэмы»:

— Я вельмі пунктуальны чалавек. Магу часам прыйсці уа 30 хвілін раней. І не люблю, калі іншыя спазняюцца — гэта раздражняе і, галоўнае, ты не ведаеш, чакаць іх ці не. А каб не спазняцца, лепш за ўсё у думках паставіць сябе на месца чалавека, які будзе вас чакаць. Напэўна, у душы вам стане нямёмка. Яшчэ адзін спосаб — гэта каб на працы некалькі разоў правучылі рублём за спазненне. Тады ахвота спазняцца адпадзе надоўга.

Алесь ЧУМАКОЎ, музыка, адзін з салістаў гурта «Стары Ольса»:

— Калі спазняешся, пасля заўсёды сорамна. Але часам здараецца: табе ўжо выходзіць, а ў галаве — новая мелодыя ці радкі з'явіцца. Не апрацуеш іх адразу — пазней забудзешся. Але залежыць таксама ад пазіцыі: настроіш сябе не спазніцца — за гадзіну выйдзеш, каб паспець. Але спазняцца не люблю.

Ларыса ГРЫБАЛЁВА, спявачка, кіраўнік канцэртнага агенцтва:

— Я падганяю гадзіннік (*усміхаецца* — **І.Л.**). Прычым не толькі той, што на руцэ, але і ўсе астатнія. І абавязкова звечара рыхтую ўсе рэчы на працоўны дзень, каб зранку не лётаць і не мітусіцца. Але як любая жанчына, нават пераставіўшы процьму гадзіннікаў, магу спазніцца. Нават у такім выпадку я не хлушу людзям, што «пераводзіла бабулек цераз дарогу» — кажу праўду. Напрыклад, калі працавала салісткай у аркестры Фінберга, пару разоў прасыпала. Але Міхаілу Якаўлевічу заўсёды шчыра ў гэтым прызнавалася.

Вера ПАЛЯКОВА, вядучая праграмы «Жыццё як жыццё»:

— Спазненне — гэта непавага да чалавека. Я ў гэтым плане заўсёды прыдзірлівая. Калі спазняюся — абавязкова папярэджваю тых, хто мяне чакае. Але ад спазнення не застрахуешся, рознае можа быць: аднойчы я ехала на здымкі, стомленая пасля пералёту (у той дзень толькі прыляцела з кінафестывалю з Чалябінска). Ехала такая — і ўехала ў зад іншай машыны. Задумалася проста (*смяецца* — **І.Л.**). У выніку дзве гадзіны чакалі міліцыю, дзве гадзіны афармляліся... Дзень быў страчаны. Таму сабранасць таксама іграе ролю. Заўжды трэба быць у тонусе.

Апытваў Ілья ЛАПАТО.

ШМАТ ЦЯЛЯЦІНЫ І ТРЫКАТАЖУ

Супрацоўнікі мытні і памежнікі ў вёсцы Пецькі Кобрынскага раёна і ў Брэсце затрымалі аўтамашыны з 80 тушамі цялят і 9 сумкамі трыкатажных вырабаў. Кантрабанда пацягнула на 166 млн рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 16.03.2011 повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Номер предмета торгов	**№ 2**
Наименование и характеристики продаваемого имущества	Изолированное помещение с инв. номером 500/D-698511 общей площадью 19 кв. м (помещение, не относящееся к жилищному фонду)
Местонахождение имущества	г. Минск, пер. Загородный 3-й, д. 4А, пом. 14
Собственник имущества	ОДО «Перспектива-Инвест Рид»
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39
Начальная цена	57 495 015 белорусских рублей
Сумма задатка	5 000 000 белорусских рублей

На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **16 марта 2011 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 02.03.2011 по 14.03.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 48 36.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 30 марта 2011 года проводит 2-й повторный открытый аукцион на 4-м открытом аукционе по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
4.	Самолет Ан-24Б № 99902203, дв. Аи-24 с. 2 № Н4912105, дв. Аи-24 с. 2 № Н4012035, дв. ТГ-16 № АТ945005, 5 402 посадки, 3 КВР-1994 г.	н.п. Мачулищи в/ч 06752	1969	5 118	650 000 000	65 000 000
5.	Вертолет Ми-26 № 34001212099, дв. Д-136 № 2251364001029, дв. Д-136 № 2251362601143, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 612А8В010	н.п. Мачулищи в/ч 06752	1986	590	3 680 000 000	368 000 000
6.	Вертолет Ми-26 № 34001212131, дв. Д-136 № 2251364001063, дв. Д-136 № 2251364001064, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 722А8В017	н.п. Мачулищи в/ч 06752	1987	594	3 870 000 000	387 000 000
7.	Вертолет Ми-26 № 34001212104, дв. Д-136 № 2251364001067, дв. Д-136 № 2251364001068, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 622А8В006	н.п. Мачулищи в/ч 06752	1986	593	3 680 000 000	368 000 000
8.	Вертолет Ми-26 № 34001212018, КАУ-140 № 82110014030, КАУ-140 № 821100140032, КАУ-140 № 821110140041, КАУ-140-01 № 821033010004, дв. ТА-8В № 042А8В058, 1 КВР-1990 г.	н.п. Мачулищи в/ч 06752	1983	1 774	2 270 000 000	227 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00, **30 марта 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **28 марта 2011 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **30 марта 2011 г.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества **до 30 апреля 2011 года.**

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **<u>Без НДС.</u> Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 5» (г. Минск, ул. Широкая, 26)

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 31 марта 2011 г. в 11.00 ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26 (актовый зал). Форма проведения собрания: очная.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об утверждении новой редакции Устава Общества.
2. Об утверждении годового отчета, бухгалтерских балансов, счетов прибыли и убытков Общества и распределении прибыли (в том числе выплата (объявление) дивидендов) и убытков Общества с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
3. Об утверждении направлений использования (распределения) чистой прибыли Общества на 2011 год и 1 квартал 2012 года.
4. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
5. Об определении размера вознаграждений и компенсации расходов членам наблюдательного совета, ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.
6. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
7. Об утверждении порядка получения согласия кандидатов на выдвижение в избираемые органы Общества.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26, отдел правовой и кадровой работы (юрисконсульт) ОАО «ДСТ № 5» по рабочим дням с 22 марта 2011 года по 30 марта 2011 года с 8.00 до 17.00 (понедельник—четверг) и с 8.00 до 15.45 (пятница), тел. для справок (017) 262 86 29.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании: 21.03.2011 г.

Регистрация акционеров (их представителей), прибывших на собрание: 31 марта 2011 года с 09.30 до 10.45 по месту проведения собрания. При себе иметь паспорт, представителю акционера иметь паспорт и доверенность акционера.

УНП 100219908

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ЗАСТРОЙЩИКА от 15.11.2010 г.

Сведения о застройщике:

Белорусско-английское Совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (СЗАО «ЛадаГарант»). СЗАО «ЛадаГарант» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС – Холдинг» ЗАО).

Местонахождение: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 4Н.

Режим работы: рабочие дни – понедельник рабочие часы с 8 ч. 30 мин. по 17 ч.30 мин. обед с 13 ч. 00 мин. до 14 ч. 00 мин., со вторника по пятницу рабочие часы – с 8 ч. 30 мин. по 19 ч. 00 мин.; в субботу рабочие часы с 9 ч. 00 мин. по 15 ч. 00 мин.; выходной день – воскресенье.

Данные о государственной регистрации: зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100934617.

Сведения о проектах жилых домов, введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:

1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 по ул. Грушевская в г. Минске;
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 по ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки;
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 по ул. Щорса;
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 по ул. Щорса 3-я.

Цель проекта – строительство объекта «Многоэтажный жилом дом, не повышенной комфортности, с объектами соцкультбыта и многоуровневая стоянка для автомобилей со встроенно-пристроенными помещениями автоцентра в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса в городе Минске. 1-й этап (1-ый пусковой комплекс).», с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц, путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

Сведения о сроках реализации:

Начало строительства – первое полугодие 2010 г.

Ввод объекта в эксплуатацию – первое полугодие 2012 г.

У Застройщика имеются:

- решения Мингорисполкома о разрешении на строительство № 2565 от 30.10.2008 г.;
- проектно-сметной документации, прошедшей в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» (заключения от 04.12.2007 г. № 2685-5/07, от 14.01.2008 г. № 113-5/08, от 04.08.2010 № 859-15/10), государственную экологическую экспертизу (заключение № 239 от 30.08.2007г., № 72 от 20.07.2010 г.);
- разрешение на производство строительно-монтажных работ от «10» ноября 2010 г. № 2-203Ж-005/10(1).

Местонахождение строящегося объекта: г. Минск, пересечение пр. Дзержинского – пр. Жукова, в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса.

Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства:

По жилому дому:

1-комнатные – 10 шт.,
2-комнатные – 35 шт.,
3-комнатные – 25 шт.

Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **3 960 000** белорусских рублей (**3 775 000** белорусских рублей для нуждающихся в улучшении жилищных условий).

Данные о правах Застройщика на земельный участок: земельный участок предоставлен Застройщику решением Мингорисполкома от 30.10.2008 г. № 2565 площадью 3,7474 га.

Элементы благоустройства: создаются площадки для отдыха, занятия спортом, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

Общее имущество дольщиков – межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию (1-го пускового комплекса) – 1-е полугодие 2012 г.

Сведения о договорах строительного подряда:

Договор подряда с ЗАО «Инсервисстрой» № 2-09 от 28.12.2009 г.

Условия ознакомления с информацией по проекту: по тел.: 8 017 219 78 22, VELCOM 8 029 679 34 24; на сайте **http://www.lada.by/**, либо по адресу: ул. Грушевская, 91, пом. 4Н, каб. 5.

РУП «БЕЛЭЛЕКТРАМАНТАЖНАЛАДКА»: вітаем новыя кантакты і гатовы да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва

Інжынер Надзея ШУМСКАЯ, тэхнікі Павел ПЯТКЕВІЧ і Вольга ПЯТКЕВІЧ працуюць у вытворча-тэхнічным аддзеле.

Кампетэнтнае меркаванне

«Гэта прадпрыемства, якое найбольш дынамічна развіваецца ў апошнія гады»

Першы намеснік генеральнага дырэктара, галоўны інжынер дзяржаўнага вытворчага аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга» Аляксандр Уладзіміравіч СІВАК:

— РУП «Белэлектрамантажналадка» — гэта адно з нямногіх у нас прадпрыемстваў, якое пастаянна прыбаўляе. Прыбаўляе ў сваёй дзейнасці як па ўзроўні работ, што выконваюцца, па іх якасці, так і па захопе ўсё большых і большых сегментаў, у якіх дагэтуль яно не працавала. Гэта вядучае сёння наладачнае прадпрыемства ў частцы выканання работ на падстанцыйным абсталяванні. Па сутнасці, «Белэлектрамантажналадка» зараз з'яўляецца, можна сказаць, адзінай арганізацыяй, якая можа на такім высокім узроўні, як вы самі ўжо паспелі зразумець, выконваць гэтыя няпростыя работы. Адказнасць прадпрыемства за надзейную працу такіх буйных падстанцый, якія яно зрабіла («Калядзічы») і робіць зараз («Міладзіна»), — вельмі высокая. Мы давяраем «Белэлектрамантажналадцы».

У іх ёсць станоўчая дынаміка, яны расцуць па аб'ёмах вытворчасці, колькасці персаналу. Іншымі словамі, у іх уся народнагаспадарчая дзейнасць на пад'ёме. Акрамя таго, як вы таксама ўжо ведаеце, прадпрыемства засвоіла і вытворчасць цэлай гамы неабходнага нам электратэхнічнага абсталявання: яно выпускае ячэйкі на 10 кВ, рэлейную абарону. Яно закрыла нам практычна ўсе патрэбы па лініях 6 (10) кВ. Зараз засвойваюць — у 2012 годзе плануюць зрабіць доследныя ўзоры — выпуск мікрапрацэсарных устройстваў абароны і аўтаматыкі па лініях 110 кВ. Раней мы яго закуплялі, на што выдаткоўвалі дастаткова шмат грошай.

Прадпрыемства засвоіла і выконвае шэраг дастаткова складаных, спецыфічных работ. Ёсць такі ўчастак, які займаецца транспарціроўкай буйнагабарытных грузаў — сілавых трансфарматараў, шунтуючых рэактараў. І зараз у іх павялічваюцца аб'ёмы мантажу па гэтых работах.

Акрамя таго, «Белэлектрамантажналадка» дастаткова актыўна засвойвае рынак Расіі — яно працуе, у прыватнасці, з Масквой, Санкт-Пецярбургам, Калінінградам, на выхадзе таксама кантракт з Цюменню. Безумоўна, нам хацелася б, каб у гэтым кірунку калектыў працаваў яшчэ больш. З улікам адмоўнага сальда гэта для нас адна з самых важных задач. І, маючы такі патэнцыял, яго трэба выкарыстоўваць: мы будзем нацэльваць прадпрыемства, каб яно больш маштабна выходзіла на знешнія рынкі. І не толькі ў Расіі. Патрэба ў такога кшталту работах, якія можа выконваць «Белэлектрамантажналадка», ёсць у Сярэдняй Азіі. Так, гэта няпростыя рынкі, гэта таксама трэба разумець. Думаю, такі рынак пакрысе трэба шукаць у Польшчы.

У прадпрыемства новы малады кіраўнік. Дарэчы, літаральна нядаўна «Белэнерга» ўнесла свае прапановы ў міністэрства адносна падаўжэння з ім кантракта тэрмінам на пяць гадоў. Гэта таксама адзін з сімптомаў таго, што прадпрыемства працуе нармальна і, у тым ліку, чалавек на сваім месцы. Там увогуле падабралася нармальная каманда. Вы ж ведаеце: уся справа — у людзях, у іх падыходах, у іх цікавасці да працы. А яны працуюць адзінай камандай і шмат чаго дзякуючы гэтаму змаглі дасягнуць.

Таму, на мой погляд, РУП «Белэлектрамантажналадка» — адно з прадпрыемстваў нашай галіны, якое найбольш дынамічна развіваецца ў апошнія гады. Многія іншыя прадпрыемствы, арганізацыі дасягнулі пэўных паказчыкаў у сваім развіцці, але такой дынамікі мала ў каго відаць.

У сувязі з праграмай эканоміі энергіі актуальная праграма будаўніцтва міні-ЦЭЦ на альтэрнатыўных відах паліва. У аснашчэнні такога цеплаэлектрацэнтра ўдзельнічалі і спецыялісты РУП «Белэлектрамантажналадка» — пачынаючы з першай Асіповіцкай і заканчваючы Пружанскай. Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў менавіта гэтую станцыю. Калі ўлічыць, што малая энергетыка мае ў краіне вялікую будучыню, дык патэнцыял прадпрыемства дакладна будзе выкарыстоўвацца ўсё больш актыўна. Напрыклад, РУП «Белэлектрамантажналадка» ўнесла свой істотны ўнёсак у рэканструкцыю Мінскай ЦЭЦ-3, якая фінансавалася з дапамогай замежных інвестараў.

Яшчэ адзін з накірункаў дзейнасці прадпрыемства — аўтаматызаваныя сістэмы кіравання тэхналагічнымі працэсамі хімводаачысткі. Да ведама чытачоў: для працы цеплавых электрычных станцый і кацельняў патрэбныя пэўныя параметры вады. Прадпрыемства якраз займаецца аўтаматызацыяй гэтай ачысткі. Адна з такіх паспяхова вырашаных задач датычыла распрацоўкі праекта рэканструкцыі Аршанскай ЦЭЦ.

— Асаблівы інтарэс гэтая распрацоўка ўяўляе ў тым ліку і таму, што асноўнае патрэбнае дарагое абсталяванне ўжо было набыта. Рабіць аўтаматызацыю даводзілася з улікам гэтага, — прыгадвае галоўны інжынер Іван Стралюк.

Трэба сказаць і пра тое, што РУП «Белэлектрамантажналадка» актыўна выходзіць на расійскі рынак з дапамогай адкрытага ў Маскве ўласнага філіяла. Як лічаць на прадпрыемстве, ва ўмовах канкурэнцыі, якая ўзрастае, такая праца з патэнцыяльнымі заказчыкамі ў

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Вопыт і веданне тэхналогій — складовыя поспеху

Тым не менш, нягледзячы на ўсе гэтыя цяжкасці, абумоўленыя асаблівасцямі таго часу, спецыялісты прадпрыемства працягвалі назапашваць вопыт. Напрыклад, яны даволі добра «памацалі» сеткі напружаннем 6 (10) кВ.

— У нас пачалі з'яўляцца ідэі ў тым плане, як папрацаваць над гэтай сеткай, як яе палепшыць. Па першым часе рабіліся захады не на ўзроўні праектаў, а на ўзроўні тэхнічных рашэнняў: уносіліся змяненні, паляпшаліся схемы. На той час на гэтым спецыялізаваліся іншыя прадпрыемствы, але мы ўбачылі, што ёсць праблемы з пастаўкамі абсталявання для сетак 6 (10) кВ, з устройствамі рэлейнай абароны, — прыгадвае дырэктар Сяргей Аляхновіч.

Старэйшы супрацоўнік слесар-зборшчык пятага разраду Уладзімір АЎЧАРЭНКА.

НЕАБХОДНАЯ ЎВОДНАЯ ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ

Паколькі не ўсе маюць адпаведную адукацыю, простай мовай коратка патлумачым, пра што ідзе гаворка, каб далейшы аповед быў цалкам зразумелым.

Каб перадаць электраэнергію на пэўную адлегласць,трэба павялічваць напружанне ў сетцы — каб страты былі меншымі. Тэарэтычна можна было перадаваць яе ў звыклым для спажыўца «фармаце» — 220 В, аднак тады б давялося ўсё навокал літаральна апутаць правадамі. На тэрыторыі СНД выкарыстоўваецца наступная класіфікацыя напружання ў сетках: 220 В; наступны клас — 380 В (або 0,4 кВ); далей — 6 або 10 кВ (або адно або другое — у залежнасці, як лепш перадаваць па сетцы); 35 кВ; 110 кВ; 220 кВ; 330 кВ; 500 кВ (у Беларусі сетак з такім напружаннем няма); 750 кВ (самая магутная лінія, якая зараз ёсць у нашай краіне, яна ідзе ад Смаленскай і Ігналінскай атамных станцый на Старыя Дарогі); 1100 кВ (ёсць у Расійскай Федэрацыі, дзе вялікія адлегласці, адпаведна, павялічваюцца і страты пры перадачы электраэнергіі). Да слова, у еўрапейскіх краінах іншая класіфікацыя.

— Аўтаматыку з нейкімі пэўнымі параметрамі тады выраблялі заводы, на якіх асабліва не задумваліся над тым, што можна нешта змяніць, палепшыць. Скажам, адно з прадпрыемстваў на абсягах СНД выпускала панэлі, які прыходзілі ў такім стане, што іх былі вымушаны даводзіць да розуму непасрэдна на аб'ектах, — працягвае дырэктар. — У гэтым плане мы прайшлі вельмі вялікую школу і сталі задумвацца пра тое, што добра было б, акрамя пусканаладачных работ, заняцца яшчэ і праектнымі работамі, а таксама выпускам вырабаў для патрэб энергетыкі. У гэты ж час нашы спецыялісты, што працавалі па цеплавой частцы (кантрольна-вымяральныя прыборы, цеплавая аўтаматыка вымярэння), таксама пачалі дапамагаць у распрацоўцы схем на станцыях і таксама набылі вопыт для далейшага развіцця ў нас праектнага накірунку па тэме лічыльнікаў. У рамках таго, што ў краіне патрабаваўся ўлік той жа электраэнергіі, цепланосьбітаў, пачаў развівацца накірунак па ўстаноўцы і працы з лічыльнікамі — электрычнай, цеплавой, гарачай вады, пары. У гэтым плане таксама пачалі выпускаць паўнавартасныя праекты, і пакрысе гэты накірунак пачаў развівацца.

Недзе ў 1996-97 гадах на «Белэлектрамантажналадцы» пачалі задумвацца пра замену простых рэле на мікрапрацэсарныя. Тым больш замежныя аналагі на тэрыторыі Беларусі ўжо пачалі з'яўляцца.

НЕАБХОДНАЯ ЎВОДНАЯ ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ

Рэле — гэта прыстасаванне, прыбор для аўтаматычнай камутацыі электрычных ланцугоў па сігнале звонку. Гаворачы спрошчана, простае рэле мае два становішчы — «уключана» і «выключана». Такія адносна недарагія прыстасаванні выкарыстоўваюцца для абароны значна больш каштоўнага абсталявання.

Каб абараніць з дапамогай простых рэле лінію або трансфарматар, трэба было «гарадзіць» лінію ці рад панэляў (іншымі словамі, шафаў з пэўным «начыннем», паслядоўнасцю працы). Замежная тэхніка дазваляла замест, скажам, двух панэляў устанаўліваць адну панэль з мікрапрацэсарнымі прыстасаваннямі.

— Чаму б, ведаючы тэхналогію, а тым больш улічваючы, што ў нас на прадпрыемстве тады ўжо з'явіліся электроншчыкі, не паспрабаваць было стварыць нешта сваё ў гэтым плане? — нібыта зноў перажывае падзеі таго часу Сяргей Мікалаевіч.

Як справіліся з гэтай задачай спецыялісты прадпрыемства? На сёння па частцы выпуску лінейкі (ад самых простых і танных з мінімальным наборам функцый да складаных накіраваных абарон з шырокімі функцыямі і блокамі логікі, якая праграмуецца) мікрапрацэсарных устройстваў абароны і аўтаматыкі, што выпускаюцца РУП «Белэлектрамантажналадка», цалкам закрываюцца патрэбы размеркавальных падстанцый 6 (10) кВ. Гэтыя ўстройствы аб'ядноўваюць у сабе функцыі абароны, аўтаматыкі, сігналізацыі, кантролю, мясцовага і дыстанцыйнага кіравання. Яны паспяхова эксплуатуюцца на ўсіх абласных энергасістэмах Беларусі, а таксама на многіх расійскіх — «Белгарадэнерга», «Бранскэнерга», «Масэнерга», «Ноўгарадэнерга», «Цюменьэнерга» і іншых. Праходзіць зараз і апрабаванне абароны трансфарматараў. Дарэчы, варта заўважыць, што першыя ўзоры токавай абароны, якія былі выраблены ў канцы 1998 года і ўстаноўлены на падстанцыях Пінска, спраўна працуюць дагэтуль. Чым не яскравае пацвярджэнне якасці прадукцыі!

— Мы плануем выйсці да канца 2012 года на выпуск мікрапрацэсарных устройстваў абароны і аўтаматыкі для лініі 110 кВ — яна будзе цалкам зачыненая з дапамогай нашых вырабаў, — падзяліўся планамі дырэктар.

Патрэбы ўнутранага рынку былі цалкам забяспечаны

Як было сказана вышэй, асноўнай мэтай прадпрыемства было забяспечыць беларускі рынак якаснай і недарагой прадукцыяй уласнай распрацоўкі і вытворчасці. Зараз можна смела гаварыць пра тое, што мэта гэтая дасягнута. Колькасць падстанцый з абаронамі РУП «Белэлектрамантажналадка» ў цэлым па краіне не паддаецца ўліку. Сёння прадпрыемства фактычна «пасунула» ўсіх канкурэнтаў у адпаведнай галіне, займаючы больш за 80 працэнтаў рынку. Вялікім плюсам вырабленых абарон з'яўляецца тое, што ўстройствы распрацоўваюцца ў шчыльным супрацоўніцтве са спажыўцом, прымаюцца ўсе прапановы і папраўкі і пры неабходнасці хутка і якасна вырабляюцца неабходныя мадыфікацыі.

— Для таго, каб было прасцей і схемы будаваць, і адаптаваць нашы ж абароны ў частцы выкарыстання іх у энергасістэмах, на заводах, мы паралельна распрацавалі і выпусцілі ячэйку (ці шафу) КРУ 6 (10) кВ. У гэтую ячэйку мы пачалі ўстаўляць нашы абароны. У Беларусі такіх аналагаў больш не выпускаецца, — працягвае Сяргей Мікалаевіч. — Напрыклад, для сельскай мясцовасці мы распрацавалі выключальнікі нагрузкі 6 (10) кВ. Сёлета плануем вырабляць іх з ячэйкай, устаноўленай з сістэмай кіравання і аўтаматызацыі. Гэта робіцца для паляпшэння працы ліній — для тых жа аграгарадкоў, скажам. Распрацоўка прызваная мінімізаваць выдаткі персаналу падчас эксплуатацыі па пошуку і выпраўленні пашкоджанняў.

Пра тое, як выконваліся пастаўленыя перад прадпрыемствам задачы па насычэнні ўнутранага рынку патрэбнымі ўстройствамі, якія маглі б замяніць дарагія замежныя аналагі, нам падрабязна расказаў і начальнік упраўлення перспектыўнага развіцця Сяргей Пятровіч Каралёў. Не будзе перабольшваннем сказаць, што ён — адзін з тых спецыялістаў, якія стаялі ля вытокаў стварэння аўтаматызаваных сістэм кіравання.

— На прадпрыемства я прыйшоў у 1988 годзе, хоць дагэтуль ужо працаваў тут на практыцы падчас вучобы ў інстытуце (пра асаблівасці падрыхтоўкі маладых кадраў мы падрабязна раскажам ніжэй — **рэд.**). А развівалася ўсё вельмі цікава — толькі-толькі пачыналася праца з названымі аўтаматызаванымі сістэмамі кіравання. Можна сказаць, што ў рэальнасці іх яшчэ не было. Аднак было відавочным, што працаваць адвёрткай і пасаціжамі — не вельмі эфектыўна. Трэба было аблягчаць працу работнікаў — наладчыкаў, — прыгадвае Сяргей Пятровіч. — Таму пачалі з таго, што стварылі невялікі ўчастак з трох чалавек, прыцягнулі спецыялістаў з тагачаснага радыётэхнічнага інстытута і пачалі распрацоўваць розныя электронныя вымяральныя прыборы. Дарэчы, сам я — рэлейшчык, аднак ніводнага дня ім не працаваў. Мяне, як выпускніка, адразу накіравалі перавучвацца на праграміста.

Неўзабаве высветлілася, што прыборы аказаліся патрэбнымі не толькі нашым наладчыкам. Яны пачалі добра прадавацца на тэрыторыі СНД. Таму было прынята рашэнне зрабіць не групу пры тагачасным наладачным участку, а самастойную групу з уласнай вытворчасцю.

— Прыйшла эра мікрапрацэсарнай тэхнікі, пачалося пераўзбраенне энергетыкі. Нават у Расіі ў тыя часы былі лічаныя вытворцы, якія займаліся мікрапрацэсарнымі ўстройствамі рэлейнай абароны. Усё астатняе было імпартным і каштавала нятанна. І ў нейкі момант у Міністэрстве энергетыкі даручылі нам выпуск патрэбных прыбораў, — працягвае аповед Сяргей Каралёў. — Паколькі гэта быў перспектыўны накірунак, у 1998 годзе было вырашана перайсці ад доследнай да серыйнай вытворчасці беларускіх мікрапрацэсарных рэлейных устройстваў. І калі некалі мы пачыналі з вырабу 10, 20 устройстваў мікрапрацэсарнай абароны (акрамя, вядома, выпуску вялікага спектра іншых прыбораў для энергетыкі, народнай гаспадаркі), дык па выніках мінулага года іх было выпушчана больш за 3 тысячы штук!

Усе задачы ў рамках дзяржпраграм выконваюцца годна

Да 2000 года ў структуры РУП «Белэлектрамантажналадка» было 12 участкаў. Каб было лягчэй правадзіць работы «пад ключ», было прынята рашэнне на іх базе сфарміраваць чатыры ўпраўленні. Найперш гэта ўпраўленне мантажных работ, якое займаецца мантажом абсталявання, у тым ліку трансфарматараў. Тут варта крыху прыпыніцца і расказаць пра яго больш падрабязна, паколькі дзейнасць гэтага ўпраўлення даволі спецыфічная — на погляд простага чалавека.

У спадчыну ад Масквы прадпрыемства атрымала ўчастак па мантажы трансфарматараў і такелажных работах з імі. Цікава, што перасоўванне трансфарматараў (уявіце сабе, некаторыя з іх могуць важыць 200 тон!) адбываецца з мінімальнай механізацыяй — сіламі і розумам людзей. Да будучага месца ўстаноўкі трансфарматары падвозяць на арандаваным аўтатранспарце ці па чыгунцы, а вось для перасоўвання іх непасрэдна на падрыхтаваную пляцоўку падстанцыі выкарыстоўваюцца спецыяльныя домкраты і штурхачы. Устаноўка адбываецца з далейшай апрацоўкай: вытрымліваюцца параметры ізаляцыі, масла, у прыватнасці, бяруцца яго пробы на якасць, пасля чаго шэф-завод дае дабро на ўключэнне трансфарматараў у сетку.

Было створана і ўпраўленне наладачных і праектных работ, якое займаецца праектаваннем і наладкай. Сярод яго апошніх выкананых аб'ектаў, напрыклад, падстанцыя Брэст-1, Орша-Паўднёвая, Гродна-Паўднёвая, а таксама падстанцыі ў Баранавічах, на Бярозаўскай ГРЭС.

Упраўленне перспектыўнага развіцця займаецца распрацоўкай і выпускам устройстваў абароны, пра якія гаварылася вышэй. А ўпраўленне вытворчасці прадукцыі — гэта вышэйназваныя ўжо ячэйкі, шафы.

Таксама ў 2000 годзе для рэалізацыі ўсіх «даверэных» праграмна-тэхнічным комплексам функцый — вымярэння, кантролю і рэгулявання тэхналагічных параметраў — быў створаны выпрабавальны цэнтр, у склад якога ўвайшлі тры лабараторыі — інфармацыйных вымяральных сістэм, спецыяльных вымярэнняў, а таксама выпрабавальная лабараторыя сродкаў рэлейнай абароны і аўтаматыкі.

Гэтая рэарганізацыя, але найперш калектыў прафесіяналаў, дазволілі РУП «Белэлектрамантажналадка» годна выконваць ускладзеныя задачы ва ўсіх дзяржпраграмах у галіне энергетыкі. Напрыклад, прадпрыемства прымае ўдзел у рашэнні праграмы адраджэння вёскі. Спачатку яго спецыялісты прымалі ўдзел у будаўніцтве падстанцыі 35 кВ для суперсучаснай птушкафабрыкі ў Брэсцкай вобласці, потым выконвалі аналагічную працу ў Крупскім раёне.

Традыцыйна з 1995 года РУП «Белэлектрамантажналадка» працуе з Жабінкаўскім цукровым заводам, дзе правяло поўную рэканструкцыю сетак 0,4 кВ. Была праведзена і рэканструкцыя Слуцкага цукровага завода.

Вядучы эканаміст планава-эканамічнага аддзела Наталля НІШТ і эканаміст Ілья ЛІЗУНОЎ.



Электрамантажныя работы ў рэлейнай шафе ячэйкі 6-10 кВ праводзіць электрамантажнік Павел ЗАРА.

Зрабіць нашы гарады яшчэ прыгажэйшымі

Яшчэ пра адну працу прадпрыемства варта расказаць асобна. Не тое, каб яна была адной з галоўных для РУП «Белэлектрамантажналадка», але што стала самай відовішчнай — для мінчан і гасцей сталіцы найперш — дакладна. А для самога прадпрыемства (ды і, натуральна, для Мінска) — своеасаблівай візітоўкай. Гаворка ідзе пра сумесны праект з УП «Гарсвятло»: цэнтралізаванае і лакальнае кіраванне электрычнымі сеткамі вонкавага, ілюмінацыйнага, рэкламнага асвятлення, а таксама архітэктурнай падсветкі ў Мінску. Як «зайгралі» бу-

У прасторны прыгожы будынак хутка пераедуць службы галоўнага офіса РУП «Белэлектрамантажналадка».



Выпрабаванне тэрмінала рэлейнай абароны праводзяць інжынеры Дзмітрый ЛАГАЦКІ, МІХАІЛ Ломан, Алег ГАГАЛІНСКІ.

На мантажным участку доследнай вытворчасці. Першы справа — начальнік участка Ігар ЧАРНЕНКА.

Намеснік дырэктара па маркецінгу Алег ГРЫШЧУК і начальнік аддзела маркецінгу і забеспячэння Сяргей АСТАПЧЭНЯ.

Стандарты якасці і ліцэнзаванне відаў дзейнасці

Клопат пра высокую якасць прадукцыі і работ, што выконваюцца, — прыярытэт у дзейнасці РУП «Белэлектрамантажналадка». Тут распрацаваная і прайшла ўкараненне сістэма менеджменту якасці, якая адпавядае патрабаванням СТБ ІСО 9001-2001, і сістэма кіравання аховай працы, якая адпавядае патрабаванням OHSAS 18001:2008. На абедзве сістэмы атрыманы Сярэбраны Сертыфікат. Сертыфікаты сапраўдныя для наступных відаў дзейнасці: распрацоўка праектнай дакументацыі, вытворчасці электрамантажных і наладачных работ.

РУП «Белэлектрамантажналадка» мае ліцэнзіі на ўсе віды вытворчай дзейнасці, ажыццяўленне якіх патрабуе спецыяльных дазволаў упаўнаважаных органаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі:

Праматамнагляду МНС Рэспублікі Беларусь — на права ажыццяўлення дзейнасці ў галіне прамысловай бяспекі;

Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь — на права ажыццяўлення праектных, будаўніча-мантажных і спецыяльных работ;

Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь — на права ажыццяўлення дзейнасці, звязанай з прыцягненнем у Рэспубліку Беларусь замежнай рабочай сілы і працаўладкаваннем грамадзян Рэспублікі Беларусь за мяжой;

Федэральнага агенцтва па будаўніцтве і жыллёва-камунальнай гаспадарцы Расійскай Федэрацыі — на ажыццяўленне праектных, будаўніча-мантажных і спецыяльных работ;

Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь — на права ажыццяўлення міжнародных і ўнутрырэспубліканскіх перавозак грузаў аўтамабільным транспартам, ажыццяўлення транспартна-экспедыцыйнай дзейнасці;

РУП «Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі» — на права рамонту сродкаў вымярэнняў.

РУП «Белэлектрамантажналадка» выконвае поўны аб'ём работ на электрастанцыях і падстанцыях: праект, пастаўка абсталявання, мантаж, наладка і выпрабаванні, сэрвіснае абслугоўванне ў аб'ёме электрычнай часткі, АСУ ТП, КІПіА. Вырабляе камплектныя размеркавальныя ўстройствы КРУ 6 (10) кВ, устройствы размеркавання і кіравання на напружанне да 1000В (шафы, панэлі, пульты), а таксама выпускае спецыялізаваныя прыборы, устройствы абароны і аўтаматыкі, якія выкарыстоўваюцца ў энергетыцы (МР (МТЗ-610), рэле часу, кантролеры). На прадпрыемстве акрэдытаваная лабараторыя інфармацыйна-вымяральных сістэм з правам правядзення метралагічнай атэстацыі, каліброўкі вымяральных каналаў, інфармацыйна-вымяральных сістэм па СТБІСО МЭК 17025-2001.

Галоўны бухгалтар Галіна КОХАН.

Аляхновіч, намеснік дырэктара па будаўнічых работах Генадзь Усеваладавіч Клімовіч, начальнік упраўлення перспектыўнага развіцця Сяргей Пятровіч Каралёў, кіраўнік праекта ўпраўлення наладачных работ Георгій Фёдаравіч Раманюк, начальнік участка праекта ўпраўлення наладачных работ Яўген Іванавіч Скалабан.

Ганаровым званнем «Заслужаны энергетык СНД» ушанаваны галоўны спецыяліст прадпрыемства Міхаіл Рыгоравіч Лебедзеў.

Свой прафесійны і жыццёвы вопыт перадаюць больш маладым калегам ветэраны прадпрыемства, якія аддалі яму не адно дзесяцігоддзе. Гэта электрамантажнік Уладзімір Мікалаевіч Неважай, які мае 46 гадоў працоўнага стажу. Галоўны спецыяліст Міхаіл Рыгоравіч Лебедзеў адпрацаваў 41 год, а інжынер 1 катэгорыі Аляксандр Людвігавіч Галяшэвіч —39 гадоў. Па 36 гадоў працоўнага стажу маюць начальнік участка Барыс Мікалаевіч Міцкевіч і прараб Уладзімір Сцяпанавіч Сергіенка, 35 гадоў — інжынер 1 катэгорыі Канстанцін Уладзіміравіч Дзеравяшкін.

Інжынеры 1 катэгорыі Міхаіл Паўлавіч Мардасаў і Пётр Іванавіч Мядзведзеў маюць у сваім працоўным «актыве» па 34 гады стажу, а трэба сказаць асобна. Гэтай працай на «Белэлектрамантажналадцы» займаюцца даўно, шчыльна і мэтанакіравана. Яе асаблівасць у тым, што прадпрыемства плённа супрацоўнічае з базавымі пастаўшчыкамі спецыялістаў — БНТУ, БДУІР, у пэўнай ступені з БАТУ, БДУ, энергетычным каледжам.

— Мы пачынаем працаваць са студэнтамі з другога-трэцяга курсаў, калі ў іх ужо пайшла спецыфіка спецыяльнасці і ёсць кантакт з выкладчыкамі. Апошнія бачаць, хто дакладна будзе займацца энергетыкай, і рэкамендуюць іх нам. Спачатку студэнты з'яўляюцца на нашым прадпрыемстве ў якасці практыкантаў, аднак, калі падчас практыкі яны паказваюць сябе, зарэкамендоўваюць працай па нейкім накірунку, надалей гэты накірунак мы імкнёмся развіваць і замацоўваць. Нават можам такога студэнта ўзяць на палову стаўкі, — дзеліцца сакрэтамі падрыхтоўкі спецыялістаў Сяргей Аляхновіч.

— Магу сказаць, што каб з маладога спецыяліста, які толькі скончыў інстытут, рэальна выйшаў інжынер, што можа выконваць працу на належным узроўні, патрэбна гады два. Таму, калі да нас прыходзяць студэнты другога-трэцяга курса і праходзяць падчас вучобы паралельна яшчэ і пэўную стажыроўку на прадпрыемстве, яны быццам бы скарачаюць гэты час. Фактычна пасля заканчэння навучальнай установы яны прыходзяць да нас ужо гатовымі спецыялістамі, якім можна даверыць сур'ёзную працу, — дадае галоўны інжынер Іван Стралюк.

— Плюс такога падыходу ў чым? — працягвае дырэктар. — Я размаўляў з выкладчыкамі з выпускных камісій навучальных установ. Яны гавораць, што калі такі студэнт абараняецца, адразу відаць, што гаворыць ён з веданнем справы, насамрэч ведае, пра што тэма, паколькі на вытворчасці займаўся ёй на практыцы. Таму, калі студэнты вызначаюцца з тэмай сваёй практыкі, мы імкнёмся, каб яна па максімуме была завязана на тое, што ён выконвае ў нас. Выходзіць, малады чалавек і вучыцца, набывае патрэбныя веды, а калі прыходзіць пасля заканчэння навучальнай установы да нас, мы ўжо ведаем яго кваліфікацыю, яго патэнцыял. Вядома, бывае і так, што чалавек працаваў па адной спецыфіцы, а потым зразумеў, што гэта не зусім яго, хоча займацца іншым. Гэта не азначае, што ён дрэнны спецыяліст. Проста аднаму прасцей усё зрабіць так, як запісана ў праекце, і ўсё — ён не адказвае за тэхнічныя рашэнні. А ў нашай працы ёсць свая спецыфіка падыходаў, прыняцця рашэнняў, адказнасці...

— Яшчэ падчас практыкі — за два гады — можна вызначыць, хто будзе кіраўніком, а хто чыстым «тэхмандзіроўка — не праблема. Яшчэ, напрыклад, можна сказаць, што ў выдатнікаў вучобы характар, як правіла, некалькі замкнёны, яны не такія камунікабельныя. Ім больш падыходзіць праца ў праектных, канструктарскіх падраздзяленнях.

...Калі мы знаёміліся з прадпрыемствам, яго спецыялістамі, на адным з паверхаў адміністрацыйнага будынка заўважылі купку маладых людзей — студэнтаў. Хто ведае, магчыма, сярод іх былі будучыя прафесіяналы сваёй справы, тыя, каму некалі выпадзе гонар падоўжыць славу не толькі самога прадпрыемства, але і ўсёй энергетыкі ўвогуле?

З УСПАМІНАЎ ВЕТЭРАНА

«Што помніцца? Праца, праца і зноў жа праца!»

Міхаіл Рыгоравіч Лебедзеў — адзін са старэйшых работнікаў прадпрыемства. Пасля службы на флоце і заканчэння ў 1969 годзе Маскоўскага энергетычнага ўніверсітэта распачаў сваю працоўную дзейнасць. Узначальваў прадпрыемства з 1974 па 2006 год. Выходзіць, цэлыя 22 гады! «22 гады і адзін квартал», жартам удакладняе Міхаіл Рыгоравіч. Вядома ж, мы не маглі не папрасіць шаноўнага суразмоўцу прыгадаць нешта з тых далёкіх падзей. Найперш, што асабіста запомнілася Міхаілу Рыгоравічу: як тады жылі, працавалі спецыялісты, ці адрозніваецца тагачасная моладзь (а для многіх цяперашніх работнікаў «Белэлектрамантажналадкі» Лебедзеў быў і дырэктарам, і настаўнікам) ад цяперашняй.

— Што прыгадваецца... Трэба было працаваць, працаваць... Усю моладзь, якая да нас прыходзіла, мы заўсёды накіроўвалі ў камандзіроўкі. І ўсе да гэтага нармальна ставіліся. Памятаю, як такім чынам цяперашні галоўны інжынер прадпрыемства Іван Часлававіч адразу атрымаў накіраванне на Браншчыну, якая на той час уваходзіла ў зону нашай працы. Гэтак жа, як і цяперашні дырэктар Сяргей Мікалаевіч. Памятаю, прыйшоў да нас пасля інстытута па размеркаванні — перспектыўны малады спецыяліст з жаданнем працаваць — і практычна з першага дня ад'ездзіў па камандзіроўках. Як па ўсёй Беларусі, так і па шэрагу аб'ектаў Расіі, Украіны, Грузіі, Літвы.

Умовы, прыгадвае Міхаіл Рыгоравіч, былі часам розныя, але ў цэлым нармальныя: жылі ў камандзіроўках, як правіла, у гасцініцах, на ўсіх сеткавых аб'ектах, ва ўсіх механізаваных калонах былі і свае сталовыя, і свае павары. На месцы, на аб'ектах, і харчаваліся. Гатавалі добра, цэны былі прымальнымі. Ну, а што было з жыллём?

— Калі нашы спецыялісты ўдзельнічалі ў мантажы і наладцы, напрыклад, Курскай і Смаленскай атамных станцый, яны размяркоўваліся туды з жонкамі, дзецьмі. На месцы атрымлівалі жыллё, працавалі, гадавалі дзетак, — расказвае Міхаіл Рыгоравіч. — Паралельна ў Мінску я выйшаў на ўпраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама. Давалі ліміты на жыллё, скажам, мы атрымлівалі фонды на дзве-тры кватэры. Гэта ўжо як атрымлівалася «выбіць». Далей з гэтым рашэннем я ехаў у Маскву да нашага кіраўніцтва. Яно выходзіла на аб'яднанне, і грошы «выбіваліся» з Міністэрства энергетыкі СССР. Іх пераводзілі, і тут, у Мінску, адразу ж выдзялялася жыллё. Прыкладна ў перыяд з 1984-85 па 1991 год такім чынам наша прадпрыемства атрымала для сваіх работнікаў больш за 50 кватэр у сталіцы. Чаргі на паляпшэнне жыллёвых умоў у нас, лічыце, і не было ў той час.

Да цяперашняй моладзі Міхаіл Рыгоравіч ставіцца добра, кажа: «Хто хоча працаваць, той заўсёды знойдзе такую магчымасць». Так, дарэчы, было і раней.

А ўвогуле трэба сказаць, што Міхаіл Рыгоравіч аказаўся настолькі сціплым чалавекам, што куды больш інфармацыі, добрых слоў (пра яго асабіста) мы пачулі не столькі ад самога, колькі ад колішніх падначаленых — тых, каго ён некалі прымаў на працу. Як і пра тое, што Міхаіл Рыгоравіч мае практычна ўсе галіновыя ўзнагароды за сваю працяглую плённую працу ў энергетыцы — як беларускія, так і расійскія.

Праграма імпартазамяшчэння дазваляе істотна эканоміць

Начальнік упраўлення перспектыўнага развіцця Сяргей Каралёў настаяў на тым, каб мы абавязкова пагутарылі з яго намеснікам — Уладзімірам Аляксеевічам Нячаевым. Натуральна, не таму, што ён намеснік і людзей звязвае сяброўства. «Ён — роданачальнік усіх распрацовак!» Хіба ж пасля такога аргумента Сяргея Пятровіча мы маглі адмовіцца ад знаёмства?

...Як высветлілася, лёс Уладзіміра Аляксеевіча ў многім тыповы: і для свайго часу, і ў параўнанні з жыццём многіх калег. Пачаць хоць бы з таго, што суразмоўца — чаргавы прадстаўнік працоўнай дынастыі («мог бы выбраць іншы жыццёвы шлях, але пайшоў гэтым»). Пасля заканчэння ў 1986 годзе Томскага інстытута аўтаматызаваных сістэм кіравання і радыёэлектронікі яшчэ год працаваў там на кафедры («чакаў, пакуль жонка — Алена Уладзіміраўна — скончыць вучобу па спецыяльнасці інжынера-канструктара, тэхнолага радыёэлектроннай апаратуры»). Потым яны разам пераехалі ў Беларусь. Зноў тыповы момант, які аб'яднаў лёсы многіх — тут якраз пачыналася будаўніцтва атам-

Начальнік упраўлення перспектыўнага развіцця Сяргей КАРАЛЁЎ.

най станцыі. Бацька тады працаваў ў дырэкцыі аб'екта, што будаваўся. Кажа, што было жаданне мець перспектыўную працу, звязаную з радыёэлектронікай. Забягаючы наперад, заўважым, што пасля сам Уладзімір Аляксеевіч стаў заснавальнікам працоўнай дынастыі.

Але ж разам з тыповым прысутнічае і многае з таго, што робіць жыццё нашага суразмоўцы адметным, не падобным на іншыя лёсы.

— Тады наш колішні дырэктар Міхаіл Рыгоравіч Лебедзеў актыўна шукаў кадры для новага ўчастка, скіраванага на працу па выкарыстанні радыёэлектронікі на аб'ектах энергетыкі. Прыкладна ў той жа час стала ўкараняцца сістэма дыспетчарскага кантролю. І нашы наладчыкі сутыкнуліся з тым, што не хапае сэрвіснай тэхнікі: вымяральных прыбораў. А тыя, што былі, мелі нізкую дакладнасць і былі нязручнымі ў працы. Адным з першых распрацаваных нашай групай вырабаў быў электронны вольтамперфазометр. Мы першыя запусцілі яго ў серыю ў 1991 годзе. На той час такія электронныя прыборы не выраблялі нідзе на тэрыторыі СССР. І яны пачалі актыўна прадавацца, — прыгадвае Уладзімір Аляксеевіч.

Потым быў генератар для наладкі ВЧ-апаратуры (камплект: генератар і ўзмацніцель магутнасці), першыя доследныя ўзоры якога былі выраблены ў 1992 годзе. З таго ж года пайшлі і кантролеры рознага прызначэння для аўтаматызацыі. Ужо з 1998 года распачалася серыйная вытворчасць мікрапрацэсарных абаронаў. Усе гэтыя тэмы сёння, акрамя генератараў, шырока развіваюцца.

— Зараз мы засвойваем яшчэ адзін накірунак, новы для сябе: высокачастотная апаратура для перадачы каманд рэлейнай абароны і проціаварыйнай аўтаматыкі. У Беларусі такі клас апаратуры не вырабляецца, — працягвае суразмоўца. — Установачная партыя зараз праходзіць доследна-прамысловую эксплуатацыю на аб'ектах «Гомельэнерга» і «Магілёўэнерга». Распрацоўка мае добрую перспектыву, паколькі такога плана ўстройстваў — на старой элементнай базе, функцыянальна і маральна састарэлых — ёсць шмат. Гаворка ідзе калі не пра тысячы, дык пра сотні адзінак. А апаратура вельмі дарагая; сёння яна патрабуе пашырэння сваіх функцыянальных магчымасцяў. Сеткі беларускай энергасістэмы зараз рэканструююцца з улікам праекта будаўніцтва атамнай станцыі. Дастаткова шмат апаратуры не давядзецца набываць за мяжой, паколькі гэта абсталяванне распрацоўваецца ў рамках галіновай праграмы імпартазамяшчэння. Калі гаварыць адносна перспектыў па аб'ёмах, сёння гэта каля 10-12 камплектаў у год. Замежны аналаг каштуе ад 30 тысяч еўра і больш. Нашы ж вырабы каштуюць утрая менш.

...Група з трох чалавек за прайшоўшы час істотна павялічылася: сёння ў канструктарскім бюро ўпраўлення перспектыўнага развіцця працуе каля 25 чалавек, прыкладна столькі ж — на вытворчасці. Таму зараз самай вялікай праблемай і Сяргей Каралёў, і Уладзімір Нячаеў назвалі праблему з павелічэннем вытворчых магутнасцяў. У новым будынку, куды неўзабаве пакрысе збіраецца пераязджаць прадпрыемства, упраўленню выдзеляць цэлы паверх. «Але гэтага мала, гэта вырашэнне праблемы толькі з распрацоўшчыкамі, якім хопіць месца. Для тых жа, што працуе на вытворчасці, патрэбна будаўніцтва новага цэха».

Дасціпны жарт сур'ёзнай працы не перашкода

Міхаіл Паўлавіч Мардасаў — адзін з ветэранаў прадпрыемства. Інжынер 1 катэгорыі па наладцы і выпрабаваннях, зараз ён узначальвае брыгаду інжынераў-наладчыкаў з шасці чалавек. Апошнім часам брыгада працуе на мінскай ЦЭЦ-2, куды мы і наведаліся ў суправаджэнні нашага нязменнага своеасаблівага гіда (за што яму асобнае ад нас шчырае дзякуй!) — галоўнага інжынера прадпрыемства Івана Стралюка.

Патрапіць на тэрыторыю ЦЭЦ не так і проста. Але загадзя пададзеныя спісы, праходжанне інструктажу па тэхніцы бяспецы, атрыманне разавых пропускаў робяць сваю справу — мы мінаем прахадную. Размова, па сутнасці, яшчэ не распачалася, аднак нават на тым, як нас сустракае і суправаджае па кабінетах адміністрацыйнага будынка, а потым і па тэрыторыі Міхаіл Паўлавіч, відаць: ён чалавек спакойны, разважлівы і добразычлівы. Нешматслоўны, але з пачуццём гумару, які цэніць дасціпны жарт і сам да месца можа сказаць трапнае слоўца.

— А ў нас уся брыгада вясёлая, — адгукаецца ён на заўвагу пра тое. — А як жа інакш: мы ж разам і працуем, і жывём — асабліва калі прыгадаць нашы камандзіроўкі.

Што праўда, тое праўда. Вядома, і марознае сонечнае надвор'е сказваецца, уздымае настрой, але добра адчуваецца, што такая атмасфера тут не толькі з гэтай прычыны. Хто працаваў у моладзевым калектыве, дзе пануюць не толькі прафесіяналізм і працоўны азарт, але і ўзаемападтрымка сапраўдных аднадумцаў, падмацаваная сяброўскім жартам, зразумее, пра што гаворка. Калі, безумоўна, пашчасціла ў жыцці працаваць менавіта ў такім калектыве.

А між тым брыгада выконвае дастаткова сур'ёзную працу: займаецца наладкай рэлейнай абароны і аўтаматыкі далучэння — адкрытых размеркавальных устройстваў (АРУ 110 кВ). А перад гэтым займалася наладкай парагазавай установкі на ЦЭЦ-3. Гэтая ўстаноўка — апошняе слова ў энергетыцы ў плане эканоміі паліва, бо яе каэфіцыент карыснага дзеяння складае больш за 50 працэнтаў. Для выпрацоўкі адной кілават-гадзіны ёй патрэбна 170 грамаў умоўнага паліва, у той час як у іншых выпадках — 260-280 грамаў!

— Усе хлопцы — добрыя спецыялісты, з камп'ютарнай тэхнікай літаральна на «ты». Магчыма, толькі часам жыццёвага вопыту нестае, — хваліць сваіх падначаленых Міхаіл Паўлавіч.

А што да вопыту, дык тут, думаецца, сам кіраўнік — калі што — і запоўніць гэты прабел. Міхаіл Мардасаў скончыў інстытут у 1976 годзе і з таго часу на якіх аб'ектах энергетыкі толькі ні працаваў! І на Смаленскай ГРЭС, а потым і Смаленскай АЭС, на запланаванай Мінскай АЭС, якая потым стала ЦЭЦ-5, у Калінінградскай вобласці, у Разанскай... Дзе толькі яшчэ ні пабываў падчас шматлікіх камандзіровак! Аднак Міхаіл Паўлавіч да ўсяго яшчэ аказаўся і чалавекам надзвычай сціплым, таму, нягледзячы на просьбы распавесці больш падрабязна пра той свой вопыт, толькі адмахваўся з усмешкай. Калі ж прыгадаць некаторыя з апошніх аб'ектаў на тэрыторыі краіны, дзе даводзілася працаваць нашаму суразмоўцу, варта, напрыклад, назваць Гомельскую ЦЭЦ-2, Асіповіцкую міні-ЦЭЦ. Да канца гэтага года і сам Міхаіл Мардасаў, і яго брыгада будуць завяршаць наладку электраабсталявання на ЦЭЦ-2.

Віктар ПАЗНЯКОЎ, Сяргей СТАРЫНАЎ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Намеснік начальніка аддзела маркетынгу і забеспячэння Леанід ЕЎТУХ (другі злева) з інжынерамі Наталляй БЯСЕДАЙ, Аляксандрам ЕРМАЛАЕВЫМ, Андрэем БЕЛАВУСАВЫМ, Настассяй ЧАЎСАВАЙ, Наталляй КІСЯЛЁВАЙ.

дынкі, збудаванні праз спалучэнне святла рознага колеру, ценяў, якую непаўторную прыгажосць надалі вулічныя ліхтары ў рэтра-стылі, як непазнавальна змянілася аблічча горада ўвогуле! Устаноўкай свяцільняў, дызайнерскай працай (што, дзе, у якія дні ўключаць) займалася «Гарсвятло», а «Белэлектрамантажналадка» — аўтаматызаванай сістэмай кіравання асвятленнем горада.

Хто з мінчан або гасцей сталіцы не звяртаў увагі ў вячэрні час, напрыклад, на прыгожа падсвечаную «браму горада» — два вядомыя шматпавярховыя дамы насупраць чыгуначнага вакзала? Ці Нацыянальны аэрапорт «Мінск», Мінскую кальцавую дарогу — усе аб'екты нават цяжка пералічыць, паколькі архітэктурная падсветка дамою з'явілася ўжо ва ўсіх раёнах горада. Як толькі дабудоўваецца новы мікрараён, следам туды ж прыходзіць і гарадская ілюмінацыя.

— Усім асвятленнем сталіцы можна кіраваць з аднаго дыспетчарскага пункта, які знаходзіцца па вуліцы Карла Маркса. Там устаноўлены пульт, які паказвае, дзе гарыць святло, дзе, магчыма, узнікла якая няспраўнасць. «Разынка» тут у тым, што падсветка можа працаваць аўтаномна. Гэта значыць, што і дыспетчар можа кіраваць, але калі што здарылася з каналам сувязі, дык на трансфарматарнай падстанцыі, якая ўключае гэты канкрэтны ўчастак, стаіць наша ўстройства, якое запраграмавана па пэўным алгарытме. Напрыклад, увечары лінія павінна ўключыцца без умяшання дыспетчара ў такі час, а раніцай выключыцца — у такі, — сціпла, але не без гонару за калектыў, які на «выдатна» выканаў пастаўленую задачу, гаворыць Сяргей Мікалаевіч.

Тэхнічныя сродкі (шафы вонкавага асвятлення) разлічаны на працу ў шырокім дыяпазоне тэмператур — ад мінус 40 да плюс 70 градусаў, прычым ва ўмовах павышанай вільготнасці і запыленасці. Канструкцыя і сістэма самадыягностыкі тэхнічных сродкаў дазваляюць скараціць да мінімуму час адшукання няспраўнасцяў і правядзення рамонтных работ.

Дарэчы, дзякуючы напрацоўкам прадпрыемства такую прыгажосць у выглядзе архітэктурнай падсветкі зараз маюць не толькі жыхары сталіцы. Такую ж сістэму асвятлення «Белэлектрамантажналадка» зрабіла ў Лідзе к «Дажынкам», яна ёсць у Магілёве, на падыходзе — Віцебск. Цікаўнасць да распрацовак айчынных спецыялістаў праяўляюць і расійскія, украінскія калегі.

Калектыў — галоўная каштоўнасць прадпрыемства

Сёння на прадпрыемстве працуюць 608 чалавек. Аднак, як заўважае дырэктар Сяргей Аляхновіч, гэта зусім не азначае, што ўсе яны адначасова месцяцца ў чатырохпавярховым адміністрацыйным будынку на вуліцы Рэвалюцыйнай. Падраздзяленні «Белэлектрамантажналадкі» «раскіданыя» па пяці пляцоўках. Але і з гэтага не вынікае, што ўвесь штат знаходзіцца менавіта там. Спецыфіка працы прадпрыемства — камандзіроўкі, большасць спецыялістаў, як правіла, на выездзе.

Камандзіроўкі звычайна выпісваюцца ў сярэднім на месяц, максімум часам складаюць 40 дзён.

— Звычайна я адразу кажу людзям, што прыходзяць уладкоўвацца да нас, што тут, у адміністрацыйным будынку, грошай няма. Яны на выездзе, па ўсёй Беларусі, трэба ехаць і зарабляць іх, — дапаўняе словы кіраўніка галоўны інжынер Іван Стралюк.

Дарэчы, ездзяць у камандзіроўкі і спецыялісты-жанчыны. Усяго на прадпрыемстве на розных пасадах працуе 91 прадстаўніца прыгожага полу. А ўвогуле ўвесь калектыў — дастаткова малады: амаль 41 працэнт работнікаў складаюць людзі ва ўзросце ад 25 да 40 гадоў. Вышэйшую адукацыю мае 331 спецыяліст, сярэднюю спецыяльную — 56, прафесійна-тэхнічную — 97. Як бачна, даволі ўдала спалучаюцца і маладосць, і высокі ўзровень прафесійных ведаў. Прычым пра гэта можна гаварыць не толькі на ўзроўні самога калектыву, але і асобных сем'яў — дынастый. Ніхто з бацькоў ніколі не пажадае сваім родным, сваім дзецям горшай долі, і калі ідуць яны следам за старэйшым пакаленнем працаваць на тое ж прадпрыемства, значыць, гэта таксама гаворыць і пра мікраклімат у калектыве, і пра перспектывы найперш для маладых людзей.

На «Белэлектрамантажналадцы» шчыруе не адна працоўная дынастыя. Гэта Нішты — інжынер па наладцы і выпрабаваннях 2 катэгорыі Сяргей Пятровіч і вядучы эканаміст Наталля Пятроўна; Краеўскія — інжынеры па наладцы і выпрабаваннях 1 катэгорыі Аляксандр Васільевіч і Юрый Аляксандравіч; Ласі — вядучы інжынер Мікалай Андрэевіч, інжынер па падрыхтоўцы вытворчасці Андрэй Мікалаевіч і інжынер па наладцы і выпрабаваннях Юрый Мікалаевіч; Трэмбіцкія — прараб Міхаіл Андрэевіч і інжынер па наладцы і выпрабаваннях Андрэй Міхайлавіч; Нячаевы — намеснік начальніка ўпраўлення перспектыўнага развіцця Уладзімір Аляксеевіч, яго жонка інжынер 1 катэгорыі Алена Уладзіміраўна, электрамантажнік Аляксей Уладзіміравіч, слесар-зборшчык 4 разраду Канстанцін Уладзіміравіч; Бабровы — тэхнік Любоў Уладзіміраўна, інжынер-праграміст 1 катэгорыі Алена Андрэеўна, інжынер-канструктар 2 катэгорыі Андрэй Андрэевіч; Галяшэвічы — інжынер 1 катэгорыі Аляксандр Людвігавіч, інжынер-праграміст Віталій Аляксандравіч; Бяспанскія — бухгалтар Ніна Аркадзьеўна, эканаміст Алена Міхайлаўна, майстар Сяргей Васільевіч.

Не менш на прадпрыемстве ганарацца і работнікамі, якія за сваю самаадданую працу ў электраэнергетычнай галіне, высокі прафесіяналізм узнагароджваліся на высокім узроўні. Так, медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны электрамантажнік па размеркавальных устройствах і другасных сетках 6 разраду ўпраўлення мантажных работ Уладзімір Мікалаевіч Неважай і інжынер па наладцы і выпрабаваннях упраўлення наладачных работ Аляксандр Цімафеевіч Лупачоў.

Знакам «Почётный энергетик Белоруской энергосистемы» ўзнагароджаныя: вядучы інжынер па наладцы і выпрабаваннях упраўлення наладачных работ электратэхнічнага аддзела Анатоль Адамавіч Жукоўскі, інжынер па наладцы і выпрабаваннях 1 катэгорыі ўпраўлення наладачных работ электратэхнічнага аддзела Аляксандр Васільевіч Краеўскі, галоўны спецыяліст прадпрыемства Міхаіл Рыгоравіч Лебедзеў, начальнік участка цеплавых аўтаматычных вымярэнняў упраўлення наладачных работ Барыс Мікалаевіч Міцкевіч, электрамантажнік па размеркавальных устройствах і другасных сетках 6 разраду ўпраўлення мантажных работ Уладзімір Мікалаевіч Неважай, вядучы інжынер па наладцы і выпрабаваннях упраўлення наладачных работ электратэхнічнага аддзела Генадзь Вячаслававіч Пякарскі, начальнік цэнтра рэлейнай абароны аўтаматыкі ўпраўлення наладачных работ Мікалай Іванавіч Сцефанкоў.

Ганаровым званнем «Ганаровы работнік Беларускай энергасістэмы» ўшанаваныя: дырэктар прадпрыемства Сяргей Мікалаевіч Міцкевіч, інжынер 1 катэгорыі Уладзімір Андрэевіч Абыдзенаў і Аляксандр Васільевіч Краеўскі — па 33 гады. Па 32 гады аддалі любімай справе і калектыву паплечнікаў вядучы інжынер Мікалай Андрэевіч Лось, прараб Міхаіл Андрэевіч Трэмбіцкі, вядучы інжынер Віктар Канстанцінавіч Далганаў, інжынер 1 катэгорыі Іван Уладзіміравіч Шчатко, вядучы інжынер Уладзімір Георгіевіч Красоўскі.

Унікальная аперацыя па перавозцы магутнага аўтатрансфарматара на ПС «Мірадзіна».



Прараб Аляксей КАВАЛЮК, начальнік упраўлення наладачных работ Віктар ГУСАЧОК, начальнік цэнтра рэлейнай абароны аўтаматыкі Мікалай СЦЕФАНКОЎ, начальнік участка цеплавой аўтаматыкі і вымярэнняў Барыс МІЦКЕВІЧ.

Начальнік участка Яўген Іванавіч Скалабан, інжынер 1 катэгорыі Сяргей Іванавіч Страшко адпрацавалі па 31 годзе, начальнік упраўлення Віктар Іванавіч Зубрыцкі — 29 гадоў.

Маладыя кадры рыхтуюць з другога-трэцяга курсаў ВНУ

Пра вопыт па падрыхтоўцы і выхаванні маладых спецыялістаў для патрэб прадпрыемства, падаецца, трэба сказаць асобна. Гэтай працай на «Белэлектрамантажналадцы» займаюцца даўно, шчыльна і мэтанакіравана. Яе асаблівасць у тым, што прадпрыемства плённа супрацоўнічае з базавымі пастаўшчыкамі спецыялістаў — БНТУ, БДУІР, у пэўнай ступені з БАТУ, БДУ, энергетычным каледжам.

— Мы пачынаем працаваць са студэнтамі з другога-трэцяга курсаў, калі ў іх ужо пайшла спецыфіка спецыяльнасці і ёсць кантакт з выкладчыкамі. Апошнія бачаць, хто дакладна будзе займацца энергетыкай, і рэкамендуюць іх нам. Спачатку студэнты з'яўляюцца на нашым прадпрыемстве ў якасці практыкантаў, аднак, калі падчас практыкі яны паказваюць сябе, зарэкамендоўваюць працай па нейкім накірунку, надалей гэты накірунак мы імкнёмся развіваць і замацоўваць. Нават можам такога студэнта ўзяць на палову стаўкі, — дзеліцца сакрэтамі падрыхтоўкі спецыялістаў Сяргей Аляхновіч.

— Магу сказаць, што каб з маладога спецыяліста, які толькі скончыў інстытут, рэальна выйшаў інжынер, што можа выконваць працу на належным узроўні, патрэбна гады два. Таму, калі да нас прыходзяць студэнты другога-трэцяга курса і праходзяць падчас вучобы паралельна яшчэ і пэўную стажыроўку на прадпрыемстве, яны быццам бы скарачаюць гэты час. Фактычна пасля заканчэння навучальнай установы яны прыходзяць да нас ужо гатовымі спецыялістамі, якім можна даверыць сур'ёзную працу, — дадае галоўны інжынер Іван Стралюк.

— Плюс такога падыходу ў чым? — працягвае дырэктар. — Я размаўляў з выкладчыкамі з выпускных камісій навучальных устаноў. Яны гавораць, што калі такі студэнт абараняецца, адразу відаць, што гаворыць ён з веданнем справы, насамрэч ведае, пра што тэма, паколькі на вытворчасці займаўся ёй на практыцы. Таму, калі студэнты вызначаюцца з тэмай сваёй практыкі, мы імкнёмся, каб яна па максімуме была завязана на тое, што ён выконвае ў нас. Выходзіць, малады чалавек і вучыцца, набывае патрэбныя веды, а калі прыходзіць пасля заканчэння навучальнай установы да нас, мы ўжо ведаем яго кваліфікацыю, яго патэнцыял. Вядома, бывае і так, што чалавек працаваў па адной спецыфіцы, а потым зразумеў, што гэта не зусім яго, хоча займацца іншым. Гэта не азначае, што ён дрэнны спецыяліст. Проста аднаму прасцей усё зрабіць так, як запісана ў праекце, і ўсё — ён не адказвае за тэхнічныя рашэнні. А ў нашай працы ёсць свая спецыфіка падыходаў, прыняцця рашэнняў, адказнасці...

— Яшчэ падчас практыкі — за два гады — можна вызначыць, хто будзе кіраўніком, а хто чыстым «тэхмандзіроўка — не праблема. Яшчэ, напрыклад, можна сказаць, што ў выдатнікаў вучобы характар, як правіла, некалькі замкнёны, яны не такія камунікабельныя. Ім больш падыходзіць праца ў праектных, канструктарскіх падраздзяленнях.

...Калі мы знаёміліся з прадпрыемствам, яго спецыялістамі, на адным з паверхаў адміністрацыйнага будынка заўважылі купку маладых людзей — студэнтаў. Хто ведае, магчыма, сярод іх былі будучыя прафесіяналы сваёй справы, тыя, каму некалі выпадзе гонар падоўжыць славу не толькі самога прадпрыемства, але і ўсёй энергетыкі ўвогуле?

З УСПАМІНАЎ ВЕТЭРАНА

«Што помніцца? Праца, праца і зноў жа праца!»

Міхаіл Рыгоравіч Лебедзеў — адзін са старэйшых работнікаў прадпрыемства. Пасля службы на флоце і заканчэння ў 1969 годзе Маскоўскага энергетычнага ўніверсітэта распачаў сваю працоўную дзейнасць. Узначальваў прадпрыемства з 1974 па 2006 год. Выходзіць, цэлыя 22 гады! «22 гады і адзін квартал», жартам удакладняе Міхаіл Рыгоравіч. Вядома ж, мы не маглі не папрасіць шаноўнага суразмоўцу прыгадаць нешта з тых далёкіх падзей. Найперш, што асабіста запомнілася Міхаілу Рыгоравічу: як тады жылі, працавалі спецыялісты, ці адрозніваецца тагачасная моладзь (а для многіх цяперашніх работнікаў «Белэлектрамантажналадкі» Лебедзеў быў і дырэктарам, і настаўнікам) ад цяперашняй.

— Што прыгадваецца... Трэба было працаваць, працаваць... Усю моладзь, якая да нас прыходзіла, мы заўсёды накіроўвалі ў камандзіроўкі. І ўсе да гэтага нармальна ставіліся. Памятаю, як такім чынам цяперашні галоўны інжынер прадпрыемства Іван Часлававіч адразу атрымаў накіраванне на Браншчыну, якая на той час уваходзіла ў зону нашай працы. Гэтак жа, як і цяперашні дырэктар Сяргей Мікалаевіч. Памятаю, прыйшоў да нас пасля інстытута па размеркаванні — перспектыўны малады спецыяліст з жаданнем працаваць — і практычна з першага дня ад'ездзіў па камандзіроўках. Як па ўсёй Беларусі, так і па шэрагу аб'ектаў Расіі, Украіны, Грузіі, Літвы.

Умовы, прыгадвае Міхаіл Рыгоравіч, былі часам розныя, але ў цэлым нармальны

ДАША — ІМЯ НАША?

Адна з найбольш папулярных сацыяльных сетак у свеце — Facebook — стварыла карту Еўропы, на якой адзначаныя самыя папулярныя для той ці іншай краіны жаночыя і мужчынскія імёны. Для Беларусі імі сталі Дар'я і Уладзіслаў. У Расіі пераважаюць Алены і Аляксандры, ва Украіне — Анастасіі і зноў-такі Аляксандры, у Польшчы — Юліі і Якубы. Наколькі гэтая інфармацыя адпавядае рэчаіснасці — невядома. Мяркуючы па жывым абмеркаванні ў інтэрнэце, усё ж збольшага такая статыстыка адлюстроўвае рэальную карціну.

Ул. інф.

Прычына пажару — мікрахвалёўка

У двухпакаёвай кватэры дома па вуліцы Машэнскага ў Брэсце ў мінулую нядзелю адбыўся пажар. Як высветлілі пазней спецыялісты, ад кароткага замыкання літаральна выбухнула мікрахвалевая печ, і агонь стаў хутка распаўсюджвацца па кухні. Гаспадыня дома і яе малалетнія дзеці таксама былі ў гэты час на кухні: маці паставіла разаграваць дзецям ежу.

За лічаныя хвіліны кватэру завалакло едкім дымам. Дзеці спалохаліся і пабеглі хавацца ў іншы пакой. Маці спачатку спрабавала справіцца з агнём сама, але, зразумеўшы, што адна не здолее, патэлефанавала ў службу выратавання і паклікала суседзяў. Разам з суседам яны знайшлі дзяцей пад ложкам дзіцячага пакоя, а потым утаймавалі агонь. Пажарныя, што прыбылі праз шэсць мінут пасля выкліку, дапамаглі гаспадыні справіцца з задымленнем кватэры і выклікалі хуткую дапамогу. Дзяўчынак 2004 і 2009 гадоў нараджэння давялося шпіталізаваць у дзіцячую бальніцу, бо яны надыхаліся прадуктамі гарэння. Як расказаў карэспандэнту «Звязды» кіраўнік прэс-службы Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей Машноў, у гэты ж дзень у Мікашэвічах Лунінецкага раёна таксама былі выратаваны два чалавекі на пажары. На гэты раз з кватэры, у якой гарэла, пажарныя выцягнулі 57-гадовага гаспадара і яго 30-гадовага сына. Абодва былі п'яныя. Мужчынам аказана медыцынская дапамога, шпіталізацыя не спатрэбілася.

Яна СВЕТАВА.

СПАРТЫЎНЫЯ ТРЫУМФАТАРЫ-2010: АЛЯКСЕЙ ГРЫШЫН І ДАР'Я ДОМРАЧАВА. А ТАКСАМА ЖАНОЧЫ БАСКЕТБОЛ

Баскетбольная каманда пад кіраўніцтвам Анатоля Буяльскага – лепшая!

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Урачыстым узнагароджаннем у Палацы спорту завяршыўся публічны конкурс «Трыумф. Героям спорту 2010», у якім мы на працягу месяца галасавалі за лепшых спартсменаў. Абраць лепшых нам прапаноўвалі ў чатырох намінацыях — «Спартсмен года», «Спартсменка года», «Трэнер года» і «Каманда года».

Сярод атлетаў лідарамі галасавання прадказальна сталі прызёры Алімпіяды ў Ванкуверы фрыстайліст **Аляксей Грышын** і біятланістка **Дар'я Домрачава.** Аляксей прыйшоў на цырымонію з бацькамі і са сцэны падзякаваў ім за тое, што ў свой час «вадзілі, прымушалі займацца фрыстайлам». А вось Дар'і на цырымоніі не было — спартсменка разам з камандай рыхтуецца ў Германіі да чэмпіянату свету, які збярэ наймацнейшых біятланістаў у расійскім Ханты-Мансійску. Словы падзякі за прызнанне балельшчыкі пачулі ад Дашынай маці Ларысы Мінінай:

— Ведаеце, калі пасля Алімпіяды мы сустракалі Дашу ў аэрапорце, сярод прысутных была невялікая група дзяцей. Я бачыла іх твары, вочы. І гэта вартае таго, каб нашы дзеці аддавалі свае сілы і здароўе вялікаму спорту.

Спецыяльны прыз для Дар'і падрыхтавала і група кампаній «Трайпл», а яе кіраўнік Юрый Чыж прызнаўся, што два дні рыхтаваўся віншаваць Дашу. Праўда, падарунак бізнэсмена так і застаўся для нас тайнай.

А вось у намінацыях «Трэнер года» перамогі быў дастойны кожны прэтэндэнт — і трэнер нацыянальнай каманды па веславанні Уладзімір Шантаровіч, і трэнер футбольнай «маладзёжкі» Георгій Кандрацьеў, і трэнер фрыстайлістаў Мікалай Казека, і безумоўна, Віктар Ганчарэнка з **Анатолем Буяльскім.** Але ў галасаванні Анатоль Буяльскі літаральна на дзясятыя працэнта апярэдзіў галоўнага трэнера БАТЭ. Статуэтку трэнер нашай жаночай баскетбольнай зборнай, якая нагадаем, заняла на чэмпіянаце свету ў Чэхіі чацвёртае месца, атрымаў з рук кіраўніка Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрыя Лукашэнкі, а прыз заснавала Беларуская калійная кампанія. Гэта не дзве, і не тры тоны калійных угнаенняў, як меркавалі вядучыя цырымоніі Дзяніс Кур'ян і Вольга Барабаншчыкава, а «дарагая забаўляльная сістэма», як прызнаўся Уладзімір Нікалаенка. Анатоль Буяльскі словы падзякі найперш адрасаваў жонцы Наталлі: «Я б хацеў расцалаваць сваю жонку».

У выбары каманды года таксама вырашальным стаў наш жаночы баскетбол, які сёлета так пашумеў на чэмпіянаце свету. А капітан нашай дружыны **Наталля Марчанка** на сцэне радасна ўсклікнула: «Нарэшце мы абышлі БАТЭ!»

Яшчэ ў чатырох намінацыях пераможцаў вызначала спецыяльнае журы. «Прарывам года» яно назвала другое месца нашага стралка **Сяргея Мартынава** на чэмпіянаце свету-2010, а «Самым яркім спартыўным момантам года» стаў, безумоўна, залаты скачок **Аляксея Грышына.** У галасаванні прынялі ўдзел 1 мільён 342 тысячы 265 балельшчыкаў. Арганізатарамі конкурсу выступілі Белтэлерадыёкампанія, Прэзідэнцкі спартыўны клуб, Міністэрства спорту і турызму і Нацыянальны алімпійскі камітэт.

Пасля вылету з Лігі Еўропы БАТЭ суцешыўся Суперкубкам

Праз тры дні пасля няпростага матча ў Парыжы, які стаў фінальным для БАТЭ ў Лізе Еўропы, беларускі чэмпіён на штучным газоне ў футбольным манежы правёў матч за Суперкубак. Гэта ўзнагарода разыгрываецца паміж уладальнікам Кубка краіны і чэмпіёнам, але БАТЭ ў мінулым сезоне заваяваў абодва трафеі. Таму ў супернікі яму дастаўся фіналіст Кубка жодзінскае «Тарпеда», разгромленае, дарэчы тады ў фінале барысаўчанамі з лікам 5:0.

На гэты раз разгром паўтарыўся, праўда, не з такім маштабным лікам — усяго 3:0. Мячы забілі Дзмітрый Бага (29), Рэнан Брэсан (86) і Павел Няхайчык (92+). Але такі вынік лёгка тлумачыцца: БАТЭ мэтанакіравана рыхтаваўся да пачатку сезона ў лютым і да матчаў Лігі Еўропы. У «Тарпеда» ж сітуацыя іншая, пра яе расказаў пасля матча галоўны трэнер жодзінцаў **Сяргей Гурэнка:**

— Мы правялі добры матч з супернікам, гатоўнасць якога нашмат вышэйшая за нашу. Мы свае моманты не рэалізавалі, а БАТЭ свае выкарыстаў. Месяц таму ў нас на кантракце было ўсяго два футбалісты. Але на сёння нам удалося сфарміраваць каманду. У ёй добрая сумесь вопыту і маладосці. Сёння наша гатоўнасць да сезону складае 60 працэнтаў. Спецыяльна да матча за Суперкубак не рыхтаваліся, мы рыхтуемся да чэмпіянату. Сёння структурай і арганізацыяй гульні я задаволены. У цэлым у будучыню «Тарпеда» я гляджу з аптымізмам.

Пасля заваявання чарговага трафея сваімі ўражаннямі падзяліліся і гульцы БАТЭ.

*— Эмоцыі крыху прытупленыя: нязвыкла станавіцца ўладальнікам трафея ў лютым. Перад матчам пасля прылёту з Парыжа мы правялі ўсяго адну аднаўленчую трэніроўку. Таму я адчуваў сябе не вельмі добра — і па фізічных кандыцыях, і ў плане псіхалогіі. Але ў любым выпадку вынікам задаволены, — **сказаў паўабаронца Аляксандр Валадзько.***

*— Доўга прыцірацца да камандняй гульні не прыйшлося — такое адчуванне, што я і не пакідаў БАТЭ. З Арцёмам Радзьковым узаемаразуменне добрае, раней мы дзейнічалі ў пары. Сыгралі на нуль, таму пытанняў да нас быць не павінна. У першым тайме мы выглядалі лепш, а ў другім жодзінцы валодалі невялікай перавагай. Магчыма, на падсвядомасць уздзейнічаў лік, таму мы і адышлі назад. На шчасце, удалося злавіць «Тарпеда» на контратацы ў канцоўцы, — **прыводзіць словы Ягора Філіпенкі прэс-служба БАТЭ.***

Зараз абедзве каманды чакае яшчэ месяц падрыхтоўкі да чэмпіянату Беларусі, які стартуе 2 красавіка.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Міхаіл СТЭФАНОВІЧ: Хакей. КХЛ

«ПАЧЫНАЕМ З НУЛЯ»

«Дынама» выйшла наперад, а «Лакаматыў» лік у серыі зраўняў

Мінскае «Дынама» правяло два хатнія матчы 1/8 фіналу плэй-оф розыгрышу Кубка Гагарына. Білетаў на «Мінск-Арэну» было не дастаць за некалькі дзён да матчаў. Балельшчыкі двойчы абнавілі рэкорд наведвальнасці на «Мінск-Арэне».

26 лютага наш клуб святкаваў перамогу (4:1) і выйшаў наперад у серыі — 2:1. Лік шайбам на першай хвіліне адкрыў Давід Петрашак, але хуткa Ёзэф Вашычак лік зраўняў. А вось пасля гэтага «Лакаматыў» забіць не змог, а дынамаўцы толькі павялічвалі адрыў: па чарзе вызначыліся Джэф Плат, Аляксандр Кулакоў і Сяргей Дрозд. На матчы быў устаноўлены рэкорд па колькасці гледачоў — 15 тысяч 982. Але ён пратрымаўся ўсяго дзень: 27 лютага заўзятары «Дынама» ўстанавілі новы — 16 тысяч 039. Праўда, нягледзячы на гарачую падтрымку, наша каманда на гэты раз саступіла — 2:4. Аляксандр Калянін адкрыў лік, а пасля яго падвоіў. Міхаіл Стэфановіч скараціў адставанне, але госці зноў пайшлі наперад і яшчэ двойчы забілі. Канчатковы лік устанавіў дынамавец Сяргей Дрозд.

Пасля матча галоўны трэнер нашай каманды **Марэк Сікора** трэцюю шайбу ў нашы вароты назваў вырашальнай, але адзначыў, што вынікам, які мог быць і горшым, пакуль задаволены:

— Пасля гульні ў Яраслаўлі я казаў, што буду задаволены, калі дома хоць раз выйграем. «Лакаматыў» тройчы запар нікому не саступаў. Таму я задаволены. Хоць калі мы прапусцілі гол у меншасці, а пасля яшчэ адзін, я стаў апасацца, што вечар можа скласціся вельмі дрэнна, асабліва калі даведаўся пра лік у матчы «Атланта» з «Поўначсталлю». Але каманда сабралася, асабліва чацвёртае звяно, якое выдатна сыграла. Добра, што нашы балельшчыкі пастаянна б'юць рэкорд КХЛ па наведвальнасці. Гэта цудоўна гуляць на такой арэне з такімі заўзятарамі, якія з самага пачатку падтрымліваюць каманду, у адрозненне ад расійскіх, якія маўчаць, пакуль не заб'еш гол. Я спадзяюся, што тут усё не скончылася, і мы парадуем балельшчыкаў у наступнай хатняй гульні.

Фота БЕЛТА.

— Хуткі гол аказаў псіхалагічны ўплыў на каманду, бо ў папярэдніх матчах мы забівалі першымі. З «Лакаматывам» нельга выдаляцца, з імі трэба гуляць у камандную гульню. Што да маёй шайбы, то я падставіў клюшку і нават не бачыў, забіў ці не. Зразумеў гэта толькі па рэакцыі трыбун. Як успрынялі, што супернік зраўняў лік у серыі? Нармальна, усё пачынаецца з нуля. Праўда, цяпер да дзвюх перамог. Ніякай бяды ў гэтым я не бачу. Дома, зразумела, лягчэй гуляць з такой падтрымкай. Але псіхалагічны ціск большы, і нам увесь час хочацца бегчы ў атаку, — **падзяліўся пасля матча нападаючы «Дынама» Міхаіл Стэфановіч.**

Учора «Дынама» вылецела ў Яраслаўль, дзе правядзе яшчэ адзін матч. А ў чацвер серыя працягнецца зноў на «Мінск-Арэне», паядынак пачнецца ў 19 гадзін. Хакейны клуб «Дынама-Мінск» паведамляе, што квіткі на шосты матч з «Лакаматывам» паступілі ў продаж у аўторак, у 00.01 гадзіну. Іх можна забраніраваць з мэтай далейшага набыцця. Пачынаючы з серады продаж квіткоў будзе ажыццяўляцца ва ўсіх кропках без папярэдняга браніравання.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Организация:

ОАО «Пищевой комбинат «Веселово»

Учетный номер плательщика: УНП 690277551
Вид деятельности: перерабатывающая
Организационно-правовая форма: частная
Орган управления: КОНЦЕРН «БЕЛГОСПИЩЕПРОМ»
Единица измерения: млн руб.
Адрес: 222132, Минская обл., Борисовский р-н, д. Веселово, ул. Заводская-24

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2011 г.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства			
первоначальная стоимость (01)	101	**19244**	**23392**
амортизация (02)	102	**8268**	**9280**
остаточная стоимость	110	**10976**	**14112**
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость (04)	111	**14**	**14**
амортизация (05)	112	**2**	**4**
остаточная стоимость	120	**12**	**10**
Доходные вложения в материальные ценности:			
первоначальная стоимость (03)	121		
амортизация (02)	122		
остаточная стоимость	130		
Вложения во внеоборотные активы (07,08)	140	**720**	**484**
в том числе: незавершенное строительство (08)	141	**640**	**385**
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	190	**11708**	**14606**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	**4981**	**4596**
в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы (10,15,16)	211	**3213**	**2368**
животные на выращивании и откорме (11)	212		
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты (20,21,23,29)	213	**191**	**323**
расходы на реализацию (44)	214		
готовая продукция и товары для реализации (40,41,43,44)	215	**1187**	**1489**
товары отгруженные (45)	216		
выполненные этапы по незавершенным работам (46)	217		
расходы будущих периодов (97)	218	**390**	**416**
прочие запасы и затраты	219		
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам (18,76)	220	**641**	**581**
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230		
в том числе: покупателей и заказчиков (62)	231		
прочая дебиторская задолженность (60,76)	232		
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	**5477**	**6044**
в том числе: покупателей и заказчиков (62)	241	**5232**	**5881**
поставщиков и подрядчиков (60)	242		**116**
по налогам и сборам (68,69)	243	**10**	**21**
по расчетам с персоналом (70,71,73)	244		
разных дебиторов (76)	245	**235**	**26**
прочая дебиторская задолженность	249		
Расчеты с учредителями (75)	250		
в том числе: по вкладам в уставный фонд (75)	251		
прочие (75)	252		
Денежные средства (50,51,52,55,57)	260	**38**	**32**
в том числе: денежные средства на депозитных счетах (55)	261		
Финансовые вложения (58)	270		
Прочие оборотные активы (79,94)	280		
ИТОГО по разделу II	290	**11137**	**11253**
БАЛАНС (190+290)	300	**22845**	**25859**

ПАССИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд (80)	410	10095	**10615**
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) (81)	411		
Резервный фонд (82)	420		
в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством	421		
резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами	422		
Добавочный фонд (83)	430	**1767**	**3171**
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода (99)	440	**X**	**X**
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) (84)	450	**410**	**335**
Целевое финансирование (86)	460	1204	
Доходы будущих периодов (98)	470		
ИТОГО по разделу III	490	**13476**	**14121**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы (67)	510	**1217**	**6481**
Прочие долгосрочные обязательства	520		
ИТОГО по разделу IV	590	**1217**	**6481**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы (66)	610	1776	
Кредиторская задолженность	620	**6318**	**5189**
в том числе: перед поставщиками и подрядчикам (60)	621	**4046**	**3832**
перед покупателями и заказчиками (62)	622	226	**93**
по расчетам с персоналом по оплате труда (70)	623	**100**	**160**
по прочим расчетам с персоналом (71,73)	624	**5**	**6**
по налогам и сборам (68)	625	**1490**	**708**
по социальному страхованию и обеспечению (69)	626	**24**	**50**
по лизинговым платежам (76)	627		
перед прочими кредиторами	628	**427**	**340**
Задолженность перед участниками (учредителями) (75)	630	**58**	**68**
в том числе: по выплате доходов, дивидендов	631	**58**	**68**
прочая задолженность	632		
Резервы предстоящих расходов (96)	640		
Прочие краткосрочные обязательства (79)	650		
ИТОГО по разделу V	690	8152	**5257**
БАЛАНС (490+590+690)	700	**22845**	**25859**
Из строки 620:			
долгосрочная кредиторская задолженность	701		
краткосрочная кредиторская задолженность	702	6318	**5189**

Активы и обязательства, учитываемые за балансом	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	001		
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002		
Материалы, принятые в переработку	003		
Товары, принятые на комиссию	004		
Оборудование, принятое для монтажа	005		
Бланки строгой отчетности	006	**3**	**3**
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	007		
Обеспечения обязательств и платежей полученные	008		
Обеспечения обязательств и платежей выданные	009		
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	**377**	**118**
Основные средства, сданные в аренду (лизинг)	011		
Нематериальные активы, полученные в пользование	012		
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013	**-3**	**1**
Потеря стоимости основных средств	014		
Товары, отгруженные в отпускных ценах	015		
Имущество, находящееся в совместном владении	016		
Именные приватизационные чеки «Имущество»	017		
Материалы, оборудование, принятые (переданные) в рамках гарантийных обязательств	018		

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	**23184**	**22587**
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	**8149**	**10341**
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	**15035**	**12246**
СПРАВОЧНО (из строки 010): Сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	**13655**	**11157**
Валовая прибыль (020-021-030)	040	**1380**	**1089**
Управленческие расходы	050		
Расходы на реализацию	060		
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	070	**1380**	**1089**
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	**1059**	**594**
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081		
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	**1059**	**594**
в том числе: проценты к получению	091		
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092		
доходы от операций с активами	093		
прочие операционные доходы	099	**1059**	**594**
Операционные расходы	100	**1076**	**623**
в том числе: проценты к уплате	101		
расходы от операций с активами	102		
прочие операционные расходы	109	**1076**	**623**
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (090-100)	120	**-17**	**-29**
III.ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	160	**108**
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131		
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	160	**108**
Внереализационные расходы	150	1116	**791**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	**-956**	**-683**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160)	200	**407**	**377**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210		
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220		
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/-200+210-220)	240	**407**	**377**
Налог на прибыль	250	**244**	**188**
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	**23**	**96**
Прочие расходы и платежи из прибыли	270		
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	300	140	93
СПРАВОЧНО (из строки 300): Сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	310		
Прибыль (убыток) на акцию	320		
Количество прибыльных организаций по конечному финансовому результату	330	**1**	**1**
Сумма полученной прибыли по конечному финансовому результату	330А	**140**	**93**
Количество убыточных организаций по конечному финансовому результату	340		
Сумма полученного убытка по конечному финансовому результату	340А		

РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

Показатель		За отчетный период		За аналогичный период предыдущего года	
Наименование	Код	Доход	Расход	Доход	Расход
1	2	3	4	5	6
Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании	350		**57**	**3**	**261**
Прибыль (убыток) прошлых лет	360				
Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств	370				
Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте	380	**106**	**24**	**23**	**8**
Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности	390	54			
Прочие доходы и расходы	400		**1035**	**82**	**522**
ИТОГО	500	160	1116	108	**791**

Руководитель **М.И. Горегляд**

Главный бухгалтер **А.В. Петрович**

ОАО «Пивзавод Оливария»

ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Пивзавод Оливария», которое состоится 22 марта 2011 года в 9.00 в конференц-зале ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, проспект Машерова, дом 19. Форма проведения годового общего собрания акционеров – очная.

Повестка дня годового общего собрания акционеров:

1) Утверждение итогов финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Пивзавод Оливария» за 2010 г.
2) Утверждение отчета Наблюдательного совета о работе в 2010 г.
3) Утверждение отчета Ревизионной комиссии о работе в 2010 г.
4) Утверждение заключения Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности ОАО «Пивзавод Оливария» за 2010 г.
5) Утверждение результатов распределения прибыли и убытков ОАО «Пивзавод Оливария», выплаты дивидендов по итогам работы за 2010 г.
6) Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков ОАО «Пивзавод Оливария».
7) Избрание членов Наблюдательного совета.
8) Избрание членов Ревизионной комиссии.
9) Утверждение размера вознаграждения и компенсации членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии ОАО «Пивзавод Оливария».
10) Предоставление безвозмездной (спонсорской) помощи.
11) Утверждение Устава ОАО «Пивзавод Оливария» в новой редакции.

Список лиц, имеющих право на участие в годовом общем собрании акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» 22 марта 2011 года, составлен на основании реестра акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» по состоянию на 1 марта 2011 года.

Материалы к годовому общему собранию акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» 22 марта 2011 года будут представлены для ознакомления акционерам с 16 марта 2011 года на информационном стенде в административном здании ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19.

Регистрация акционеров для участия в годовом общем собрании ОАО «Пивзавод Оливария» будет осуществляться 22 марта 2011 года с 7.50 до 8.50 в помещении конференц-зала ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19. Регистрация проводится при предъявлении документа, подтверждающего полномочия на участие в собрании (доверенность) и/или паспорта.

УНП 100128525.

Открытое акционерное общество «Минский домостроительный комбинат»,

расположенное по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 **извещает акционеров о том, что 31 марта 2011 г. в 15.00 в актовом зале предприятия состоится ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Отчет о работе Наблюдательного совета за 2010 год.
2. Об итогах работы Общества за 2010 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2011 год согласно разработанного в установленном порядке бизнес-плана.
3. Утверждение заключения ревизионной комиссии, результатов аудиторской проверки годовой финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2010 год.
5. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов по результатам деятельности Общества за 2010 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли в 2011 году и первом квартале 2012 года в соответствии с утвержденным и согласованным бизнес-планом развития Общества на 2011 год.
7. Избрание членов Наблюдательного совета.
8. Избрание членов ревизионной комиссии.
9. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества по рекомендации Минского городского территориального фонда государственного имущества.
11. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

С проектами решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни, начиная с 24 марта 2011 года по месту нахождения Общества (инвестиционный отдел, 3-й этаж).

Регистрация участников собрания будет проводиться в актовом зале предприятия **с 14.15 до 14.45** часов.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – нотариально заверенную доверенность).

УНП 100258980

Директор В.Н. Песецкий.

Могилевский городской исполнительный комитет СООБЩАЕТ:

в аукционы: ***На право заключения договоров аренды земельных участков и по продаже земельных участков в частную собственность,*** объявленные на 15 марта 2011 года соответственно в 16.00 и в 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а,

в связи с переносом праздничных дней внесены изменения: ПОСЛЕДНИЙ ДЕНЬ ПРИЕМА ЗАЯВЛЕНИЙ – 10 марта 2011 года.

Примечание: *информация опубликована 9 февраля 2011 года в газете «Звязда» № 25(26889).*

Контактный телефон в городе Могилеве 22 11 63.

ОТЧЕТ
Местного благотворительного Фонда детей-инвалидов с художественными способностями «Голубые берега» об использовании своего имущества за 2009 год.

Местный благотворительный Фонд детей-инвалидов с художественными способностями «Голубые берега» информирует о продолжении своей деятельности согласно Уставу по адресу: г. Могилев, ул. Сурганова, д. 21, а также сообщает о том, что по состоянию на 1 января 2010 года баланс фонда составил 19 550 000 рублей.

В том числе:
- стоимость имущества Фонда составляет — 14 350 000 рублей и используется для работы детских кружков и студий;
- благотворительные взносы частных лиц составили — 550 000 рублей;
- целевая спонсорская помощь частных юридических лиц — 10 300 000 рублей;
- целевая спонсорская помощь государственных юридических лиц — 7 000 000 рублей;
- общая сумма расходов, понесенных Фондом на реализацию уставной деятельности, — 8 000 000 рублей;
- общая сумма расходов, использованных на погашение арендных и коммунальных платежей, составила 9 150 000 рублей;
- количество учредителей Фонда — 3 (Учредительский вклад за отчетный период был внесен в виде безвозмездного труда на благо Фонда).

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

УНП 790175626

У суд Петрыкаўскага р-на паступіла заява аб прызнанні памерлым **Бендзегі Фёдара Карпавіча,** 1946 года нараджэння; в. Буда Хойніцкага раёна. Да 1974 года пражываў у г. Петрыкаве, вул. Будаўнічая, 4/2. У 1974 годзе Бендзега Ф.К. з'ехаў з Петрыкава і вестак пра яго месцазнаходжанне няма. Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Бендзегу Фёдара Карпавіча, паведаміць суду Петрыкаўскага р-на на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 1 сакавіка па 30 чэрвеня 2011 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2011 года.

2. Арганізатар Гульні — Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» (далей — Арганізатар), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — установы «Рэдакцыя газеты «Звязда» і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ (руб.)	Усяго з ПДВ (руб.)
1.	Прас «Віцязь» 605	7	60 000	420 000
2.	Пыласос «Віцязь» ПС-302	7	157 300	1 101 100
3.	Печ ЗВЧ «Віцязь» 1379-МП 17-700-3	1	272 200	272 200
4.	Тэлевізар «Віцязь» 37 CTV 730-3	7	346 000	2 422 000

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 4 215 300 (Чатыры мільёны дзвесце пятнаццаць тысяч трыста) беларускіх рублёў.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2011 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2011 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас рэдакцыі ў перыяд падпіснай кампаніі на другі квартал або першае паўгоддзе 2011 года выразаная з газеты запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая друкуецца ў газеце «Звязда» да двух разоў на тыдзень у перыяд з 1 сакавіка па 5 красавіка 2011 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя, або тыя, якія паступілі ў рэдакцыю пасля 8 красавіка 2011 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Здановіч Уладзімір Аляксандравіч — намеснік галоўнага рэдактара ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Пракапеня Алена Уладзіміраўна — намеснік начальніка ўпраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — загадчык аддзела пісьмаў установы «Рэдакцыя газеты «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатольевіч — вядучы рэдактар тэхнічны ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда»;

Прус Таццяна Віктараўна — вядучы рэдактар тэхнічны ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда»;

Дзевойна Алена Уладзіміраўна — рэдактар юрыдычнага аддзела ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда».

10. Камісія кіруецца ў сваёй дзейнасці рэгламентам (раздзел V гэтых Правілаў).

11. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. РЭГЛАМЕНТ РАБОТЫ КАМІСІІ

12. Камісія ажыццяўляе кантроль за захаваннем вызначаных правілаў правядзення рэкламнай гульні, вызначае пераможцаў Гульні, якія выйгралі прыз, разглядае скаргі і спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць падчас правядзення Гульні.

13. Пасяджэнні Камісіі вядзе старшыня. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці членаў з яе зарэгістраванага складу.

14. Члены Камісіі абавязаны: прымаць удзел у пасяджэннях Камісіі, забяспечваць падчас Гульні адпаведнасць парадку яе правядзення гэтым Правілам, вызначыць пераможцаў Гульні, якія выйгралі прызы, прымаць удзел у разглядзе скаргаў удзельнікаў пры іх наяўнасці, падпісваць пратаколы пасяджэнняў Камісіі.

15. На пасяджэнне Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца ўдзельнікі Гульні, прадстаўнікі незалежных арганізацый.

16. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца вырашальным.

17. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

VI. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

18. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 11 красавіка 2011 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

19. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

20. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца па адным прасе, пыласосе і тэлевізары.

У сувязі з тым, што Мінская вобласць стабільна забяспечвае найвялікшую колькасць падпісчыкаў, для гэтага рэгіёна дадаткова разыгрываецца адна печ ЗВЧ.

21. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

22. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 20 красавіка 2011 года ўключна ў газеце «Звязда».

Арганізатар у тэрмін да 20 красавіка 2011 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VII. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

23. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2011 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2011 года.

24. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2011 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

25. Тэлевізары і печ ЗВЧ дастаўляе і ўручае пераможцам Арганізатар Гульні ў тэрмін да 30 чэрвеня 2011 года ўключна з папярэднім паведамленнем аб канкрэтнай даце праз публікацыі ў газеце «Звязда».

26. Астатнія прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 чэрвеня 2011 года ў памяшканні Рэдакцыі па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў за атрыманнем прыза, Арганізатар не аплачвае.

Па просьбе пераможцаў гэтыя прызы могуць быць дастаўлены ім, калі яны пражываюць у мясцовасці, блізка размешчанай ад месца жыхарства пераможцаў, што выйгралі тэлевізар або печ ЗВЧ.

27. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

28. Пасля 30 чэрвеня 2011 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VIII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

29. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

30. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

31. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» да пачатку рэкламнай гульні апублікоўваюцца сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

32. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 19 68.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 1859 ад 25.02.2011 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2011 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ на II кв. або 1-е паўг. 2011 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Трагедыя

ЧАМУ ТРАГІЧНА ЗАГІНУЛІ ЧАТЫРЫ БЕЛАРУСКІЯ ПАГРАНІЧНІКІ?



ЧАТЫРЫ вайскоўцы-кантрактнікі трагічна загінулі, перакуліўшыся на службовым «ГАЗе». Пагранічнікаў выкінула на асфальт разам з грузам — бардзюрнымі плітамі, якія, у парушэнне службовай інструкцыі, склалі ў адным кузаве з вайскоўцамі.

Аказалася, што вадзіцель «ГАЗа» не меў права на перавозку такой колькасці людзей. Але камандзіры сістэматычна прызначалі яго перавозіць асабовы склад пагранкамендатуры.

У выніку асудзілі толькі вадзіцеля. У той жа час некаторыя з яго камандзіраў атрымалі павышэнні па службе.

Падрабязнасці жахлівага здарэння ў матэрыяле «Звязды».

Аварыя пад Давыд-Гарадком здарылася 18 снежня 2008 года. Аднак акалічнасці сталі вядомы толькі нядаўна, калі ў Брэсцкім міжгарнізонным ваенным судзе разглядалася справа былога маёра, які на момант трагічнага здарэння часова выконваў абавязкі кіраўніка пагранкамендатуры і даваў каманду грузіць пагібельныя бетонныя плиты.

Усе пагранічнікі служылі ў пагранкамендатуры «Рэчыца».

— *Яшчэ ў 2009 годзе асудзілі вадзіцеля Дзмітрыя Кананца, па віне якога здарылася дарожна-транспартнае здарэнне. А зараз разглядаецца справа па артыкуле 456 — халатнасць,* — паведаміў «Звяздзе» **старшыня Брэсцкага міжгарнізоннага суда Ігар БІЛІБУХА**.

У аўторак 15 лютага міжгарнізонны суд аправаў Мікалая Дубойскага «за адсутнасцю складу злачынства». Сваякі загінулых пагранічнікаў не пагадзіліся з гэтым рашэннем і падрыхтавалі касацыйныя скаргі.

З-за чаго загінулі чатыры пагранічнікі? Журналісту «Звязды» сталі вядомы страшныя акалічнасці дарожна-транспартнага здарэння.

Сведка аварыі: «У пагранічніка дзірка ў лобе, а на грудзях камянюка...»

18 снежня 2008 года байцы пагранічнай камендатуры «Рэчыца» (усяго 13 чалавек) ехалі на службовым аўтамабілі ГАЗ-33081 «Садко» ў бок часовага пагранічнага паста «Мутвіца», які знаходзіцца на беларуска-ўкраінскай мяжы.

На аб'язной шашы ля Давыд-Гарадка машыну з ваеннаслужачымі раптоўна занесла і перакуліла на 360 градусаў.

Журналісту «Звязды» ўдалося сустрэцца з непасрэдным сведкам трагедыі (размова запісана на дыктафон, зместкі пра чалавека не друкуем).

— *Час быў перад абедам, ехалі дадому па аб'язной дарозе з боку Лісовіч* (вёска ля Давыд-Гарадка. — **Я. В.**). *Галалёд быў страшэнны, дарогу не паспелі пасыпаць пяском* (гэты факт быў дакладна ўстаноўлены следствам. — **Я. В.**). *Ехалі, можа, з хуткасцю 20 км/г, слізгота такая была — жах. Тэнтаваны «Газон» з пагранцамі нас абышоў. Хоць таксама ехаў павольна, можа, 45 км/г.*

Дык вось метраў праз дзесяць пасля абгону завіляла нешта машына, слізгота ж такая. Пагранічнікаў занесла на іншы бок дарогі, — сведка паказвае рукой на супрацьлеглую ад нас узбочыну. — *І вось, бачыш, стаяць бетонныя слупкі абапал дарогі. Адзін з гэтых слупкоў быў напалову абламаны, з зямлі тырчаў цюблік. Машына левым пярэднім колам стукнулася ў гэты цюблік, яе аддфутболіла да нас, перавярнула ў палёце, машына сказіла на кабіну, потым на колы — і аказалася ў канаве побач з намі. Такога раней нават у баевіках не бачыў...*

Пагранічнікаў, якія сядзелі пад тэнтам, рассыпала ў розныя бакі. Адных, калі машына стукнулася аб цюблік, там жа і выкінула ў кювет. Яны ўсе выжылі. Чатырох выкінула на дарогу.

Тыя, што сядзелі ў кабіне, ацалелі. Кінуўся на дарогу, адзін пагранічнік ляжыць прама ўздоўж раздзяляльнай паласы, у яго, не пры нас кажучы, дзірка ў лобе. А на грудзях — камянюка. Бардзюрная пліта. Як мы пазней пачулі, важыла яна больш за 40 кг. Яшчэ на хлопцаў высыпала маянез, батоны, спецыі, валялася зброя...

Камяні з іх паздымалі. Кінуўся да аднаго — у яго кроў з рота ідзе, і ён нібыта захлынаецца гэтай крывёю. Я яго набок паклаў — пальцамі ў рот, каб дыхаў. Падклаў пад галаву армейскую шапку. Гляжу — у яго палова лоба ўціснута ўнутр...

Астатнія таксама хрыпелі — відаць, падушыла іх гэтымі камянямі, пакуль машына круцілася.

Што самае дзіўнае — потым, калі прыехалі ваенныя, а мы давалі паказанні, камянёў ужо не было. Як машына перакулілася — ляжалі, раскіданыя па дарозе, а тут зніклі. З машыны высыпала многа гэтых камянюк.

Міліцыя прыехала адразу ж, «хуткая» таксама аператыўна, хвілін праз 15...

У дарожна-транспартным здарэнні загінулі чатыры пагранічнікі. Гэта прапаршчык Уладзімір Слуцкі, радавыя Андрэй Цупа і Васіль Казакевіч, старшы сяржант Мікалай Трушко.

Побач з тым самым цюблікам, аб які стукнуўся «ГАЗ», сёння ўсталяваны металічны крыж з шыльдачкай на беларускай мове: «Адна памылка зламае лёс, што не хапае дажа слёз».

Перад аварыяй у прапаршчыка Слуцкага загінула дзіця

З **ТАЦЦЯНАЙ, жонкай загінулага прапаршчыка Уладзіміра Слуцкага,** мы сустрэліся ў Століне і прыехалі на старыя гарадскія могілкі.

— *Пазнаёміліся мы з Валодзем у пінскім медвучылішчы, дзе разам вучыліся. А ажаніліся ў 2002 годзе. Якраз ён адслужыў у арміі, і яму прапанавалі застацца ў войску па кантракце,* — узгадвае Таццяна. — *Спачатку муж працаваў вадзіцелем. Калі адсутнічаў урач, замяшчаў таго ў якасці фельчара. У 2006 годзе Валодзя перайшоў у пагранічныя войскі.*

Ён вельмі рэдка бываў дома. У той дзень ён не павінен быў ехаць на «Мутвіцу», але падмяніў чалавека. Валодзю паабяцалі, што калі ён паедзе, то зможа пабыць з сям'ёй на Новы год. Незадоўга да гэтага ў нас загінула маленькае дзіця...

Ніколі не думала, што такое можа здарыцца. Нават уявіць не магла, — не стрымліваецца і плача Таццяна. — Калі мне сказалі, я не магла паверыць і не верыла, пакуль мы яго не пахавалі. Толькі праз два тыдні я пачала разумець, што ён больш дадому не прыйдзе, што яго больш не будзе і я яго не змагу пабачыць...

Я прыйшла на працу, і сказалі, што ў Давыд-Гарадку здарылася аварыя з пагранічнікамі. Я адразу ж пачала тэлефанаваць, але муж не адказваў. Спачатку казалі: «Не перажывай, там усё добра, усе яны жывыя». У нас там па-першае, груз (бетонныя плиты і скрыні з харчаваннем) не павінны былі перавозіцца ў адным кузаве з пагранічнікамі. Гэта катэгарычна забаронена «Інструкцыяй па арганізацыі эксплуатацыі аўтамабільнай тэхнікі», якая зацвярджана загадам Старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта ў 2006 годзе. Службовы «ГАЗ» перагрузілі, і ў тым ліку з-за гэтага машына страціла ўстойлівасць.

Вова там на месцы прама загінуў. Кум Саша адразу ж пачаў праваряць самых цяжкіх і нават не пазнаў Вову. Толькі калі яму сказалі, што сярод загінулых ёсць Слуцкі, ён па некаторых рысах твару пазнаў мужа.

Па-другое, вадзіцель «ГАЗа», радавы Дзмітрый Кананец, не меў вадзіцельскага пасведчання з адзнакай «катэгорыя D», а значыць — не меў права перавозіць на аўтамабілі больш за восем чалавек. Тым не менш радавы сістэматычна прызначаўся камандзірамі для перавозкі асабовага складу пагранкамендатуры.

Аказалася, што ў 2007 годзе радавога Кананца пазбавілі права кіравання аўтатранспартам катэгорыі В за кіраванне асабістым аўтамабілем у нецвярозым стане. Тым не менш, камандзіры не звярнулі на гэту акалічнасць належнай увагі.

Як паказала аўтатэхнічная экспертыза, якую правялі спецыялісты дзяржаўнага экспертна-крыміналістычнага цэнтра, пярэдні мост «ГАЗа» падчас ДТЗ быў выключаны (гэты фактар істотна паўплываў на ўстойлівасць аўтамабіля), тармазная сістэма была няспраўная — задняя колы не затармажваліся. Стан аўтатранспарту павінна была кантраляваць група тэхнічнага забеспячэння пагранкамендатуры, але абавязкі не былі выкананы належным чынам.

Тым не менш, асудзілі толькі радавога Кананца — па частцы 3 артыкула 464 Крымінальнага кодэкса (*«Парушэнне правілаў кіравання альбо эксплуатацыі машын, якое пацягнула па неасцярожнасці смерць дзвюх альбо больш асобаў»*).

Сваякі загінулых былі абураныя: вінаваты не толькі Кананец, але і кампетэнтныя афіцэры.

— *Хто яго без правоў пасадзіў за руль? Камандзіры. Яны за гэта і павінны адказваць, але аказалася, што ніхто не вінаваты,* — пратэстуе **Мікалай ТРУШКО, бацька аднаго з загінулых пагранічнікаў**. — *Хто даў права перавозіць небяспечны груз у машыне разам з людзьмі? Камандзіры дазвалялі гэта рабіць. Гэта грубае парушэнне. Сын мне незадоўга да смерці расказваў: «Тата, у машыну, пад тэн, разам з намі столькі хламу грузяць, што часам немагчыма сядзець, ляжаць даводзіцца. Столькі наваляць! Але даюць загад ехаць! І што ты тут зробіш? Мы людзі паднявольныя, павінны выконваць загады». Яны забралі ў мяне сына, і за гэта ніводзін з камандзіраў не адказаў...*

Скаргі далі плён пасля звароту ў Адміністрацыю Прэзідэнта і Генпракуратуру

Сваякі загінулых пагранічнікаў пачалі пісаць скаргі з патрабаваннем прыцягнуць да адказнасці кампетэнтных афіцэраў, якія халатна ставіліся да выканання сваіх абавязкаў.

— *Спачатку мы пісалі і пісалі скаргі ў ваенную пракуратуру. Нам адказвалі, што вінаваты толькі Кананец, бо ён парушыў ПДР і мог адмовіцца везці груз. Але як такое можа быць? Ён радавы, ён атрымаў загад і мусіў яго выконваць,* — лічыць Таццяна Слуцкая. — *Мы звярталіся ў Адміністрацыю Прэзідэнта, у КДБ, і калі са справай азнаёміліся ў Генеральнай пракуратуры, скаргі далі плён. У сакавіку 2010 была заведзена крымінальная справа ў дачыненні Мікалая Дубойскага, які на момант трагедыі выконваў абавязкі каменданта пагранкамендатуры «Рэчыца». Расследаваннем займалася ўсё тая ж Беларуская ваенная пракуратура. Справу давялі да суда.*

У пастанове Беларускай ваеннай пракуратуры пазначана: «Дубойскі, загадзя ведаючы аб забароне на перавозку грузу з асабовым складам, 17 лютага 2008 года легкадумна аддаў загад аб загрузцы ў кузаў аўтамашыны ГАЗ-33081 «Садко» бардзюрных пліт, а таксама трох драўляных скрынь з харчаваннем, узбраеннем і боепрыпасамі. Пры гэтым па нядбайнасці Дубойскі ухіліўся ад кантролю за максімальнай масай транспартнага сродку, масай перавозімага грузу і размеркаваннем нагрузкі па восях транспартнага сродку. У выніку пасля размяшчэння ў аўтамашыне асабовага складу тэхнічна дапушчальная маса транспартнага сродку была перавышана на 213,98 кг, маса перавозімага грузу — на 463,98 кг, максімальна дапушчальная нагрузка на заднюю вось — на 360 кг. Следства прыйшло да высновы, што дапушчаныя Дубойскім парушэнні знаходзяцца ў прамой прычыннай сувязі з наступствамі, якія здарыліся, — здзяйсненнем ДТЗ і гібеллю людзей».

Такім чынам, *Мікалаю Дубойскаму* прад'явілі абвінавачанне па частцы 1 артыкула 456 Крымінальнага кодэкса («халатнае стаўленне да службы»). Але Брэсцкі міжгарнізонны ваенны суд, як ужо паведамлялася, прызнаў яго невінаватым...

— *Іншых службовых асобаў, якія, на маю думку, мелі дачыненне да гібелі майго мужа, увогуле не судзілі. Гэта начальнік аддзялення пагранкамендатуры А., які знаходзіўся ў машыне падчас аварыі і выжыў. Ён павінен быў непасрэдна спыніць загрузку «ГАЗа» і сачыць за дзеяннямі вадзіцеля. Як аказалася, ён даваў каманду на адыходжанне машыны,* — пералічвае Таццяна Слуцкая. — *Лічу, што пакараць павінны камандзіра матэрыяльна-тэхнічнага ўзвода, які адказваў за допуск вадзіцеля і дазволіў кіраваць «ГАЗам» чалавеку без правоў. Камандзір ваеннай часці не спыняў грубыя парушэнні дысцыпліны. Лічу, што такія людзі не маюць права называць сябе афіцэрамі.*

Сваякі загінулых пагранічнікаў распавялі журналісту «Звязды» пра тое, што яны будуць працягваць пісаць скаргі ў розныя інстанцыі.

— *Не веру, што мой муж загінуў бы, калі б у машыне не было бардзюрных пліт. Але змагацца за справядлівасць ужо няма моцы, нервы не вытрымліваюць, а рукі апускаюцца,* — расказала журналісту «Звязды» **ЮЛІЯ, жонка яшчэ аднаго загінулага пагранічніка — Васіля Казакевіча**.

Замест адказнасці — зорачкі на пагонах?

Пра гэты нюанс нельга не напісаць. Ён найбольш шакіраваў і параніў сваякоў загінулых пагранічнікаў.

У хуткім часе пасля гібелі пагранічнікаў афіцэры з пагранкамендатуры «Рэчыца», якія мелі дачыненне да трагічнай аварыі, атрымалі павышэнні па службе.

— *20 снежня пахавалі майго мужа, а 30-га — яму* (афіцэру А., які на момант здарэння знаходзіўся ў машыне і выжыў — **Я. В.**) *даюць званне маёра. За што? У яго за плячыма загінулі чатыры чалавекі,* — абураецца Таццяна Слуцкая.

У аддзел журналісцкіх расследаванняў «Звязды» трапілі афіцыйныя паперы, якія пацвярджаюць, што 30 снежня 2008 года (праз 12 дзён пасля гібелі чатырох пагранічнікаў) капітан А. сапраўды атрымаў званне маёра. Маёр Дубойскі, які загадаў грузіць бетонныя плиты, быў павышаны ў званні 12 жніўня 2009 года (амаль праз восем месяцаў пасля здарэння зрабіўся падпалкоўнікам). Камандзір вайсковай часці Б. быў пераведзены кіраваць іншым падраздзяленнем.

Бацька асуджанага вадзіцеля: «Сын, плач, з гэтым табе жыць да канца тваіх дзён»

Падчас падрыхтоўкі матэрыялу мы звязаліся з **Анатолем КАНАНЦОМ**. Ён распавёў пра сустрэчу з сынам Дзмітрыем у дзень трагедыі.

— *Вечарам я быў у бальніцы, куды прывезлі пацярпелых пагранічнікаў. Сын сказаў мне са слязьмі на вачах, што яго падрэзала «Хонда». Я адказаў: «Сын, плач. Здарылася трагедыя, загінулі людзі. З гэтым табе жыць да канца тваіх дзён»,* — узгадвае Анатоль Кананец. — *Мой сын вінаваты. Ён парушыў правілы дарожнага руху, не пабачыў знак «Асцярожна, галалёд». Хоць, па паказаннях некаторых сведак, гэты знак быў усталяваны ўжо пасля аварыі.*

У складаных умовах надвор'я ён не ўключыў пярэдні мост. Сын адбывае пакаранне, прызнаўшы сваю віну.

Аднак людзі ў афіцэрскіх пагонах таксама парушылі закон. Гэта не радавы Кананец у парушэнне адпаведнага загада даў каманду загружаць машыну і ехаць. Не радавы Кананец кіраваў пагранічным атрадам, які накіроўваўся ахоўваць дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь. У загадзе канкрэтна пазначана, хто з'яўляецца старшым машыны і якое пакаранне пагражае за невыкананне інструкцый. Загад загружаць машыну далі кампетэнтныя афіцэры. Чаму яны не панеслі пакаранне?

Следства не ўстанавіла старшага машыны, хоць у ёй знаходзілася два афіцэры. А ў загадзе канкрэтна сказана, што перавозка любога грузу з асабовым складам катэгарычна забаронена. І старшы машыны павінен гэтае пытанне кантраляваць. Ніводзін з афіцэраў, хто аддаваў загады, не быў пакараны. Толькі мой сын...

Пакаранне вінаватых не прынясе майму сыну палёгкі. Аднак калі грамадства прызнае парушэнні, якія дапусцілі афіцэры, гэта дазволіць у далейшым не дапусціць паўтору такой страшнай трагедыі.

Яўген ВАЛОШЫН, загадчык аддзела журналісцкіх расследаванняў.

Мінск—Давыд-Гарадок—Столін—Рэчыца—Пінск.

Памяць

Радавы Андрэй ЦУПА, загінуў ва ўзросце 21 года.

— Мы ажаніліся 16 лістапада, а праз месяц і два дні муж загінуў.

Думалі, што будзе добрая сям'я, дзеці народзяцца. Але жыццё пайшло наперакасяк. Ні сям'і, ні дзяцей, — плача жонка Таццяна Цупа. — Ужо няма на што спадзявацца, але хацелася б дабіцца хоць нейкай справядлівасці.

Прапаршчык Уладзімір СЛУЦКІ, загінуў ва ўзросце 28 гадоў.



Ехаць на часовы пагранічны пост не павінен быў. Падмяніў іншага чалавека.
Ва Уладзіміра засталася маленькая дачка.

Радавы Васіль КАЗАКЕВІЧ, загінуў ва ўзросце 23 гадоў.

— Калі гэта здарылася, я не магла паверыць: як такое можа быць? Ён быў такі моцны, адважны, — узгадвае жонка Юлія. —У ім увасобіліся якасці, пра якія я марыла: незалежны, працавіты, з павагай ставіўся да іншых людзей. Ён пяць гадоў вучыўся, было цяжка, і нават у гэтыя часы ён ніколі не прасіў грошай у бацькоў. Гэта быў чалавек, з якога я брала прыклад. Вася хацеў ісці ў армію, хацеў зрабіць вайсковую кар'еру. Ён амаль ніколі не скардзіўся на ўмовы службы. Гэта ўжо потым я даведалася пра цяжкасці: пра холад, пра тое, як спалі на зямлі. Толькі адночы муж сказаў, што ехалі па галалёдзе і ледзь не перакуліліся...

Сваю маленькую дачку Васіль Казакевіч бачыў толькі цягам аднаго тыдня.

Старшы сяржант Мікалай ТРУШКО, загінуў ва ўзросце 27 гадоў.

— Ён быў прыстойны і добры хлопец. Добра вучыўся ў школе. Сам, без дапамогі, паступіў у тэхнікум, адслужыў у арміі, застаўся кантрактнікам, — узгадвае бацька.

У Мікалая засталіся жонка і сын Глеб, якому быў год і тры месяцы, калі тата загінуў.

«УСЁ БУДЗЕ РАСКЛАДЗЕНА ПА ПАЛІЦАХ, І ВІНАВАТЫЯ БУДУЦЬ ПАКАРАНЫ»

Калі гэты матэрыял рыхтаваўся да друку, журналіст «Звязды» сустрэўся з кіраўніцтвам Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь. Падкрэслю, што ў ведамстве да сітуацыі паставіліся з глыбокім разуменнем. Пагранічнікі далі зразумець, што вінаватыя яшчэ панясуць адказнасць.

Вось які каментар быў атрыманы ад намесніка Старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Васіля ГАРБАТЭНКІ:

—Тое, што здарылася, не можа выветрыцца з памяці. Раней у гісторыі пагранічных войскаў Рэспублікі Беларусь такіх страт не было. І мы спадзяёмся, што такое гора больш не паўторыцца. Мы зрабілі высновы з таго, што здарылася.

Мы раздзяляем тую крыўду, якая прыйшла ў сем'і загінулых вайскоўцаў.

Мы вельмі спадзяваліся на тое, што ў судзе ўсё будзе раскладзена па паліцах і вінаватыя будуць належным чынам пакараныя.

Бліжэйшым часам мы, на аснове апошніх судовых пасяджэнняў, збяром усе дакументы, падвядзём канчатковыя вынікі. На мой погляд, вінаватыя людзі яшчэ будуць прыцягнуты да адказнасці, хоць і не крымінальнай. За тое, што машына была перагружаная, за тое, што вадзіцель не меў пэўнай катэгорыі, якая дазваляла б перавозіць такую колькасць людзей... Мы разгледзім правіну кожнага. Магчыма, мы збяром гэтых людзей разам і запросім матуль і жонак загінулых...

Сёння нас ніхто не можа папракнуць у плане матэрыяльнай дапамогі сем'ям, дзе здарылася бяда. Сабралі грошы і ўсё аддалі сем'ям. Але мы разумеем, што не можам вярнуць дзецям — бацьку, жонкам — мужоў, а бацькам — сыноў.

Ёсць маральная адказнасць, і мы не пакінем сем'і загінулых і будзем падтрымліваць іх, аказваць дапамогу. Але кожны з людзей, у чые сем'і прыйшла бяда, напэўна, мае права выказваць у наш адрас свае крыўды, і ў адрас тых ваеннаслужачых, якія, на іх погляд, не панеслі дастатковай адказнасці.

Кіназала

У «САЦЫЯЛЬНУЮ СЕТКУ» «ОСКАР» НЕ ТРАПІЎ

А фільмам года стала гісторыя пра брытанскага караля-заіку Георга VI «Кароль гаворыць!»

У Галівудзе адбылася 83-я штогадовая цырымонія ўручэння прэміі «Оскар». Рэвалюцыі ў асяродку кінаакадэмікаў, як і летась, не адбылося — фільм «Сацыяльная сетка» аб тым, як чалавек фактычна змяніў свет, саступіў галоўную ўзнагароду стужцы пра тое, як брытанскі кароль Георг VI здолеў перамагчы заіканне, пераадолеў страх публічных выступаў і павёў нацыю на вайну супраць Германіі.

Усяго ж намініраваны на 12 «Оскараў» фільм «Кароль гаворыць!» узяў 4 статуэткі, у тым ліку за лепшую мужчынскую ролю (Колін Ферт), лепшы арыгінальны сцэнарый (Дэвід Сайдлер) і лепшую рэжысуру (Том Хупер). Хупер са сцэны падзякаваў сваёй маці за ідэю фільма — паводле слоў рэжысёра, менавіта яна ў 2007 годзе, вярнуўшыся дадому са спектакля аб тым, як аўстралійскі лагапед лячыў заіканне каралю Вялікабрытаніі, прапанавала сыну зрабіць з гэтага кінапраект. «Мараль гэтай гісторыі — слухайце сваю маму», — падвёў вынік рэжысёр.

Таксама 4 узнагароды сабраў фантастычны трылер Крыстафера Нолана «Пачатак», а ў карціны пра стварэнне сацыяльнай сеткі Faceboock «Сацыяльная сетка» Дэвіда Фінчара ў выніку ўсяго 3 «Оскары» — падобна на тое, што часы рэкордных зборaў прызавых статуэтак мінулі незваротна.

Прыз за лепшую жаночую ролю 2010 года ўзяла Наталі Портман (фільм «Чорны лебедзь») — упершыню ў сваёй кар'еры, хоць намініравалася на «Оскар» у гэтай катэгорыі актрыса ўжо двойчы. За лепшыя мужчынскую і жаночую ролі другога плана адзначаны Меліса Лео і Крысціян Бэйл — абодва за фільм «Баец» і абодва ўпершыню.

Наталі Портман

Колін Ферт

Лепшым мультфільмам па выніках мінулага года амерыканскія кінаакадэмікі прызналі «Гісторыю цацак: Вялікія ўцёкі» — стужка з унушальным бюджэтам у 200 мільёнаў долараў сабрала ў пракаце звыш 415 мільёнаў і стала летась самай касавай.

Залатая статуэтка за мастацкае афармленне і лепшыя дэкарацыі прысуджана карціне «Аліса ў краіне цудаў», і гэтая ж стужка адзначана за лепшы дызайн касцюмаў.

Дарэчы, самыя цярплівыя з беларусаў, хто дачакаўся прамой трансляцыі цырымоніі «Оскар» у эфіры Першага канала, змаглі ацаніць не толькі ўборы і жарты вядучых — Джэймса Франка і Эн Хатаўэй, — але таксама трыумфальны выхад на сцэну 94-гадовага Кірка Дугласа, чые бацькі, між іншым, — выхадцы з Беларусі. З'яўленне Дугласа, які ўручаў адну з узнагарод, карыстальнікі сацыяльнай сеткі Twitter назвалі «адным з самых прыемных сюрпрызаў усяго шоу».

...А напярэдадні цырымоніі «Оскар» у Лос-Анджэлесе ў 31-ы раз традыцыйна былі ўручаны «Залатыя маліны» — за антыдасягненні ў кінаіндустрыі. Сёлета тут была ўведзена новая намінацыя — «Горшы фільм у 3D». Ім стаў «Уладар стыхій» Найта Ш'ямалана. Гэты фільм, а таксама «Сумеркі. Сага. Зацьменне» сталі лідарамі па колькасці намінацый. Горшым акцёрам быў названы Эштан Катчэр — за ролі ў стужках «Кілеры» і «Дзень святога Валянціна». А за горшую жаночую ролю «Залатымі малінамі» былі адзначаны адразу чатыры актрысы — гераіні «Сэксу ў вялікім горадзе-2» Сара Джэсіка Паркер, Сінція Ніксан, Кім Кэтрал і Крысцін Дэвіс.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Клопат пра спад ЧЫННІКІ

Нашу самую вялікую каштоўнасць у краіне — гісторыка-культурную спадчыну — ахоўвае асобны закон. Новы ўступіў у сілу ў 2006 годзе. Але час так бяжыць, што сёння наспела неабходнасць унесці папраўкі ў дзейны закон. Спецыялісты па ахове спадчыны Міністэрства культуры сумесна са спецыялістамі Нацыянальнага цэнтра заканадаўчай дзейнасці разам разглядалі прапановы наконт магчымых паправак у яго. На што яны павінны паўплываць?

— Сістэма аховы спадчыны павінна быць больш эфектыўнай, — лічыць Ігар Чарняўскі, начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры РБ. — У многіх раёнах спецыялістаў такіх няма, альбо тыя, хто намінальна вызначаны займацца гэтай справай, не могуць выконваць сваю функцыю (працуюць у іншых установах, музеях, бібліятэках...). Абсурдная сітуацыя, калі ў адным з раёнаў Магілёўскай вобласці пытаннямі аховы спадчыны займаецца тэхнік 2-й катэгорыі гаспадарчай групы аддзела культуры. Так сталася, што ў некаторых раёнах пастараліся пазбавіцца да гэтых адзінак наогул, як у адным з раёнаў Гродзенскай вобласці.

...На нашу думку, сістэма аховы спадчыны была б больш эфектыўнай, калі б мы вярнуліся да тэмы інспекцый па ахове спадчыны. Закон 1992 года закладваў стварэнне дзяржаўнай інспекцыі, але гэтая ідэя не была ажыццёўлена цалкам.

Хвалюе прафесіяналізм навукова-праектных, праектных, вытворчых арганізацый. Так атрымалася, што сёння практычна любая праектная арганізацыя, любы трэст, ПМК, будаўнічае ўпраўленне маюць права займацца ў тым ліку і рэстаўрацыяй, калі выйграе тэндар. Тэндарная практыка — гэта вельмі добра і правільна, але, напэўна, падчас адбору арганізацый на правядзенне рэстаўрацыйных работ трэба ўлічваць, ці ёсць там спецыялісты патрэбнай кваліфікацыі з пэўным вопытам работы. Тэрміны, кошт гэтых работ нават не такія, мабыць, важныя, як наяўнасць канкрэтных спецыялістаў. Вопыт і Мірскага замка, і Нясвіжскага палаца выявіў гэтую праблему. На Нясвіжскім замку памяняліся з 2004 года 3 генпадрадныя арганізацыі. Таму што дзве папярэднія арганізацыі проста не адпавядалі па сваім характары, па магчымасцях правядзення работ на такіх унікальных аб'ектах.

Але зрухі ёсць: пры падтрымцы Міністэрства культуры на архітэктурным факультэце БНТУ створана спецыялізацыя «Архітэктар-рэстаўратар».

У Беларусі — праблема з будаўнічымі матэрыяламі для рэстаўрацыйнай сферы. Існуе шмат заўваг. Напрыклад, недзе выкарыстоўваюць стандартную плітку, таму што іншую не выпускаюць. Але пакрысе пачынаюць падбіраць, каб паказаць пэўны характар горада. Мы зрабілі свае заўвагі. Напрыклад, у Мінску, дзе метад выкладвання плітак каля ратушы не падыходзіць для яе тэрыторыі.

У нас практычна не выпускаецца дахоўка. Мы бачым на многіх будынках металадахоўку, што ніякім чынам не падыходзіць да гістарычных будынкаў. У нас не выпускаецца сталярка. Ніхто не гаворыць, што не трэба рабіць шклопакеты, але можна ўстаўляць шклопакеты ў аконныя запаўненні, якія адпавядаюць па характары гістарычнаму вобразу. У Гродне ўжо знайшлі спосаб гэта рабіць...

Дзяржава і мясцовыя органы ўкладаюць дастаткова вялікія сродкі ў рэстаўрацыю і ахову спадчыны. На 2011 год 18 аб'ектаў рэстаўрацыі фінансуюцца толькі праз рэспубліканскі бюджэт. Але не трэба і спяшацца з рэстаўрацыяй, лепш рабіць яе якасна. Мы не выключаем такой сітуацыі, што Нясвіжскі палац будзе працаваць ужо як музейная ўстанова, але адначасова будзе працягвацца рэстаўрацыя нейкіх элементаў. Нават цікава, калі наведвальнік можа азнаёміцца з рэстаўрацыйным працэсам. Летась пачалася буйная работа на касцёле Божага цела ў Нясвіжы. Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку XII стагоддзя — працяг работ, тут ужо не толькі аднаўляем жывапіс, а трэба думаць пра архітэктурнае аблічча. Паводле праграмы «Культура Беларусі», на бліжэйшыя пяць гадоў вызначаны 34 аб'екты рэстаўрацыі. Зараз мы павінны ўнесці ва ўрад праграму дзеянняў «Замкі Беларусі» да 2018 года (38 замкаў). Гэта не толькі самі замкі, але і замчышчы, якія трэба добраўпарадкаваць і ўключыць у сферу турысцкай дзейнасці. Як Мядзельскі замак — хто яго ведае? Ці замак у Лоску. Ёсць шэраг аб'ектаў кансервацыі: Крэўскі, Навагрудскі, Гальшанскі замак. Стары замак у Гродне — адзіны ў Беларусі каралеўскі замак. Ружанскі палац мы далучаем да гэтых аб'ектаў, таму што ён паўстаў на аснове замка — павінны аддаць належнае роду Сапегаў, з якога паходзіў аўтар Статута Вялікага Княства Літоўскага.

— Галоўная задача — знайсці для гістарычных аб'ектаў уласніка, — лічыць Валянціна Макарава, прадстаўнік Мінаблвыканкама. — Добры прыклад — сядзіба ў Суле Стаўбцоўскага раёна. Мы перадалі рэшткі гэтага аб'екта таварыству з абмежаванай адказнасцю. Сёння за кошт інвестара адноўлены атэль, канюшня, адкрыты манеж, добраўпарадкавана тэрыторыя. Інвестараў не столькі, як хацелася б. Па Мінскай вобласці ўключана ў план падобных дзеянняў 16 аб'ектаў, для трох мы знайшлі інвестара. У асноўным гэта гістарычныя сядзібы. (Усяго па Беларусі 46 аб'ектаў, якія павінны быць перададзены ва ўласнасць.) Наша заканадаўства дазваляе гэтыя аб'екты перадаваць за адну базавую велічыню.

— Інвестары ў Мінску працуюць больш актыўна, — гаворыць Наталля Радчанка, якая прадстаўляе Мінскі гарвыканкам. — У 2010 годзе на аб'ектах гістарычнага цэнтра горада было асвоена 107,2 мільярда рублёў, з іх большая частка — пазабюджэтныя інвестыцыі і крэдытныя рэсурсы банкаў (80 мільярдаў).

У горадзе Мінску існуе праблема — фасады будынкаў, асабліва ў забудове 50-х гадоў мінулага стагоддзя. Кватэры гэтых дамоў знаходзяцца ў прыватнай уласнасці. Часта людзі, не ведаючы, што дом — помнік архітэктуры, пачынаюць мяняць воблік: ставяць шклопакеты, якія не падыходзяць ні па колеры, ні па форме сталяркі. Зараз прынята рашэнне гарвыканкама, дзе будзем імкнуцца заклікаць уласнікаў, каб прывялі вокны да ладу, каб выгляд іх быў аднолькавым.

Ёсць нават судовыя справы...

— Павінна быць рэальная адказнасць, — дадае Ігар Чарняўскі. — Па Мінску складзена некалькі пратаколаў. Некаторыя людзі аштрафаваны паводле Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. У Клецкім раёне некаторых фермераў прывозілі ў суд, калі было парушана заканадаўства. Але па некаторых справах, якія разглядаліся пракуратурай, чамусьці не знайшлі складу злачынства. У Клецкім раёне вёска Янавічы: знішчаны драўляны свіран XIX стагоддзя ў складзе сядзібнага комплексу — няма складу злачынства!.. Адказнасць панёс нейкі «стрэлачнік», але не той, хто распараджаўся. Але адказнасць павінна наступаць і за ўтрыманне, якае вядзе да пагаршэння тэхнічнага стану такіх аб'ектаў. Я не выключаю, што ў Гомельскай вобласці будуць такую справу падымаць: гістарычны комплекс кінуты на волю лёсу пры наяўнасці гаспадара. Альбо ў гістарычным цэнтры Мінска было знішчана 24 метры культурнага пласта па вуліцы Фрунзэ. Два гады вялося следства — не выяўлена складу злачынства... Мы не крыважэрныя людзі, нам хацелася б, каб усё рабілася па згодзе і ў рамках закона.

Ларыса ЦІМОШЫК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.59	17.46	10.47
Віцебск —	6.50	17.34	10.44
Магілёў —	6.49	17.36	10.47
Гомель —	6.44	17.35	10.51
Гродна —	7.14	18.01	10.47
Брэст —	7.12	18.04	10.52

Месяц

Маладзік 4 сакавіка.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Данілы, Ілы, Паўла, Самуіла.*
К. *Антаніны, Фелікса.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



1 сакавіка

Дзве даты

Сёння — Дзень сну. Адзначаецца ў шэрагу еўрапейскіх краін пад эгідай Сусветнага фонду псіхічнага здароўя.

1918 год — выйшаў у свет першы нумар грамадска-палітычнай і літаратурнай газеты «Дзянніца», першай савецкай газеты на беларускай мове (выдавалася да 24 лютага 1919 г.). Яе рэдактарамі былі Д. Жылуновіч (Цішка Гартны), Я. Нёманскі, П. Каравайчык. Спачатку выдавалася ў Петраградзе, з 6 сакавіка 1918 года стала выходзіць у Маскве. Са снежня 1918 года выходзіла як веснік Белнацкама і маскоўскай Беларускай секцыі РКП (б). Выйшла 49 нумароў. Асвятляла барацьбу беларускага народа супраць нямецкіх інтэрвентаў, дзейнасць Белнацкама і яго аддзяленняў, беларускіх аб'яднанняў і ўстаноў у Расіі, жыццё беларусаў-бежанцаў.



1869 год — рускі вучоны Дз. Мендзялееў склаў табліцу вопытнай сістэмы элементаў, заснаванай на іх атамнай вазе і хімічным падабенстве. У 1871 годзе ён назаве яе перыядычнай.

Цытата дня:

«Галоўнае ў чалавеку — гэта не розум, а тое, што ім кіруе: характар, сэрца, добрыя пачуцці, перададзеныя ідэі».

Фёдар Дастаеўскі (1821—1881), рускі пісьменнік.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ШТО З ІХ ВЫРАСЦЕ?

У жыхара в. Яглевічы Іванцэвіцкага раёна з гаража скралі дэталі. Зладзеямі аказаліся вучні 10-га класа мясцовай школы: адзін мае судзімасць за рабаванне, другі — за крадзеж.

Яна СВЕТАВА.

Па гарызанталі: Багаташвілі. Аўвагр. Мымра. Рыні. Ярад. Кайф. Калымар. Хата. Аўт. «Фін». Зарад. Дарын. Лак. Шост. Аск. Лаўка. Астра. Арэх. Валадоп. Верн. ОНІ. Іваод. Кобальт. Лужа. Атара. Разанаў. Акр. Фінал. Аказія. **Па вертыкалі:** Ахвяраказала. Рытоўніка. Сані. Смык. Фінгер. Здор. Іна. Рэвю. Атам. Крах. Бразен. Дарэра. Бэрта. Інвар. Канал. Акт. Карак. Рыба. Аўра. Лаво. Луб. Шалі. Маркоў. Дон. Скроня. Дата. Літургія.

АДКАЗ НА СКАНВОРД

ЕМ ФАСТ-ФУД І БУДУ ЕСЦІ...

СВЯДОМАСЦЬ — СУПРАЦЬ ХАРЧОВЫХ ЗВЫЧАК

Летась улады ЗША прызналі атлусценне эпідэміяй, якая ахапіла нацыю, і пачалі з ёй змагацца: на свет з'явілася праграма па барацьбе з дзіцячым атлусценнем, і не толькі яна. Аднак спробы ўлад змяніць харчовыя звычкі сваіх грамадзян з трэскам праваліліся. Напрыклад, высветлілася, што размяшчэнне табліц каларыйнасці ў меню кропак хуткага харчавання неэфектыўнае. І нават інфармаванасць не можа перамагчы смакавыя перавагі чалавека...

Эксперты канстатуюць, што фаст-фуд прывабны па многіх прычынах. З аднаго боку, ён падтрымліваецца агрэсіўнай рэкламай, з другога — тэмп нашага жыцця пастаянна паскараецца і чалавеку элементарна не хапае часу, каб нармальна паесці.

Браян Элбел з Медыцынскай школы пры Універсітэце Нью-Ёрка спецыяльна правёў даследаванне, каб ацаніць, ці прыносяць плён прапанаваныя ўрадам меры. Эксперт разам з калегамі праводзіў апытанне і збіраў чэкі ў наведвальнікаў сетак McDonalds, Burger King, Kentucky Fried Chicken і Wendy's. Высветлілася, што дзеці і падлеткі без прыгляду старонніх за адзін візіт з'ядалі больш, чым падчас сумеснага паходу з бацькамі: 725 кілакалорый (у адзіночку) супраць 608 (пад прыглядам бацькоў). І інфармацыя аб каларыйнасці ежы ніяк не ўплывала на гэтую заканамернасць. Яшчэ Браян высветліў, што 72 працэнты аматараў фаст-фуду прыцягвае смак нездаровай ежы, які ў значнай ступені вызначаецца ўтрыманнем у ёй тлушчу. Пры гэтым каларыйнасць і пажыўнасць страў хвалявалі толькі 9 працэнтаў апытаных. Хоць 57 працэнтаў наведвальнікаў фаст-фуду былі азнаёмленыя з табліцамі каларыйнасці, аднак гэта іх не спыняла...

У ГАНДУРАСЕ МОЖНА КУРЫЦЬ ТОЛЬКІ СА ЗГОДЫ СВАЯКОЎ

Закон аб забароне курэння ў грамадскіх месцах уступіў у дзеянне ў Гандурасе. Цяпер у гэтай краіне забараняецца курыць у грамадскіх будынках, офісах, супермаркетах, на прыпынках грамадскага транспарту, аўтастаянках, дыскатэках і гэтак далей. Але асобнай увагі заслугоўвае пункт, які стаіць на абароне інтарэсаў членаў сям'і курца: закон дазваляе выклікаць паліцыю на дом да курца ў выпадку, калі той курыць у памяшканні, а іншыя члены сям'і не даюць на гэта згоду. Таксама, згодна з новым законам, чалавек, які курыць на вуліцы, павінен стаяць не менш чым у двух метрах ад людзей, якія не курыць. Парушэнне антытытунёвага заканадаўства будзе карацца буйнымі штрафамі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Незаконная высечка на мільёны А не шкодзь!

Работнікі Столінскай міжрайінспекцыі разам з вайскоўцамі Пінскага пагранатрада і супрацоўнікамі Палескага лясгаса на тэрыторыі гэтай лесагаспадарчай установы выявілі незаконную высечку сасны ў колькасці 983 штук аб'ёмам амаль 240 кубаметраў.

Адбылося гэта ў прыгранічнай зоне з Украінай, як было высветлена, зрабілі высечку грамадзяне гэтай самай суседняй краіны. Нанесеная шкода ацэненая ў 64 мільёны рублёў.

А даччынае ўнітарнае Смаргонскае прадпрыемства меліярацыйных сетак без выпіскі дазвольных дакументаў высекла звыш вызначанай колькасці 238 дрэў аб'ёмам 78 кубаметраў.

Адбылася гэтая незаконная высечка ў лясах, што не ўваходзяць у лясны фонд, на ўчастку, адведзеным пад рэканструкцыю меліярацыйных сетак. Начальнік Смаргонскай міжрайінспекцыі рыхтуе да названай юрыдычнай асобы іск аб пакрыцці нанесенай шкоды, якая склала больш за 10,1 мільёна рублёў (289 базавых велічынь).

Сяргей РАСОЛЬКА.

Усміхнемся

Бацька і сын:

— Назаўжды запомні, сынок: вялікія грудзі ў дваццаць — гэта тоўстая жонка ў сорак!

☺

Калі не адпускаць мужа піць піва з мужыкамі, ён пачне піць шампанскае з жанчынамі.

☺

Бабуля і ўнук.

— Калі кашляеш, трэба затуляць рот далонькай.

— Не бойся, бабуля, у мяне зубы не вылецяць, як у цябе ў мінулы раз!

☺

Закон жыцця: у якім бы раёне ты ні пасяліўся, сусед з перфаратарам адшукае цябе і паселіцца побач...

☺

П'яны мужык запаўзае на аўтастаянку і стукаецца ў будку да вартаўнічага сабакі. Сабака, зразумела, пачынае брахаць. Мужык:

— Жонка, ну не сярдуй!...

З будкі высоўваецца пыса ратвейлера.

— Ну вось, яшчэ і цешча прыехала...

☺

Самае любімае ва ўборцы кватэры — ганяцца за катом з пыласосам.

☺

— Вы колькі важыце?

— Цяпер 110 кілаграмаў, максімальная вага была — 121 кілаграм.

— А мінімальная?

— 3 кілаграмы 600 грамаў.

ЗАМОК

«Трымаць рот на замку», «за сямю замкамі» — у народнай культуры замок заўсёды быў сімвалам таямнічасці, замкнёнасці, закрытасці, і, можа, менавіта таму, аховы і абароны. Практычна ўсе замовы маюць заключны выраз: «Ключ, замок, амінь» ці «Словам маім ключ і замок». У той жа час, калі адчыніць замок з дапамогай ключа, гэта можа сімвалізаваць уваход у якія-небудзь новыя, невядомыя сферы пазнання.

- Калі першы раз выганялі скаціну ў поле, часцей за ўсё на Юр'я, з замком абыходзілі ўвесь статак, затым замок замыкалі і казалі: «Я замочак замыкаю ад усіх пашчаў». Лічылася, што такімі сімвалічнымі дзеяннямі «закрывалі» пасткі ваўкам, і хатняй жывёле нічога не пагражала.
- Набытая карова павінна пераступіць цераз адкрыты замок, затым яго замыкалі і ўносілі ў хату. Лічылі, што ў такім выпадку карову ніхто не скрадзе і яна не адаб'ецца ад статка.
- Каб карова-першацёлка не з'ела сваё цяля, на рогі ёй вешалі замок.
- 6 студзеня гаспадыня абмотвала стол невялікім ланцугом і замыкала на ім замок, каб на ўвесь год «закрыць» языкі ўсім нядобразычліўцам сям'і.
- Такія ж дзеянні выконваліся, калі камусьці з членаў сям'і неабходна было ісці ў суд.
- Каб не пусціць эпідэмію ў вёску, падчас абворвання разам з іншымі рэчамі рытуала ў зямлю закопвалі замкнёны замок. У такім выпадку вёску не крануць аніякія хваробы.
- Дзверы нашых продкаў ніколі не зачыняліся. Але ў час эпідэміі воспы ці іншага інфекцыйнага захворвання на дзверы спецыяльна вешалі зачыненыя замкі. Лічылася, што гэта спыніць распаўсюджванне эпідэміі.
- Замком «закрывалі» зубы ваўку, калі неабходна было перанесці з вёскі ў вёску кросны — у дарогу абавязкова бралі зачынены замок.
- Падчас вясельнай змовы сваха клала пад парог хаты нявесты адамкнёны замок. Калі жаніх са сватам і дружынай выходзілі з хаты, сваха хуценька замыкала замок, а ключ кідала ў раку, каб нішто не перашкодзіла будучаму вяселлю.
- Перад тым, як жаніх павінен быў унесці нявесту ў хату, пад ручнік, якім быў засланы парог, клалі адамкнёны замок. Потым замок замыкалі, а ключ неслі ў хату нявесты, а замок захоўваўся ў хаце жаніха. Лічылася: як гэты замок ніхто ніколі не адкрые, так і пара заўжды будзе разам. І толькі ў тым выпадку, калі ў сям'і не нараджаліся дзеці, хтосьці з пары быў бяздзетным, «вясельны» замок неабходна было абавязкова адкрыць.
- «Вясельным» замком зачынялі дзверы пакоя, куды сыходзілі маладыя на першую шлюбную ноч — каб ніхто не сурочыў.
- Калі ў хату ўносілі куфэркі з пасагам маладой, пільна сачылі за тым, каб замкі на іх былі адамкнутымі, інакш нявестка не зможа нарадзіць.
- Менавіта па той жа прычыне падчас родаў у хаце павінны быць адчынены ўсе замкі і запоры. Калі роды былі вельмі цяжкімі, сваякі парадзіхі ішлі ў храм і прасілі адчыніць царскую браму — каб «выпусціць» душу дзіцяці на свабоду з улоння маці.
- Калі дзяўчына засядзелася «ў дзеўках», на Юр'я (6 мая) трэба было абавязкова адамкнуць у хаце ўсе замкі і запоры.
- Замок выкарыстоўвалі і для нанясення шкоды гаспадарцы, для таго, каб пасварыць паміж сабой пару, «забраць» патэнцыю ці насладу бясплоддзе і г.д. Таму да падкінутых ці знойдзеных замкоў заўсёды ставіліся з перасцярогай і ніколі не прыносілі іх у хату.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 979. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.